ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 26 (2657) • Пятніца, 29 чэрвеня 1973 года • Цана 8 кап.

...Калі ты не бачыў Мінска тых суровых і радасных дзён ліпеня сорак чацвёртага, то ўсё роўна добра памятаеш фотаздымкі, кінакадры, расказы відавочцаў. Мінск спапялёны, зруйнаваны, здратаваны, — і шчаслівы, акрылены сваім вызваленнем. Мінск, які ў жалобе схіляе сцягі над братнімі магіламі, — і які радасна вітае сустрэчы на сваіх вуліцах. Сустрэчы блізкіх людзей, якія ўцалелі ў полымі вайны, знайшлі адзін аднаго праз гады разлукі і нягод...

Мы прывыклі ўжо да высокіх слоў аб родным Мінску, да захаплення яго мінулым, яго сённяшняй явай. Але перад днём, які стаў у нашай рэспубліцы святам,—перад гадавінай выгнання фашысцкай навалы з беларускай зямлі,—выйдзі на праспекты сталіцы, на асветленыя яркімі святочнымі агнямі плошчы... Усё-такі гэта казка—тое, што адкрываецца тваім вачам. Рукатворная казка нашага сацыялістычнага быцця.

Са святам вызвалення цябе, таварыш!

На здымку — праспект Пушкіна ў Мінску. Ліпень 1973 г.

Фота Ул. КРУКА.

У ІМЯ БУДУЧЫНІ

ВЫСАКАРОДНАЯ МІСІЯ МІРУ

З хваляваннем думаю пра вынікі паездкі ў Злучаныя Штаты і ў Францыю Леаніда Ільіча Брэжнева, з пільнай увагай чытаў у газетах, слухаў па радыё і тэлебачанні яго выступленні. Высакароднай місіяй міру была гэтая паездка. І вельмі радасна, што міралюбівая знешняя палітыка нашай дзяржавы знаходзіць прыязны водгук ва ўсім свеце, што ленінскія ідэі мірнага супрацоўніцтва яскрава ўвасабляюцца ў жыццё.

Мне, як музыканту, даводзілася бываць у многіх краінах свету. І ўсюды я пераконваўся ў велізарнай сімпатыі да нашай краіны, да яе народа, да яе культуры, мастацтва. Калі бывалі гутаркі з кампазітарамі, дзеячамі культуры, мне прыемна было адчуць іх разуменне і высокую павагу да нашых дасягненняў.

Для таго, каб ва ўсім свеце працвітаў прагрэс, працвітала літаратура, музыка, жывапіс, каб дыхалася спакойна і лёгка, на планеце патрэбен трывалы мір. Да гэтай высокай мэты скіравана ўся дзейнасць нашага ўрада, нашай партыі, Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС Л. І. Брэжнева.

Г. ВАГНЕР,
заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

ГЭТА НАС РАДУЕ

КАЛЕКТЫЎ Дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна з вялікай увагай сачыў за візітам Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева ў Злучаныя Штаты Амерыкі і ў Францыю. Мы горача ўхваляем усе пагадненні, падпісаныя ў часе перагавораў з прэзідэнтам Р. Ніксанам. Як і ўсіх савецкіх людзей, нас радуе, што гэтыя пагадненні з'яўляюцца зарукай працяглага і трывалага міру, развіцця супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ў галіне эканомікі, гандлю, навукі, культуры.

Нам, бібліятэчным работнікам, асабліва блізкі артыкул VIII «Агульнага пагаднення паміж Саюзам Савецкіх Сацыялістычных рэспублік і Злучанымі Штатамі Амерыкі аб кантактах, абменах і супрацоўніцтве», які сцвярджае, што «бакі будуць заахвочваць абмен кнігамі, часопісамі, газетамі і іншымі выданнямі па навуковых, тэхнічных, культурных і агульнаадукацыйных пытаннях паміж бібліятэкамі, універсітэтамі і іншымі арганізацыямі кожнай краіны...»

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна падтрымлівае кантакты з бібліятэкамі ЗША з 1956 года. Мы вядзём міжнародны кнігаабмен з 28 амерыканскімі партнёрамі, у тым ліку з бібліятэкай Кангрэса, Нью-Йоркскай публічнай бібліятэкай, бібліятэкамі Калумбійскага, Гарвардскага, Прынстонскага, Каліфарнійскага, Канзаскага універсітэтаў. У 1972 годзе мы атрымалі са Злучаных Штатаў Амерыкі 155 кніг і 214 часопісаў, адправілі ў амерыканскія бібліятэкі 189 кніг і 378 часопісаў.

Вялікім попытам у амерыканскіх чытачоў карыстаецца беларуская мастацкая літаратура, кнігі па пытаннях філалогіі, культуры, мемуары аб партызанскім руху ў нашай рэспубліцы. Многа было запытанняў на бібліяграфічныя выданні нашай бібліятэкі. Мы высылаем таксама матэрыялы аб вопыце работы бібліятэк Беларусі, штогодныя агляды іх дзейнасці.

Пачалі завязвацца і непасрэдныя кантакты. У 1972 годзе загадчык замежнага аддзела нашай бібліятэкі І. В. Жолудзеў на стыпендыю ЮНЕСКА на працягу трох месяцаў знаёміўся з работай лепшых бібліятэк ЗША і Канады, а з 1973 года ён запрошаны і працуе ўжо ў бібліятэцы ААН. Супрацоўнік міжнароднага кнігаабмену Прынстонскага універсітэта З. Давід прыязджаў у нашу бібліятэку з мэтай замацавання і далейшага развіцця кнігаабмену.

Мы спадзяёмся, што дзякуючы ажыццяўленню праграмы міру, прынятай XXIV з'ездам КПСС, эканамічнае і культурнае супрацоўніцтва паміж СССР і іншымі краінамі будзе ўсё больш расці і мацавацца.

Э. ЦЫГАНКОЎ,
дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна.

ДЗЯКУЙ!

Вялікую цікавасць выклікаў у нашых хлебаробаў візіт Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева ў ЗША. Наша родная Камуністычная партыя, яе Ленінскі Цэнтральны Камітэт, асабіста Леанід Ільіч Брэжнеў робяць усё магчымае, каб умацаваць мір на нашай планеце. Няма сумнення, што сустрэча палітычных кіраўнікоў дзвюх вялікіх дзяржаў паспрыяе разрадцы міжнароднай напружанасці, умацуе дружбу і ўзаемавыгадныя сувязі паміж нашым і амерыканскім народамі.

Дзякуй партыі і ўраду за тое, што яны прыкладаюць так многа намаганняў, каб жахі вайны ніколі не паўтарыліся.

А. КУПРАЦЭВІЧ,
загадчык Відошынскага сельскага клуба, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.
Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці.

САМЫ БАЯВЫ ЖАНР

З ПАСЯДЖЭННЯ ПРЭЗІДЫУМА ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

У арсенале літаратуры ёсць жанр, які знаходзіцца на самых перадавых, баявых пазіцыях жыцця. Гэта — публіцыстыка. Бурлівыя падзеі, якімі жыве сёння краіна, гістарычныя змены, што адбываюцца ў міжнародным палітычным клімаце, з асаблівай вастрынёй вымагаюць усхваляванага пісьменніцкага водгуку. Нездарма пытанні публіцыстыкі, удзелу пісьменнікаў у здзяйсненні ганаровых задач, пастаўленых перад народам пяцігадовым планам, так горача абмяркоўваліся на апошнім усесаюзным пісьменніцкім пленуме.

У пісьменнікаў нашай рэспублікі таксама накоплены немалы вопыт у жанры публіцыстыкі, нарыса. І ўсё-такі жыццё патрабуе больш актыўнай, мэтанакіраванай пісьменніцкай работы ў гэтым кірунку, аператыўнага слова літаратара па надзённых праблемах палітыкі, эканомікі, культуры, сацыялогіі, маралі. Вось чаму прэзідыум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі палічыў патрэбным стварыць камісію па нарысу і публіцыстыцы. Вось чаму на апошнім пасяджэнні прэзідыума быў заслуханы даклад старшыні гэтай камісіі Ул. Юрэвіча аб надзённых задачах беларускай мастацкай публіцыстыкі.

Дакладчык прааналізаваў з гэтага пункту гледжання змест рэспубліканскіх літаратурных часопісаў і газеты «Літаратура і мастацтва» за апошнія паўгода.

Ул. Юрэвіч гаварыў аб неабходнасці больш цеснай сувязі пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі з рабочымі калектывамі. Аб глыбокім, дзелавым знаёмстве літаратараў з іх буднямі, складанасцямі, што перад імі ўзнікаюць, з сацыяльным, псіхалагічным абліччам гэтых калектываў. Большую ўвагу публіцыстыцы павінна аддаваць крытыка.

У абмеркаванні пытанняў, пастаўленых дакладчыкам, прынялі ўдзел І. Чыгрынаў, Г. Шыловіч, І. Дуброўскі, П. Місько, А. Шаўня, І. Шамякін.

М. Танк, падводзячы вынікі гаворкі, спыніўся на розніцы паміж «чыстай публіцыстыкай» і наяўнасцю яе элементаў у творах іншых жанраў, прынамсі, у нарысе. Калі ў нарысе, адзначыў М. Танк, беларуская літаратура мае такія-сякія здабыткі і цяпер, то ў галіне публіцыстычнага артыкула ў нас непачаты край работы. Бракуе нам у гэтым жанры самастойных адкрыццяў, умелага пранікнення ў важныя праблемы жыцця.

Прэзідыум даручыў камісіі па нарысу і публіцыстыцы прапанаваць канкрэтныя захады па выпраўленню гэтых недахопаў.

Прэзідыум абмеркаваў таксама інфармацыю А. Грачанікава аб удзеле пісьменніцкай дэлегацыі ў фестывалі беларускага мастацтва і літаратуры на Алтаі, а таксама паведамленне А. Вярцінскага аб паездцы ў Балгарыю.

НА АДКРЫЦЦЁ ПОМНІКА Я. КУПАЛУ Ў ЗША

З Мінску ў Нью-Йорк выехала дэлегацыя беларускай грамадскасці. Яна накіроўваецца ў ЗША па запрашэнню Камітэта культурнага праекта Ароу-парку пад Нью-Йоркам на цырымонію ўрачыстага адкрыцця 1 ліпеня ў гэтым парку помніка выдатнаму беларускаму пісьменніку Янку Купалу. У саставе дэлегацыі — вядомы беларускі драматург А. Макаёнак, скульптар А. Анікейчык — адзін з аўтараў помніка Я. Купалу ў Ароу-парку.

Манумент з паўтараметровым бюстам Янкі Купалы стане ў Ароу-парку побач з помнікамі А. Пушкіну і Т. Шаўчэнку, У. Уітмену, усталёўваючы вялікія гуманістычныя ідэі.

БЕЛТА.

ДРАМАТУРГ—ГОСЦЬ ТЭАТРА

Па сібірскаму тракту, праз лютыя маразы і пургу вязе вельмі важныя грузы—ад трансфарматараў да дзіцячых сосак—брыгада шафёраў. Прабівае сабе шлях, пракладае тракт, невядома чаму названы «вясёлым». Узначальвае брыгаду Тарасыч (па мянушцы «Дзед») — чалавек душэўнага абаяння, камуніст; яго аўтарытэт бясспрэчны для паплечнікаў нават пасля смерці «Дзеда».

...Пісьменніка Барыса Васільева добра ведаюць чытачы і гледачы па аповесці, кінафільму і спектаклю «А зоры тут ціхія...». Ён сам, перш чым напісаць новую п'есу, праехаў сотні кіламетраў па самай цяжкай Калымскай трасе разам з шафёрамі, у чыіх руках «не руль — жыццё», як гаворыць адзін з герояў «Вясёлага тракту». Аб сваіх уражаннях ад гэтай паездкі, аб мужных і дужых людзях, хоць на выгляд часам і грубаватых, драматург з захапленнем расказаў акцёрам Акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, калі творчы калектыў толькі знаёміўся з п'есай. І вось Барыс Васільеў зноў у Мінску, глядзіць спектаклі, сустракаецца з акцёрамі і гледачамі.

—Як вы ацэньваеце работу купалаўцаў?—спытаў пісьменніка карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва».

— Галоўная дзеючая асоба п'есы—уся брыгада. І ў спектаклі яна ёсць. Сапраўдная! Жывая... На сцэне—дарагія майму сэрцу людзі—складаныя, непадобныя адзін да аднаго, але аб'яднаныя высокай свядомасцю. Мяне пераконваюць у праўдзе паводзін акцёры, якія выконваюць ролі членаў брыгады. Самы цікавы вобраз стварыў, на мой погляд, Генадзь Гарбук: ён іграе Юрку, празванага Чынгісханам. Яшчэ мне вельмі дарагі Карнееў, які пад уплывам кароткай размовы з Тарасычам пачаў сур'ёзна думаць аб жыцці, нешта ў сабе пераадольвае, каб стаць сапраўдным чалавекам. Такім бачыў яго я, калі пісаў п'есу, такі ён атрымаўся і ў Барыса Уладамірскага. Спадабаўся мне і Аўгуст Мілаванаў, які выконвае ролю маладога аўтаінспектара...

На мой погляд, спектакль, пастаўлены Валерыем Раеўскім, — творчая ўдача калектыву. Калектыў і акцёры па-майстэрску дамалявалі тое, што ў мяне было часамі толькі ў падтэксце. Я ўбачыў шмат сапраўдных сцэнічных знаходак, нечаканых для аўтара, асабліва ў другім акце.

З купалаўцамі добра працуецца драматургу. Гэта я адчуў на ўласным вопыце...

ДА СЛАЎНАЙ ГАДАВІНЫ

Перасоўную выстаўку, прысвечаную 29-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, наладзіў у гэтыя дні Магілёўскі краязнаўчы музей.

Дакументы і матэрыялы, змешчаныя ў экспазіцыі,—сведкі мужнасці і адвагі савецкіх воінаў, якія абаранялі Магілёў у 1941 годзе, партызан і падпольшчыкаў Прыдняпроўя, а таксама воінаў Беларускіх франтоў, якія вызвалялі нашу зямлю ад гітлераўцаў у 1944 годзе.

Асабістыя рэчы, фотаздымкі, копіі баявых загадаў, данясенні і іншыя дакументы перадалі музею ветэраны 50-й арміі, якія былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза за паспяховае фарсіраванне Дняпра.

Выстаўка экспанавалася ў кінатэатрах абласнога цэнтра, клубах і дамах культуры, зараз яна адпраўлена ў Асіповіцкі раён.

ДНІ БЕЛАРУСІ Ў ПОЛЬШЧЫ

Выстаўку работ студэнтаў Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута адправіла ў Варшаву Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Гэта—адна са шматлікіх экспазіцый, якія будуць дэманстравацца ў польскіх гарадах у Дні Беларускай ССР у ПНР. Яны пройдуць у Польшчы ў пачатку ліпеня.

Шматлікія матэрыялы, выстаўкі, кінафільмы, адпраўленыя ў Польшчу, раскажуць працоўным брацкай краіны аб дасягненнях беларускага народа, жыцці рабочых, калгаснікаў, вучоных, іх працоўных справах, накіраваных на паспяховае выкананне рашэнняў XXIV з'езда КПСС, заданняў дзевятай пяцігодкі.

Вялікая фотавыстаўка «Савецкая Беларусь» азнаёміць польскіх сяброў з флагманамі прамысловасці—аўтамабільнымі і трактарным заводамі, хімічнымі камбінатамі, станкабудаўнічымі, прыборабудаўнічымі і іншымі прадпрыемствамі.

У ПНР выязджае група артыстаў Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР, філармоніі. На польскай сцэне выступіць папулярны квартэт «Купалінка».

Цесныя вузы брацкай дружбы звязваюць працоўных абласцей БССР і ваяводстваў ПНР. Галоўную праграму дзён Беларусі ў Польшчы дапаўняюць шматлікія мерапрыемствы абласных арганізацый. У гарадах Беластоцкага ваяводства выступяць лектары Гродзенскай вобласці, якія раскажуць аб дасягненнях працаўнікоў прынёманскага краю ў развіцці эканомікі, навукі і культуры. На спартыўных пляцоўках адбудуцца спаборніцтвы беларускіх і польскіх лёгкаатлетаў, барцоў, таварыскія футбольныя матчы. З самадзейным мастацтвам пазнаёміць аркестр народных інструментаў музычнага вучылішча. Гродзенцы вязуць з сабой фотавыстаўку і выстаўкі народнай і дзіцячай творчасці.

Рад мерапрыемстваў, прысвечаных савецка-польскай дружбе, адбудзецца ў Люблінскім і Варшаўскім ваяводствах.

БЕЛТА.

ГАСТРОЛЬНАЕ ЛЕТА

ЯШЧЭ ПАНАВАЛІ на афішных стэндах Мінска анонсы спектакляў Харкаўскага акадэмічнага рускага тэатра імя А. Пушкіна, калі побач з'явіліся новыя назвы, новыя імёны... Праз два дні адкрые заслону Маскоўскі драматычны тэатр імя К. Станіслаўскага. Трэцяга ліпеня — музычная драма з Херсона.

З першым з іх мінчане пазнаёміліся амаль дзесяць гадоў назад. Тады яны горача апладзіравалі выдатнаму і папулярнаму артысту Яўгенію Урбанскаму, захапляліся майстэрствам і невычэрпнай абаяльнасцю Яўгенія Ляонава, узрушана сачылі за глыбінным раскрыццём сцэнічных вобразаў Дзідрай Рытэнбергс і Аляксеем Глазырыным. На гастролях тады іграліся спектаклі, пастаўленыя Міхаілам Яншыным і Барысам Львовым-Анохіным. Уражанні былі яркія, незабыўныя.

Сёлета тэатр прыязджае ў беларускую сталіцу з цалкам абноўленай трупай. Калектыў захоўвае дарагія яму традыцыі, што былі закладзены пры нараджэнні трупы са студыі, заняткі ў якой вялі К. Станіслаўскі і яго бліжэйшыя супрацоўнікі па МХАТу—М. Кедраў, М. Кнебель, У. Арлоў. Ра-

КАПІТАНЫ

Капітанская вахта пачынаецца а восьмай вечара, а заканчваецца а чацвертай раніцы. Застаецца самы нязручны для сну і адпачынку час. Таму першыя гады кожная вахта здавалася Сямёну Фёдаравічу Коўзіку цягучай ды нуднай. Але з цягам часу адзінота за штурвалам, а пасля — кароткі, урыўкамі, сон, — сталі звычнымі.

Вось і цяпер. Зрабіўшы ў журнале запіс аб прыёме вахты, капітан пажадаў памочніку спакойнага адпачынку, стаў за штурвал, з асалодай закурыў. Навокал было спакойна, і ў памяці, малюнак за малюнкам, паўставала ўсё, што за дзень адбылося.

Некалькі гадзін назад насустрач каравану, які асцярожна пачынаў шырокую дарогу паварота, выскачыла імклівая «ракета». Сямён Фёдаравіч схапіў тады белы флаг-адмашку, выйшаў з рубкі на мосцік і адсалютаваў па ўсіх правілах суднаваджэння. За доўгі рэйс дзесяткі вялікіх і маленькіх суднаў сустракаюцца на рачной дарозе, капітан амаль механічна выконвае гэтую нескладаную працэдуру і ўжо праз колькі хвілін забывае пра сустрэчу. Так было б, відаць, і на гэты раз. Але на «ракеце» нехта раптам выскачыў з рубкі, замахаў шапкай і гучна крыкнуў:

— Добрай дарогі, Фёдаравіч!

Капітан прыкрыў далоняй вочы ад сонца, але так і не паспеў разгледзець твар чалавека. Праз некалькі імгненняў «ракета» ўжо схавалася за паваротам, узнятая ёю крутая хваля ўдарыла ў борт буксіра.

«Хто б гэта? — думаў капітан, стоячы на мосціку.— Вельмі знаёмы голас, ды і постаць...» Вярнуўся ў рубку, спытаў у рулявога:

— Гэтага, што крычаў, не ведаеш?

— Не разгледзеў,— паціснуў плячыма рулявы.

«Ці не Сазонаў Эдзік? — падумаў цяпер раптам Сямён Фёдаравіч.— Быццам яго голас. Ад мяне ж у вучылішча пайшоў, а цяпер, кажуць, на «ракеце». А мо і не ён. Хаця постаць быццам яго...»

І Сямён Фёдаравіч, яшчэ не ўпэўнены, што здагадка правільная, аддаўся больш даўнім успамінам.

...Да Рэчыцы падышлі поўднем, на тры гадзіны апярэдзіўшы графік. Вялізную баржу з лесам хутка паставілі на якар, а лёгкі, без грузу, буксір мякка прыстаў да борта дэбаркадэра. Сямён Фёдаравіч склаў у папку хадавыя дакументы і пакрочыў да доміка ўпраўлення порта.

Высокі, крыху сутулы начальнік порта Рыгор Карніцкі падняўся насустрач.

— З прыбыццём, Сямён. Па вачах бачу —усё добра.

— Так,— адказаў,— у дарозе ніякіх «ЧП», тры гадзіны запасу. Але хлопцы стаміліся страшэнна. Ужо другі рэйс не маем зменнага рулявога. Вахта за вахту забягае. Абяцалі ў Гомелі прыслаць хлопца, ды, відаць, забыліся.

Карніцкі кіўнуў, зняў тэлефонную трубку.

— Гомель, два званкі... Кадры? Дзень добры, кадры. Прыбыў да мяне трыста шэсцьдзесят другі, з лесам. Скардзіцца на вас. Рулявога яму абяцалі... Што? Выехаў? Прама сюды? Добра. Ну, дзякую, бывайце здаровы.

Паклаў трубку:

— Чуў?

— Паглядзім,— сказаў капітан. Але быў задаволены.

Чакалі нядоўга. Сямён Фёдаравіч вярнуўся на буксір, прылёг у каюце адпачыць, а з палубы праз адчыненыя дзверы — незнаёмы малады голас:

— Чыя пасудзіна, марак?

— Цётчына,— прабурчаў памочнік механіка Вярбіцкі.— І не пасудзіна, а буксірны цеплаход. Нумар нуль тры шэсцьдзесят два.

— Ну, тады з прыбыццём мяне, — адказаў малады голас.— Дазвольце адрэкамендавацца. Рулявы Эдуард Сазонаў, па сумяшчальніцтву паэт.

— Вярбіцкі, памочнік механіка. Не паэт.

— На першых жа кроках сустракаю дыяметральна процілеглую асабу. І па пасадзе, і па душы,— рагатнуў навічок.— А дзе капітан?

— Паспееш пазнаёміцца,—ужо з раздражненнем кінуў заўжды спакойны памочнік.— Хадзем у кубрык, ложак пакажу...

Фантазія намалявала Сямёну Фёдаравічу рослага хлопца ў спартыўнай куртцы і шырачэзных штанах. Такога, якіх часам сустракаў на вячэрніх гарадскіх вуліцах...

Потым, калі ўстаў — убачыў: не зусім такі. Заводзілі буксірны трос, выбіралі якар. Сямён Фёдаравіч стаяў у хадавой рубцы побач з рулявым Іванам Рубанавым. Натужна грымеў дызель, дробна трымцелі пераборкі, тонка звінеў каля вядра кубак. Буксір з натугай пераадольваў плынь, забіраючы да высокага правага берагу Дняпра. Нудна цягнуліся секунды, па паўметра, па метру выроўнівалася баржа,— і вось, нарэшце, пайшла, прыцэльваючыся шырокім носам у кільватэрны струмень буксіра.

Сотні разоў бачыў такое Сямён Фёдаравіч і ведаў, што гэтак і павінна быць, але ўсё роўна кожны раз міжволі стрымліваў дыханне...

Навічок жа стаяў на шкафуце нейкі паніклы, непрыкаяны, відаць, яшчэ не ведаў, куды ісці і за што брацца. Вецер шкуматаў яго валасы, ён паспрабаваў прыгладзіць іх, але пахіснуўся і паспешліва ўхапіўся за парэнчы.

«Вось табе і піжон», — падумаў Сямён Фёдаравіч.

За доўгую капітанскую службу дзесяткі такіх стрыгуноў прайшло праз яго рукі. Начытаўшыся кніжак аб марскіх паходах, малайцавата прыходзілі яны ў параходства. Але ў першыя ж мінуты сапраўднай матроскай працы напускная малайцаватасць знікала, з'яўлялася разгубленасць. Вельмі важна было менавіта ў першыя цяжкія дні памагчы ім, падтрымаць, не дапусціць расчаравання ў выбранай справе.

За Коўзікам даўно і трывала ўмацавалася слава капітана-педагога. Колькі салаг прайшло праз яго рукі, колькім даў сапраўдную пуцёўку ў жыццё—ішлі рулявымі, механікамі на другія судны, паступалі ў рачныя і мараходныя вучылішчы. Шмат хто з іх цяпер з капітанскімі нашыўкамі на кіцелях ходзіць па рачных дарогах у рубках буксіраў, пасажырскіх шматпалубных цеплаходаў, грацыёзных «ракет». Але гэта здараецца пазней, а спачатку... Вось стаіць ён, будучы рачны воўк, і разгублена глядзіць па баках. З гэтага часу ён толькі твой, не бацькаў і не матчын, а твой.

Сямён Фёдаравіч выйшаў з рубкі, узяў навічка за плячо:

— Пойдзем, пагаворым...

...Вузкі прамень пражэктара вырваў з цемры ракі рыбацкую лодку, і ўспаміны капітана на хвіліну перарваліся. Відаць, рыбак позна заўважыў караван, і цяпер ліхаманкава гроб, напружана сагнуўшыся на нізка аселай карме.

Але праз мінуту, калі лодка схавалася за кармой, дзесьці пад высокім правым берагам, памяць капітана зноў вярнулася ў даўнія дні.

...Раніцай наступнага дня Сямён Фёдаравіч пасля кароткага сну ў душнай каюце цяжка падняўся на мосцік. Дняпро прыкметна пашырэў. Іскрыліся пад сонцам шырокія плёсы, патанала ў буйной зеляніне старое рэчышча.

Сазонаў і свабодны ад вахты рулявы мылі палубу. Капітан падышоў да вахтавага, узяў у яго штурвал, кіўнуў у бок навічка:

— Падмяні яго і скажы, хай ідзе ў рубку.

Калі Сазонаў нясмела ступіў у рубку і стаў побач, Сямён Фёдаравіч спытаў:

— На веласіпедзе ўмееш ездзіць?

Навічок памаўчаў—думаў, капітан насміхаецца. Потым выціснуў нерашуча:

— Ну, умею.

— Дамовімся—без «ну». Хто вучыў?

— Сусед.

— Што казаў пры гэтым?

Сазонаў здагадаўся, усміхнуўся:

— Каб на кола не глядзеў, толькі ўперад, на дарогу...

— Правільна казаў. Так і тут. Створны знак бачыш? Гэта табе дарога. А тое самае кола, на якое глядзець не трэба, — нос буксіра, яго паўбак, калі чуў. Гэта для пачатку. А цяпер станавіся тут. Трымай.

І капітан паказаў на адшліфаваны дзесяткамі рук штурвал. Сазонаў сумеўся, асцярожна, быццам на гарачае жалеза, паклаў на яго рукі. Сямён Фёдаравіч, схаваўшы ўсмешку, глядзеў уперад, на плаўны выгіб ракі:

— Так... А цяпер трошкі ўправа... Не глядзі на рукі, не глядзі. Улева трошкі... Добра.

З гэтага дня капітан уручыў навічку штурвал, і спачатку па дзве вахты выстойваў побач, гатовы ў любую секунду паправіць, падказаць.

З высокага чыстага неба сарвалася зорка і ўпала дзесьці далёка ў рачную затоку. Сямён Фёдаравіч, губляючы ланцужок успамінаў, прасачыў за яе палётам, прыслухаўся да роўнай работы дызеля, азірнуўся на агеньчык баржы. «Ну, а далей?».

...Рэйс ішоў за рэйсам. Вазілі ўверх і ўніз угнаенні, гравій, касілкі, лес, аўтамабілі. Ад рэйса да рэйса Сазонаў ўсё больш упэўнена спраўляўся са сваімі абавязкамі. Неўзабаве ўжо не так часта, як раней, пачаў заходзіць у рубку на яго вахту Сямён Фёдаравіч.

Звычайна пачаўся і той памятны дзень. У чатыры раніцы Сазонаў падняўся ў рубку, і, пацепваючыся ад ранішняга халадку, стаў за штурвал. Коўзік распісаўся ў вахценным журнале, пажадаў Сазонаву шчаслівай вахты, пайшоў уніз.

Душна і цесна здалося ў каюце пасля рубкі. Прылёг на ложак, заплюшчыў стомлена вочы. Марудна плылі мінуты, а сну не было. Накінуў на плечы пінжак, выйшаў на палубу. Звычна паглядзеў уверх на зашклёныя дзверы рубкі — знаёмай постаці рулявога не было відаць. Занепакоена падняўся па трапу. Убачыў: Сазонаў схіліўся над радыёпрыёмнікам, а штурвал тырчыць сіратой. Высокі дняпроўскі бераг паплыў на буксір, Сямён Фёдаравіч ірвануў да штурвала, рэзка крутнуў улева, яшчэ і яшчэ, буксір нахіліўся, задрыжэў у напружанні.

Бераг яшчэ набліжаўся, але Сямён Фёдаравіч разумеў: абышлося. «Пайшоў, пайшоў»,—шаптаў, быццам дапамагаючы машыне адолець плынь. І бераг пачаў адступаць. Паплыў побач з бортам і здаваўся не такім высокім і грозным.

Пачала выроўнівацца за буксірам і баржа. Але калі ўжо здавалася, што небяспека мінавала, дніща скрыгатнула па падводнай мелі. Сямён Фёдаравіч штосілы кінуў буксір яшчэ лявей, моцны рывок балюча прыціснуў капітана да штурвала. Потым яшчэ рывок, праўда, слабейшы, і баржа, толькі краем зачапіўшы мель, увайшла ў кільватэрны струмень.

Сямён Фёдаравіч стомлена адхіснуўся ад штурвала, палез у кішэню па папяросу, азірнуўся. Сазонаў стаяў бледны. Прыёмнік скавытаў модную мелодыю.

— З вахты сёння здымаю,—выдыхнуў Сямён Фёдаравіч.—Ідзі спаць.

Сазонаў хацеў нешта сказаць, але толькі паварушыў губамі. Пайшоў уніз. Потым вярнуўся, унурыў галаву:

— На бераг спішыце. Так лепш будзе.

— Не спішу,—амаль крыкнуў Сямён Фёдаравіч. І тут жа, узяўшы сябе ў рукі, дадаў. — Я як лепш, падумаю...

— Тады, прашу вас, хлопцам не кажыце.

— Ідзі...

Сонца ўстала яснае і спякотнае. Снедалі на палубе, радуючыся пагодлівай раніцы.

Калі падышоў Сямён Фёдаравіч, механік запытаў:

— Што за танец ноччу быў, капітан? Скрозь сон чуў, а прачнуцца не мог.

Сазонаў схіліў галаву. Рука з відэльцам прыкметна дрыжэла.

Сямён Фёдаравіч няспешна адламаў акраец хлеба.

— Лухта. Трошкі памыліўся па-старэчы. Пранесла...

Заўважыў, як удзячна бліснулі вочы Сазонава. Падумаў рашуча і цвёрда: «Хоць раз праштрафіцца —спішу».

Дахамі і таполямі адкрыўся Лоеў, перарваў ланцужок успамінаў. У рубку ўвайшоў Рубанаў. Прынёс з сабою пах адэкалону—відаць, толькі пагаліўся.

— Пытанне такое ў мяне,—не адрываючы погляду ад ракі, сказаў Сямён Фёдаравіч.—Памятаеш, быў у нас такі Эдзік Сазонаў. Дзе ён цяпер, не чуў?

— Ды ў Кіеве, нібыта, капітанам.

— У Кіеве, кажаш.—Усміхнуўся, падумаў: «Значыць, не ён быў учора на «ракеце». А падобны і постацью, і голасам. Відаць, так хтось».

Зноў бліснулі хвалі Сожа. Капітан паглядзеў туды, прымерваючыся, як праз дзве—тры гадзіны павядзе караван уверх, наперакор пругкай плыні.

С. БАРАДОЎСКІ,
А. ШАБАЛІН.

Верхне-Дняпроўскае параходства.

З БЕРАГОЎ МАСКВЫ-РАКІ, З БЕРАГОЎ ДНЯПРА...

зам з тым маладая рэжысура і вопытныя майстры ўзбагачаюць пастановачныя прыёмы, шукаюць жанравую разнастайнасць у рэпертуары і яго трактоўцы. У спісе ліпеньскіх спектакляў 1973 года ў Мінску мы чытаем — «Альберт Эйнштэйн» М. Пагодзіна і «Мс'е дэ Пурсан'як» Мальера, псіхалагічная драма і мюзікл паводле класічнай камедыі. Малады рэжысёр Аляксандр Таўстаногаў паставіў востра праблемную сучасную камедыю «Развітанне ў чэрвені» А. Вампілава, дзе з публіцыстычным напалам тэатр раскрывае складаны працэс маральнага станаўлення чалавека нашых дзён. Аўтар шырока папулярнай драмы «Чалавек збоку» І. Дварэцкі прадстаўлены ў гасцей новым творам — п'есай «Генерал Чапракоў у адстаўцы». З класікі на афішы пазначаны імёны Шылера і Астроўскага, і зноў багатая амплітуда — ад рамантычнай меладрамы «Здрада і каханне» да мастацкага даследавання побыту і нораваў рускага грамадства ў камедыі «Жаніцьба Бялугіна».

Гастролі Маскоўскага драматычнага тэатра імя К. Станіслаўскага цікавыя і тым, што мінская грамадскасць яшчэ раз пабачыць (маючы магчымасць параўнаць уражанні ад мінулай сустрэчы з гэтым калектывам) няпросты і па-творчы складаны этап у працэсе, калі стабільныя метады акцёрскага мастацтва развіваюцца пад уплывам часу і з прыходам новых талентаў. Уласцівы і раней гэтай трупе дух эксперыментатарства дае цяпер якасна новы плён. У разуменні рэалізму на сцэне, у інтэрпрэтацыі даўно вядомых драматургічных твораў, у манеры раскрыцця тэм і праблем сучаснасці.

Госці з Масквы вядуць свой летапіс студыйнага і тэатральнага жыцця з сярэдзіны трыццатых гадоў. Херсонскі дзяржаўны ўкраінскі музычна-драматычны тэатр іграе трыццаць сёмы сезон. Працуе ён у лепшых традыцыях украінскай сцэны. Тое, што ў культуру сцэнічнага мастацтва ўнеслі такія волаты-праўдалюбцы, як Г. Юра і Н. Ужвій, А. Курбас і А. Бучма, Б. Раманіцкі і Ю. Шумскі, мастакі, выхаваныя на прынцыпах сацыялістычнага рэалізму, узбагачала эстэтыку сучаснага тэатра Украіны, у тым ліку і мастацтва нашых сёлетніх гастралёраў. Госці з горада на Дняпры пакажуць мінчанам спектаклі, дзе эпічны размах падзей спалучаецца з лірыкай пачуццяў, а старонкі мінулага «чытаюцца» ўдзячнымі нашчадкамі, здольнымі даць сённяшняе асвятленне вобразам былых часоў. Мабыць, гэта вельмі сімвалічна, што херсонская трупа першымі на афішы пазначыла імёны лаўрэатаў Ленінскай прэміі А. Карнейчука і М. Стэльмаха, пісьменнікаў, якіх так добра ведаюць і любяць на Беларусі. Да таго ж і ў творчай біяграфіі Акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы і Дзяржаўнага тэатра імя Я. Коласа з творамі гэтых выдатных драматургаў звязаны немалыя поспехі, якія сведчаць аб узаемаплённым уздзеянні нацыянальных культур («Платон Крэчат», «Фронт», «Калінавы гай», «Макар Дубрава», «Памяць сэрца» — у купалаўцаў, «Гібель эскадры» і «Праўда і крыўда»— у коласаўцаў).

Ведаюць і любяць беларускія гледачы творчасць І. Карпенкі-Карага— класіка ўкраінскай сцэны. Яшчэ ў дакастрычніцкі перыяд аматарскія гурткі ігралі яго драмы на Полаччыне і Гродзеншчыне. Госці з Херсона пакажуць мінчанам змястоўныя і займальныя па сюжэтах сацыяльна-бытавыя драмы — «Мартын Баруля» і «Грэх і пакаянне» І. Карпенкі-Карага.

Мінск пазнаёміцца з плеядай сталых майстроў і артыстычнай моладзю трупы, якія з аднолькавай адказнасцю перад гледачом іграюць вясёлую музычную камедыю і высокую драму.

...Два тэатры. Грамадскасць сталіцы Беларусі цёпла вітае гасцей. Калектывы з Масквы і з украінскага горада Херсона будуць сустрэты з традыцыйнай гасціннасцю. Патрабавальны і добразычлівы глядач чакае сустрэч з мастацтвам яркай думкі, шчырага натхнення і выразнай формы. Менавіта гэтым і славіцца Маскоўскі тэатр імя К. Станіслаўскага, менавіта гэта з'яўляецца мэтай творчых шуканняў Херсонскага ўкраінскага музычна-драматычнага тэатра.

«Сардэчна запрашаем!» — гавораць ім жыхары Мінска.

АСЯНІНА — ВЯРТАННЕ Ў ВЯСНУ

ДАЎНО ЗАПАЎ і застаўся ў памяці верш Аляксея Зарыцкага «Мая асяніна», верш, які даў назву яго новаму паэтычнаму зборніку. Быў калісьці ў беларускай вёсцы звычай. Позняй восенню пастух канчаў пасвіць сялянскую жывёлу. Развітваўся з полем і птушкамі, з лесам і гукамі берасцянай трубы. І з адчуваннем споўненага абавязку хадзіў па хатах і збіраў асяніну — зароблены дар. Паэт на парозе сваёй умоўнай восені таксама займеў патрэбу агледзець зробленае, што ён пакінуў на пройдзенай дарозе, з чым развітаўся і што прыдбаў. «За свой век я няшмат напасвіў песень», — сцвярджае Аляксей Зарыцкі. Але мы можам, бадай, і не згадзіцца з гэтым, маючы на ўвазе два тамы вершаў і паэм, не паверыць катэгарычнаму слову, каб яшчэ больш паверыць шчырасці, натуральнай, нават крышку сарамлівай, інтанацыі паэта.

Гляджу на вокладку кнігі. Дрэвы, зямля, правады. Лісток паміж прозвішчам аўтара і назвай кнігі. Адзін лісток, зжаўцелы, асенні. Занадта паслухмяная, просталінейная ілюстрацыя асяніны: асенні краявід, асенняя фарбы. Здаецца, калі б я быў мастаком, то гэтыя дрэвы апрануў бы ў лісце, а той сімвалічны лісток, што на белым фоне, таксама намаляваў бы зялёным. Бо так я прачытаў і ўспрыняў кнігу: у ёй больш вясны, чым восені, восень там, дзе яна канчаецца, адразу ж без асаблівых прамежкаў і перыядаў, пераходзіць у вясну. Мы прымаем без агаворкі такі кругаварот, як прымаем усю адметную, самабытную прыроду паэзіі Зарыцкага.

Ёсць у кнізе старонкі асеннiй элегіі, якія выклікаюць у нас сугучны настрой. З тым, што адбываецца ў прыродзе, паэт параўноўвае часам унутраны стан чалавека: «Спадаюць з вуснаў словы гора, як пажоўклае лісце ўвосень з вецця». Нам даводзіцца зноў перажываць наплыў журбы і смутку перад немінучым патуханнем апошніх кветак і ўсяго, чым жыве прырода. Мы ўдзячны ўражліваму зроку паэта. Прыкмечанае і выказанае ім прасвятляе нашу журбу, здымае адчутую гнятлівасць і надае сэнс нядаўняму болю. Вісяць на дрэве даспелыя яблыкі, кожнае зерне чарнее, нібы зрэнка ў чыстым воку. Гэта зерні будучага здзіўляючага хараства, перад якім усё цяпер прыціхла і знямела. І слова паэта, якое ўвабрала ў сябе ўзрушанасць душы, многія эмацыянальныя адценні, становіцца маленнем і калыханкай, трывогай і спадзяванем, калі ён вось так звяртаецца да маўклівых асенніх барознаў: «Дык адпачні ж, зямелька, адпачні ж перад новаю сяўбой, перад новым жнівом». І — раптоўны, як сонца з лесу, прыход вясны. «Чуеце!.. Ластаўкі з цёплых краёў прыляцелі. Проста ў вясну адчыняю акно». Проста ў вясну... Можа, і выпадковая акалічнасць: у кнізе «Мая асяніна» няма ніводнай «зімовай» старонкі. І вельмі багата вясны, сонца, прастору. Гэта і ў апісанні прыроды, у вобразах і дэталях, і ў светаадчуванні. З маленства, з дняпроўскага лугу прылятае і кружыць над пісьмовым сталом птушка. А ў асеннім роздуме над зялёнай руннію прысутнічае жаваранак — «спявак вялікі». Нават у размове аб непазбежным, аб тым, што за парогам зямным, паэт думае аб майскай квецені. У вершы «Дзве просьбы» ёсць такое маленне: «А яшчэ на абочыне яблыньку дбала пасадзіце, сябры, даглядайце яе, каб вясною яна белы цвет асыпала на спацелыя чорныя грудзі мае».

Заўважаем: паэт часта карыстаецца зваротамі, яны ў яго то просьба, то парада, то пажаданне, то засцярога. Вось зварот да кожнага: «Ты гэты дзень прадоўжы хоць трошкі, сонца сваёй прытрымай даланёй». Да маладога сучасніка: «Не тапчыся з шэрым клункам па стаптаных сцежках, дай крылы, хлопча, юным думкам». Да закаханых: «...любоў дзяліце адну да труны — на дваіх».

Звароты-заклікі, звароты-павучанні з'яўляюцца натуральнымі для Аляксея Зарыцкага, для яго акрэсленай грамадзянскай пазіцыі. Ён можа даверліва, як у сяброўскай гутарцы, заўважыць: «...мае Валхаўбуды, мае Днепрабуды». Жартаўліва ўсміхнуцца: «Вось калі памру я, дык ужо — ўсур'ёз». Засведчыць публіцыстычным радком: «Стараюць паэмы не толькі паэты, нястомна стварае народ-будаўнік іх».

Думку паэта, якая спадабалася і лёгка запомнілася, мы паспелі «прысвоіць» ужо, узяць у свой духоўны ўжытак. Пасля ж падумалася: ці не вельмі проста сказана, аголена неяк, без фарбаў і адценняў, без тонкіх нюансаў, якія ж, канечне, даступны такому майстру слова, як Аляксей Зарыцкі. А ў яго нібы і прэтэнзіі няма на «высокую паэтычнасць». Здаецца часам — не верш успрымаеш, а проста слухаеш цікавага субяседніка, якіх ці мала, а ён табе і пра сваіх сяброў, і аб тым, што зведаў і перажыў на белым свеце, і каго любіць і каго ненавідзіць, і нават пра ўласную калыску:

Нарадзіўся я ў Хоцімску, —
Калісь глуш-глухмень.
...Належала да Смаленскай губерні,
А суседнія вулічкі ўжо Магілёўскай былі.

...Над самай-самай мяжой
Калыхалася мая калыска:
То з Расіі ды ў Беларусь,
То ў Расію ды з Беларусі.

Гэтак жа няхітра, без асаблівых «упрыгожванняў», нібы аўтар свядома ігнаруе вядомыя яму сакрэты рамяства, напісаны вершы «Галоўны гадзіннік», «Чытаючы пра Леніна», «Сэрца Шапэна», «Мая бяссонніца» і іншыя.

Дык што гэта: набліжэнне да прозы? І ўвогуле — добра гэта ці дрэнна? Відаць, у творчасці Зарыцкага, як і ў некаторых іншых паэтаў, мы назіраем тое, што ўжо заўважана даследчыкамі сучаснай паэзіі і сфармулявана прыкладна так: гэта падобна на адмаўленне ад вершаў, свядомае альбо інтуітыўнае прызнанне нейнага паражэння «паэтычнасці» перад творам праўды, усведамленне таго, што ў мастацтве іншы раз бывае больш важна «не ўмець, чым умець». Як бы ні было, якую б формулу мы ні падводзілі, у песні Аляксея Зарыцкага пры ўсіх яе асаблівасцях адчуваецца пульс жыцця, дыханне Радзімы, праўда аб жыцці чалавека, і гэта сапраўдная паэзія.

Клопат кожнага мастака — не паўтарыць створанае, ўсялякі раз паўстаць у якасным абнаўленні, разумеючы гэта як рост і ўзыходжанне на запаветную круцізну. Ды не можа творца закрэсліць сябе ранейшага, адарвацца ад свайго ценю. Перажытае ў мінулым не вычарпана напісаным у той перыяд. І яно не раз яшчэ адгукнецца, і мы адчуем знаёмае, сугучнае ў тым, што сказана сёння. Тады ледзь улоўнае, шчымліва-павеўнае, як пах травінкі, зноў нагадае мурожныя лугі маленства, запыленыя кюветы дарог юнацтва, зялёнае рэдкае пакрыццё брацкай магілы. Вось верш А. Зарыцкага «сябрам-аднагодкам»:

Было ў нас юнацтва,
Як вылет арліны,
Умела і сталасць высока ўздымацца.
Нам трэба да самай апошняй хвіліны
Душою, сябры, маладымі астацца.

Прачытаў я гэтыя радкі і міжволі адарваўся ад кнігі... «Як вылет арліны», «...высока ўздымацца», «да самай апошняй хвіліны»... Падступіла, нахлынула з далёкага 1945-га напісаная тады Зарыцкім «Арліная крыніца», класічны верш пра подзвіг Мікалая Гастэлы. Памятаеце? «...Там, дзе Гастэлава сэрца перастала, успыхнуўшы, біцца, — на тым месцы сягоння ліецца з глыбіні нечапанай крыніца». Памяць вяртала не толькі знаёмыя радкі, а шмат незабыўнага, асабістага і ўсіхняга, што адбалела ўжо, уляглося светлым смуткам ды пры непагодзе зноў вярэдзіць душу. Пасля такога душэўнага прыпынку я працягваў чытаць той, перарваны мною ў самым пачатку, верш. Далей пайшлі радкі:

Руку нам дай, моладзь,
Не для развітання:
Дарма, што ўжо наш адвячорак на схіле,
А ты, маладосць, яшчэ толькі світанне...

Спыніўся. Словы «адвячорак» і «світанне» сталі побач і зноў вярнулі да сімвалічнай арлінай крыніцы: «Вербы ўзнялі над ёй свае шаты, і ваду з яе п'юць арляняты».

То ці варта пасля ўсяго гэтага тлумачыць шырока тое, што чытач адчуў і зразумеў: паэта па-ранейшаму хвалюе тэма пераемнасці пакаленняў, больш таго, думкі аб маральнай чысціні і разуменні грамадзянскага абавязку тымі, хто пасля нас прыйдзе ў свет, становяцца больш турботнымі і засяроджанымі. Паэт шчодра дзеліцца жыццёвым вопытам і ўсімі набыткамі душы.

Кніга «Мая асяніна» ўся з дабрыні і жыццёвай мудрасці, яна вельмі змястоўная, цэльная пры ўсёй разнастайнасці і шматпланавасці. У ёй глыбіня гістарычных вытокаў і выразны подых сучаснасці, цяперашні свет трывог і надзей. Зарыцкі, застаючыся паслядоўным лірыкам, валодае эпічнымі сродкамі. Яго «вершаваныя апавяданні» пра Леніна (новыя старонкі беларускай Ленініяны), Скарыну, Шапэна, пра сяброў-паэтаў можна лічыць маленькімі паэмамі. Лірыку, эпас адценьваюць публіцыстыка, спакойны гумар.

Як мы пераканаліся, асяніна Аляксея Зарыцкага — вяртанне ў вясну, дзе вербы і крыніцы, запаветныя світанні, блакітная песня неба, зялёная песня родных прастораў, сіняя песня вачэй каханай. Молада, звонка гучаць словы паэта:

Яшчэ мяне ўсхвалюй, дарога.
Яшчэ мяне ўстрывож, любоў.

Аляксей ПЫСІН.

БЯСЕДА АДБЫЛАСЯ...

СЯРГЕЙ ЗАКОННІКАЎ не можа паскардзіцца на рэдкую публікацыю сваіх твораў. Яго вершы даволі часта сустракаюцца на старонках перыядычных выданняў, яны ўваходзілі ў калектыўныя зборнікі. Патрабавальны чытач, напэўна, заўважыў, што, нягледзячы на пэўныя пралікі мастацкага характару, малады паэт у большасці сваіх твораў закранае пытанні, якія па-сапраўднаму хвалююць нашага сучасніка.

І вось перад намі — першы паэтычны зборнік С. Законнікава «Бяседа». Пад яго вокладкай сабрана каля шасці дзесяткаў вершаў, знаёмых нам па ранейшых публікацыях. Кніга з густам аформлена, ёй характэрна лірычная настраёвасць, тэматычная актуальнасць.

Сталасцю паэтычнага мыслення і свежасцю выяўленчых фарбаў дыхаюць шмат якія творы гэтай кнігі, сама назва якой метафарычная. «Бяседа» — аб'ёмны, асацыятыўны вобраз. Не выпадкова ў вершы «Прыходзьце да мяне» паэт гасцінна запрашае чытача на шчырую бяседу...

У лепшых вершах зборніка і прыгажосць роднай прыроды, і дабрыня, якую рупны чалавек дорыць зямлі, зліваюцца ў адно цэлае згодна і арганічна, складаюць суму ўражанняў, сугучных тым, што калісьці, магчыма, яшчэ ў маленстве запалі ў сэрца паэта.

Мне здаецца, што зямля вясною —
Самая мудрэйшая зямля.
Сок імчыць дарогаю кляновай
Да галінак кволых ад камля.

Сонца птушкі з выраю прынеслі,
Разгайдалі, кінулі ў блакіт.
Дораць людзям радасныя песні
Чорныя, вясёлыя шпакі.

Вены рэк набухлі да знямогі,
Зносяць крыг тугія паглаўкі.
З прадчуваннем радаснай трывогі
Клічуць у дарогу бальшакі...

(«Вясна»).

Такімі вось знешне простымі, будзённымі і ў той жа час надзвычай адухоўленымі фарбамі малюе паэт абуджэнне роднай прыроды. Верш наглядна паказвае знітаванасць чалавечых пачуццяў і сіл прыроды, іх гарманічную еднасць. Дзякуючы рэльефнай, рухомай метафарычнасці перадаецца адначасова і ўрачыстае адраджэнне прыроды, і водгук чалавечага сэрца на гэта адраджэнне.

Неяк Аляксандр Блок зазначыў: «... у паэце абавязкова павінна быць нешта святочнае». Развіваючы гэту думку цудоўнага рускага паэта, можна дадаць, што, бадай, асноўная задача паэта — паэтызаваць звычайнае, а не вышукваць сярод звычайнага паэтычнае. Паглядзіце, як хораша, натуральна і шчыра гучыць голас маладога паэта ў вершы «Алёнка»:

Пазайздросце сёння мне, паэты,
Кіньце рыфмы, праганіце сум.
Я нясу кавалачак Сусвету,
Будучыню нашую нясу.

А яна смяецца без прычыны,
Як вада ў вясновым раўчуку...
Я нясу маленькую дзяўчынку,
Я нясу суседчыну дачку.

Асцярожна крочу, каб не ўпасці,
І плыве сцяжынка да ракі...
Не маё, але такое шчасце
Туліцца ласкава да шчакі...

Многія іншыя вершы «Бяседы» пакідаюць уражанне свежасці, пластычнасці, глыбокага жыццёвага аптымізму...

Тэма Вялікай Айчыннай вайны стала адной з цэнтральных у беларускай паэзіі. Пра вайну напісана нямала — цікава і таленавіта. Пагэтаму вельмі важна, каб кожны, хто бярэцца за гэту тэму, усвядоміў і яе значнасць, і вялікую адказнасць за арыгінальнае мастацкае ўвасабленне сваіх задум.

Зусім натуральна ўспрымаецца той факт, што амаль трэць кнігі С. Законнікава складаюць вершы пра тых, хто «у сорак першым паў...». Радуе грамадзянская пазіцыя аўтара, які піша пра «блакаднае худое пакаленне», чыю памяць будзяць жалобныя званы Хатыні, чыё сэрца баліць ад таго, што «дзесьці натужна равуць бамбавозы». Вось, напрыклад, як прачула, проста перадае паэт шчымлівы смутак па загінуўшых героях у вершы «Партызаны»:

Партызаны прыйшлі да магіл дарагіх...
Дагарае зара на калматых вяршалінах бору.
Памяць зноўку знітоўвае радасць і гора,
Цягне моцную ніць з небыцця да жывых.
Партызаны прыйшлі да магіл дарагіх...
На вачах заблішчалі раптоўныя слёзы,
І глядзяць устрывожана сёстры-бярозы
На братоў пасівелых, маўклівых сваіх.

Такое духоўна-паэтычнае асэнсаванне падзей, з'яў характэрна і для іншых лепшых вершаў С. Законнікава на гэтую важную тэму: «Памяці герояў-абальцаў», «Размова з цёзкам...».

Аднак адна справа, калі С. Законнікаў піша пра тое, што перажыў асабіста, і зусім іншая, калі прадметам свайго творчага даследавання ён выбірае з'явы і падзеі, пра якія ведае толькі з расказаў, кніг і кіно. Тады аўтар нярэдка збіваецца на паўтарэнне агульнавядомага, ужываючы пры гэтым нават мастацкія дэталі, якія ўжо не раз былі выкарыстаны мастакамі слова: «сосны, як удовы», «нібы маці, стаіць цішыня», «васількоў вечна сумныя вочы», «твае рукі — ратавальны круг» і г. д. Гэта ў першую чаргу датычыць такіх вершаў, як «Прабуджэнне», «Партызанскі лес», «Цішыня», «Лясная школа».

«Аб гэтым усім трэба ведаць, таму аб астатнім — пасля. Я лепш раскажу вам пра дзеда, пра дзеда свайго Васіля...», — з самага пачатку ў вершы «Камунар» настройвае нас на цікавы расказ паэт. Але ўжо з наступных радкоў насцярожвае лёгкасць і вобразная недакладнасць, з якой аўтар гаворыць пра падзеі даўно мінулых дзён:

Ён хрышчаны (?) быў на германскай,
Расіі бярог рубяжы.
Ды, бачна, і там быў за «майстра» (?). —
Прынёс аж чатыры крыжы.

А потым драты Перакопа
Яму пад абцасы ляглі.
Плячом адштурхнуўшы Еўропу (?),
Спяшаў дзед да роднай зямлі.

Але ж гэта не расказ пра нейкага казачнага волата, а ўпаўне рэалістычны верш пра дзеда Васіля, які ваяваў за Савецкую ўладу.

Дзесьці вучоныя расшчапляюць атам,
Пра лёсы людзей дыпламаты спрачаюцца.
А ў Глыбачцы дзядзька шалюе хату,
І калыска ў садзе на галлі гайдаецца...

Тут сухія тэзісы актуальнай тэмы, голая канстатацыя факта, які не знайшоў паэтычнага ўвасаблення. Верш такім жа чынам можна працягваць бясконца — нічога не прыбавіцца, не ўбавіцца, ён не ўсхвалюе, бо асабістых адносін паэта да факта мы не назіраем.

Асноўны недахоп многіх вершаў С. Законнікава, на маю думку, — гэта апісальнасць. Апісваюцца, як правіла факты, і толькі факты. А чытач чакае сугнасці факта, яго мастацкага асэнсавання. Шмат у кнізе аднапланавых, павярхоўных замалёвак («Першаадкрыццё», «Маўчанне», «Вечаровыя барвы», «Гараць кастры...», «Спіць жанчына...» і інш.), якія мала скажуць сэрцу чытача. А сапраўдны верш, не сакрэт, павінен быць шматзначным, са сваім «магнітным полем». Толькі тады ў чытача можа ўзнікнуць радасць ці сум з нагоды пэўнай з'явы, падзеі, толькі ў такім выпадку чытач задумаецца...

Разам з тым С. Законнікаву варта больш дысцыплінаваць сваю паэтычную думку, праяўляць большую самастойнасць у творчым пошуку.

АПАЛІНЭР ПА-БЕЛАРУСКУ

У ГІСТОРЫІ ўзаемаадносін беларускай і французскай культур ёсць многа цікавых старонак. Тут і ўзаемныя пераклады (асабліва ў наш час), і паездкі пісьменнікаў (Колас быў у Парыжы, Ралан і Барбюс у Негарэлым і ў Мінску), і кнігі даследчыкаў (пра Беларусь пісалі ў Францыі). Яшчэ ў 1812 годзе тэрмін «Беларусь» быў прызнаны французскім літаратарам — выйшла меладрама Дзюперша «Раманоўскі, або паляк на Беларусі».

Паводле сведчанняў французскіх і польскіх літаратуразнаўцаў, з краем нашым быў цесна звязаны пачуццямі і творчасцю сваёй выдатны паэт Гіём Апалінэр, пачынальнік сучаснай французскай паэзіі. Мы не забываем, што продкі яго — Кастравіцкія — былі родам з Навагрудчыны. Маці — Ангеліка Кастравіцкая — перадала маладому Гіёму паданні і звесткі аб мінулым іх роду, дзед Міхал-Апалінары, у гонар якога і ўзяў сабе паэт прозвішча, паўстанец 1863 года, таксама нямала зрабіў для таго, каб у юнака засталося моцным, на ўсё жыццё, пачуццё пашаны да радзімы продкаў.

І вось паэзія Апалінэра загучала на мове краіны, дзе жылі прадзеды яго, — выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла выбраную Гіёма Апалінэра «Зямны акіян» у перакладзе з французскай мовы Эдзі Агняцвет.

У зборніку прадстаўлены многія праграмныя вершы паэта — з кніг «Бестыярый», «Алкаголі», «Каліграмы» і інш.

Перакладчыца, якая аддала гэтаму зборніку некалькі гадоў нялёгкай працы, здолела данесці да нашага чытача асаблівасці паэзіі выдатнага творцы — вобразную згушчанасць, эмацыянальную напружанасць, інтанацыйна-сінтаксічны рух верша. І Апалінэр у яго беларускім увасабленні гучыць гэтак жа хораша — то лірычна, то з'едліва, то журботна, то весела, — як і ў арыгінале. Чытач таксама заўважыць наватарства паэта, які адмовіўся ад сілабічнага верша і сіметрычнай страфы на карысць вольнага верша, без знешніх прыкмет метра і рыфмы.

Гэтай адмовы яшчэ не адчуваецца ў першай кнізе «Бестыярый, або Картэж Арфея» — дыдактычных вершах пра жывёл, дзе выразна відаць сувязь з народна-паэтычнай традыцыяй. І перакладчыца захоўвае стыль аўтара ў такіх вершах, як «Чарапаха», «Котка», «Заяц», «Вярблюд», «Мыш», «Слон» і інш. (сем вершаў гэтай нізкі перакладзены ўпершыню ў нашай краіне). Хочацца зрабіць аднак некалькі заўваг. Вершы гэтыя — своеасаблівыя подпісы пад малюнкамі (гравюрамі Рауля Дзюфі), а вось малюнкаў і няма ў зборніку. Таму алегарычнасць некаторых вершаў страцілася. Напрыклад, абавязкова трэба было даць гравюру Дзюфі, да якой напісаны верш «Конь»:

Мае настойлівыя мары сплятуцца
з грываю тваёй,
Фурманам добрым лёс мой будзе
на калясніцы залатой;
Нацягне лейцы зухавата верш-кур'ер
І з месца — ўся паэзія ў кар'ер.

На гравюры Дзюфі — не звычайны конь, а Пегас! Таму, калі Апалінэр піша ў арыгінале: «Маё прызначэнне — быць тваім фурманам на калясніцы залатой, мой цвёрды намер — забратаць цябе», то гэтыя словы ўспрымаюцца, як паэтычная дэкларацыя.

Прояснілі б змест некаторых вершаў і каментарыі (хаця б у зносках). Дон Педра, які ўпамінаецца ў вершы «Вярблюд», — гэта не проста дзівак, а сын караля Жаана I, партугальскі паэт і падарожнік.

Добра гучыць у перакладзе паэма «Зона», вельмі характэрная для Апалінэра па ідэях, сістэме вобразаў. У свой час яна была сімвалам эпохі і аказала ўплыў на творчасць паэтаў многіх краін. Віцезслаў Незвал, выдатны чэшскі паэт, назваў паэму «Зона» магутным паэтычным каскадам. Ён лічыў, што «паэзія абавязана Апалінэру ўзнікненнем новага лірызму, якога не ведаў ніхто да яго, нават гігант Уітмэн. Нарадзіўся новы матэрыялістычны паэтычны рэалізм». Эдзі Агняцвет удала перадала гэтую лірычнасць, цікавасць да людзей працы, да прагрэсу і развіцця цывілізацыі, што выказана Апалінэрам у вершах кнігі «Алкаголі». Праўда, можа варта было б захаваць у «Зоне» сатырычнае параўнанне Хрыста з лётчыкамі, якіх ён абганяе па дарозе ў неба. Радкі

Гэта — той наш Хрыстос,
што ўзнімаецца ў неба
бязмежную сінь,
Пабіваючы ўсе заваёвы вяршынь
і вышынь,—

гучаць, на нашу думку, недастаткова з'едліва.

Зямная атмасфера пачуццёвасці ў вершах «Мост Мірабо», «Песня нячшаснага ў каханні», «Анні» і многіх іншых захавана перакладчыцай, светлая журба паэта перададзена тонка і дакладна. Як хораша гучаць беларускія «Ларэлея», «Май»:

Прэч, Лор-шаляніца, свой позірк —
прыстрашка!
У чорным адзенні ты станеш
манашкай.
(«Ларэлея»).

А вецер з Рэйна налятаў з пагрозай,
Трысцё дрыготнае і кветкі налаціў.
(«Май»).

Адэкватныя сродкі знайшла перакладчыца і для перадачы на беларускай мове антываенных вершаў з кнігі «Каліграмы», асабліва такіх, як «Зарэзаная галубка і фантан», «Цуды вайны», «Ёсць» і інш. (Падкрэслім таксама, што вершы «Развітваецца коннік...», «Паштоўка», «Песня любові», «Перамена», «Смутак адной зоркі» друкуюцца ў нашай краіне ўпершыню.)

Зборнік завяршаецца раздзелам «З розных кніг», дзе асабліва варта адзначыць верш «Пралетарыю» — паэтычнае ўслаўленне чалавека працы, якога бязлітасна эксплуатуе панскі лад:

Раскоша панская вітрын!
Усё для іншых ты стварыў адзін.
Стварыў ты гарадоў нядобрых
прыгажосць,
Яны забралі працу ўсю тваю, як ёсць.

Адзін з сяброў Апалінэра, Андрэ Бійі, гаварыў, што ў апошнія месяцы жыцця паэт з цікавасцю сачыў за падзеямі ў рэвалюцыйнай Расіі. «Хто ведае, — заяўляў ён, — можа быць, з усяго гэтага народзіцца нешта вялікае».

Краіна, у якой нарадзіўся новы лад, памятае вялікага сына Францыі, нашчадка паўстанцаў 1863 года. Памятаем і чытаем яго мы на Беларусі, дзе жылі яго продкі. Чытаем, удзячныя паэтэсе Эдзі Агняцвет, што яна далучыла да паэзіі Апалінэра новых чытачоў у нашай рэспубліцы.

Алесь МАЖЭЙКА.

Малюнкі мастака А. Кашкурэвіча да кнігі А. Адамовіча «Хатынская аповесць», якая рыхтуецца да друку ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Ёсць у кнізе «Бяседа» верш «Выспелі высока ў небе зоры...», які канчаецца так:

Акалелы вецер гурбы месіць.
Ад цяпла бягу па цаліку...
А у дзядзькі серабрысты месяц
Бліснуў цуда-рыбай на кручку.

Не спыняючыся на стылістычных канструкцыях гэтага верша, звернем увагу чытача на іншае — на паўтор, яўную запазычанасць паэтычнай метафары.

Вада ў кругах.
Вада ў кругах.
І неба ў ёй не тое...
А воблака? Яно ў руках
Трапечацца жывое,—

памятаеце? Так, гэта адзін з ранніх, цяпер ужо хрэстаматыйных вершаў А. Куляшова — «Воблака». Прыкладаў таго, як паэтычныя вобразы і параўнанні, запазычаныя ў іншых нашых паэтаў, перавандравалі ў кнігу С. Законнікава, можна прыводзіць шмат.

Таксама можна папракнуць аўтара ў неахайнасці, з якой абыходзіцца ён з паэтычным словам. Вельмі ўжо часта паэт ужывае недакладныя рыфмы, накшталт: «плачуць» — «гарлачыкі», «аерам» — «абмералі» і інш. Прыкра, што ў першай кнізе ўвогуле здольнага паэта трапляюцца таксама недарэчныя вобразы, непісьменныя радкі, а то і цэлыя строфы:

А у каня дрыжыць трывожна грыва,
Чаканнем зрэнкі чорныя гараць.
Ды вось падковы срэбныя, бы рыбы,
Пад капыты прыбітыя (?) блішчаць...
(«Ля кузні»).

Да ўсяго сказанага варта, відаць, дадаць, што нельга пісаць па-беларуску: «коцяць слёзы» абс «заінеўшыя хаты». Думаецца, недарэчна гучыць і такі «арыгінальны» вобраз, як: «з цнатлівай усмешкай рабіна ўпала ў сон».

Творчая вучоба...Без яе нельга, яна неабходна як старэйшаму паэту, так і таму, хто толькі ўваходзіць сваімі творамі ў цудоўны свет паэзіі. Але дрэнна, калі аўтар ставіцца да пэўных паэтычных узораў некрытычна, яшчэ горш, — калі свядома ці падсвядома запазычвае гатовыя параўнанні ў сваіх нават таленавітых папярэднікаў. Прывяду толькі некаторыя з аднастайных і недарэчы ўжытых параўнанняў і метафар, якіх у кнізе С. Законнікава нямала: «быццам партызан, спяшае ранак», «раніца тупае ў блакітным фартуху», «па завуголлю мароз у валёнках тупае», «патэльня вавёркай вырываецца з рук», «сквірчыць на патэльні падмазка, нібыта... галодны вяпрук», «вятры, як ваўкі галодныя», «агонь сарокай у печы сакоча», «завея, як цялятка...», «нібы дзяды... ляжаць гуркі...» і г. д. Самі па сабе, без кантэксту, асобныя з гэтых параўнанняў — нібыта і цікавыя, прываблівыя, маюць права на існаванне, асабліва ў творах гумарыстычных, сатырычна-іранічных. Але С. Законнікаў іх выкарыстоўвае не заўсёды да месца.

Безумоўна, разглядаючы першую паэтычную кнігу С. Законнікава «Бяседа», можна было б акцэнтаваць гаворку на тым лепшым, што ў ёй ёсць. «Балада пра чырвоных», «Размова з цёзкам», «Чаканне», «На Ушацкіх азёрах», «Калодзежы», «Снягі», «Вусны — суніцы...» — гэта, паўтараю, сапраўдныя вершы, у якіх думка і пачуццё гарманічна з'яднаны, выражаны паэтычна, вобразна.

Над Белай Руссю
чорная імгла,
І кроў у жылах
не ад сцюжы стыне.
Ляціць у хмарах
попел ад Хатыні.
Над Белай Руссю
чорная імгла.
Сыны не чуюць
матчынай тугі,
Маўчаць яны,
чарнявыя і русыя...
Калі ідуць
маўклівыя снягі.
Што сніцца табе, поле беларускае?

Гэтыя радкі з верша «Снягі» яшчэ раз яскрава сведчаць, што малады паэт можа пісаць цікава, свежа, арыгінальна. Аднак, як падкрэслівалася, не ўсё ў паэта раўназначнае. І тыя крытычныя заўвагі, якія выказаны ў яго адрас, толькі сяброўская перасцярога на далейшае: хай будзе лепшай наступная кніга.

Мікола ФЕДЗЮКОВІЧ.

КАБ ДУМКІ І ПАЧУЦЦІ БУДЗІЛІ

Пры Мінскім абласным доме народнай творчасці адбыўся семінар пачынаючых паэтаў вобласці Такі семінар праводзіўся ўпершыню. Тэма гаворкі — сувязь маладых літаратараў з калектывамі мастацкай самадзейнасці.

— Калектывам мастацкай самадзейнасці трэба больш уважліва сачыць за сваёй раённай газетай, чытаць літаратурныя старонкі, запрашаць здольных аўтараў да супрацоўніцтва, — гаварыў удзельнік семінара, завуч школы з Барысаўскага раёна Мікола Мятліцкі.

— І ў той жа час маладым не трэба цурацца мастацкай самадзейнасці, а праяўляць актыўнасць, не толькі напісаць верш ці байку, а можа і стаць выканаўцам уласнага твора са сцэны, — выказаў думку літсупрацоўнік рэдакцыі Дзяржынскай раённай газеты «Сцяг Кастрычніка», актыўны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці Яўген Абражэвіч.

— Мастацкая самадзейнасць — своеасаблівая трыбуна літаратара, — падтрымаў Абражэвіча Віктар Бародзіч са Слуцка. — Нам трэба больш актыўна ўдзельнічаць у ёй.

На семінары выступілі паэты Мікола Федзюковіч, Алесь Камароўскі, Іван Маркевіч.

Яўген ХВАЛЕЙ,
старшы метадыст, рэдактар Мінскага АДНТ.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

К. Астроўскі. Мастацтва ў барацьбе за новага чалавека. Мастак В. Маеўскі. На рускай мове. 1973 г., 88 стар., цана 14 кап.

В. Зялінскі. У баях выпрабаваныя. Мастак Г. Малышаў. На рускай мове. 1973 г., 336 стар., тыраж 75000 экз., цана 68 кап.

П. Ляхоўскі. Пасланцы Вялікай зямлі. Мастак Ю. Архіпаў. На рускай мове. 1973 г., 112 стар., тыраж 40000 экз., цана 16 кап.

М. Чаргінец. Чацвёрты след. Мастак П. Калінін. На рускай мове. 1973 г., 144 стар., цана 19 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»

Х. Мальцінскі. Круг дружбы. Вершы. Мастацкі рэдактар Л. Прагін. 1973 г., 176 стар., тыраж 4 000 экз., цана 42 кап.

Ул. Паўлаў. Ад агню і мяча. Аповесць і апавяданні. Мастак В. Клімента. 1973 г., 192 стар., тыраж 7000 экз., цана 40 кап.

П. Прыходзька. Сын камунара. Паэма. Малюнкі М. Бельскага. 1973 г., 56 стар., тыраж 5000 экз., цана 14 кап.

Б. Сачанка. Памяць. Аповесці і апавяданні. Мастак А. Салькоў. 1973 г., 304 стар., тыраж 7000 экз., цана 60 кап.

Хв. Шынклер. Петрык завадатар. Аповесць. Мастак С. Волкаў. 1973 г., 87 стар., тыраж 15000 экз., цана 13 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАВУКА І ТЭХНІКА»

С. Андраюк. Жыццё, літаратура, героі. Вокладка Г. Крычэўскага. 1973 г., 176 стар., тыраж 6650 экз., цана 70 кап.

ВЫДАВЕЦТВА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Е. Бондарава. У кадры і за кадрам. Пра людзей і фільмы беларускага кіно. Мастацкі рэдактар Л. Мядзведская. На рускай мове. 1973 г., 203 стар., тыраж 1600 экз., цана 1 руб. 16 кап.

ТВОРЧЫ ПАРТРЭТ

ТЫСЯЧЫ НЕБАСХІЛАЎ

ЖУРАЎЛІНЫЯ трубы вясны...

Ці не пад іх серабрысты звон даверліва раскрываецца нясмелая пупышка запаветнага слова? Няўрымслівыя раўчукі нястомна свідруюць снег, каб недзе далёка-далёка адсюль зліцца з неўтаймаванай акіянскай стыхіяй і пасля доўгага кругазвароту вярнуцца на роднае неба беласнежнай аблачынкай. У такія хвіліны і адчуваеш непарыўную еднасць са светам. Хочаш падзяліцца з людзьмі сваім духоўным набыткам. Зрэшты, знешне гэта можа выглядаць і будзённа:

Цыбаты бусел дзюбай клюнуў сонца —
Прамень зламаўся і з вясёлым звонам
Асыпаўся на травы, на мяне.
Вячэрняя блакітная рачулка,
Падштурхваючы хвалямі малымі,
Каціла міліён маладзікоў.
Я многа іх набраў — паўнюткі кошык
І раздарыў сяброўкам і сябрам.

Перапоўненасць сэрца і змяшчэнне прывычных рэчаў — пачатак нараджэння паэзіі. Нічога немагчымага няма. Ты — творца. Ты ўсё пераасэнсоўваеш па законах прыгажосці. Кожны патаемны рух ловіць уражлівая душа. Ты чуеш, як «вішні трызняць у трывожным дасцяванні» і ў тонкім шолаху інею распазнаеш пералівы вясельных званкоў. Ты выходзіш да чалавека. І тут слова становіцца справай — яно набывае відушчасць. Сваёй увагай яно не абмінае тваіх аднагодкаў — меліяратараў і садаводаў, лесарубаў і лётчыкаў, калгаснікаў і пагранічнікаў. Гэта — адна дружная сям'я. Твае паплечнікі і аднадумцы. Людзі аднаго прызвання. Зіхатлівае сонца юнацтва з такой шчодрасцю б'е ў вочы, што паспяваеш разглядзець аблічча адной каханай: «А неба сінь глыбокая, як вочы маёй любімай». Для яе не сорамна дастаць і вясёлку з нябёсаў. І не хацеў бы на іх бачыць аніякага цяню, але

Нябачная першая куля
ля вуха злавесна свісне,
Зямля у нябёсы дзьмухне крывавай віхурай гранат,
Барвовая душная хмара над ціхім акопам навісне,
Таварыш паранены войкне —
і ты зразумееш: вайна.

Вайна!

Каб спасцігнуць сэнс гэтага злавеснага слова, спатрэбяцца чатыры пакутлівыя гады. Усе з'явы і каштоўнасці набудуць новае вымярэнне. Нязменным застанецца адно — сыноўняя любоў да Радзімы. Але і яна стане глыбейшай.

Уявіце сябе на бяскрайняй снежнай раўніне. Мароз такі, што птушкі дранцвеюць на ляту. У халоднай смузе абрысы варожых акопаў. Сціхла вуркатанне танкавых матораў. Гарматы астываюць пасля зацяжнай страляніны. Кароткая перадышка вялікай бітвы. Цішыня. Але нянавісць не мае права адпачываць. Там, у прывіднай заінелай далечыні, твая Бацькаўшчына. Там тваё чыстае юнацкае каханне, якое з янычарскай жорсткасцю вядуць на ганьбу азвярэлыя фашысты. Што людзі! Нават камень пачарнеў і непазнавальна змяніўся ад чужынскай абразы: «Ляжыш ты, мой горад, як волат, распяты на пыльным крыжы беларускіх дарог». Уся прырода дыхае свяшчэнным гневам і прагне бязлітаснай расплаты. Нават сонца, што садзіцца за сінім лесам, падобна на шчыт ратаборца. Ты яму зайздросціш. Яно раней за цябе ўбачыць бацькоўскую зямлю. Знявечаная жалезам і трацілам, пачварнымі гусеніцамі і ненажэрнымі коламі, яна чакае тваёй адвагі. Яна верыць у цябе. Ты — равеснік Кастрычніка і прыняў жыццё паўнаўладным гаспадаром. Змрочнае мінулае прайшло перад тваім піянерскім зрокам толькі пачварным насланнём, калі «з пажарамі, забойствамі селькораў і сытай самагоннаю адрыжкай на санках ад'яжджала у нябыт». І вось цяпер яно хоча вярнуцца, у тысячу разоў страшнейшае і агіднейшае. Але ты — воін. Ты яшчэ зусім нядаўна прысягаў «не выпусціць стрэльбу з рукі, пакуль ёсць на зямлі палацы, пакуль ёсць на зямлі жабракі». І да апошняга пробліску свядомасці ты не забудзеш, што перад табою бесчалавечны вораг, з якім можа быць толькі адна гаворка — смерць:

У вока снайпера, нібы у дом прасторны,
Заходзяць дрэвы, хмары, вечар зорны,
І лёгкі цень птушынага крыла
З разгону дзеліць вока папалам.
. . . . . .
Ды чорны гад паўзе з кустоў у вока.
Умомант вейкі, быццам абцугі,
Заціснулі гадзюку.
Бліскавіца.
Сцюдзёныя блакітныя снягі
Засыпалі двухсотага арыйца...
І зноў адкрыта снайперскае вока
Для птушак, дрэў, сяброў і зор высокіх.

Але вайсковы лёс — капрызны. І перш, чым прыпасці да гаючых крыніц роднай зямлі, давядзецца зведаць спякоту іранскага неба. Некалі «гутарак наслухаўшыся розных... пра белы свет» ты малым «узлазіў на бярозу» і радаваўся, што «краявід—на цэлы сельсавет». Цяпер дзіцячае жаданне—убачыць незвычайнае — спраўдзілася. Ды за экзатычнай смугой выразна праступілі не персанажы «Тысяча і адной ночы», а сацыяльныя кантрасты. І ты прыйшоў не паэтычным пілігрымам, а вестуном новага свету з агнём «пякучатрывожнай» зоркі на пілотцы. І тут упершыню твар у твар сустрэнешся з нахабнымі прэтэндэнтамі на ўсясветнае панаванне, што сярод белага дня «з дзікім рогатам ірвуць з кабет чадру», хто лічыць свае жывёльныя інстынкты неабвержным законам. Гэта сапраўды «дзікі пір піратаў» і сэрца міжволі сціснецца ад болю:

Лятуць журавы за Казбек і Эльбрус,
І сэрца сціскае туга.
Сустрэне іх хутка мая Беларусь
На цёплых зялёных лугах.
Я зайздрасці к птушкам ніколі не меў—
Без крылляў мне нават ямчэй,
А зараз ад крыўды глухой анямеў
І з неба не зводжу вачэй.

І не дзіва, што, вяртаючыся дадому пасля столькіх год расстання, будзеш радавацца — і звонкаму «дзе» і густому «чаго» матчынай мовы. Цяпер усё, што мроілася ў трывожных салдацкіх снах, павінна стаць явай. Няхай яшчэ руіны гарадоў і папялішчы вёсак б'юць у сэрца попелам, а сіроты і ўдовы туляцца ў сырых зямлянках — прыйшло галоўнае, у імя чаго праліта столькі свяшчэннай крыві — прыйшла свабода. Можна закасаць рукавы і паказаць, што франтавы вопыт і тут прыдасца. І, як некалі баявым рапартам, суайчыннікі будуць радавацца працоўным паведамленням, што на радыятары беларускага МАЗа — зубр, а трактар «Беларусь» не толькі заворвае траншэі на збалелай зямлі, але і прайшоў пасланцом добрай волі па многіх кантынентах. Рэспубліка становіцца індустрыяльнай. Водгулле яе партызанскай славы і поспехаў у мірным будаўніцтве абышло ўсю планету. І не дзіва, што на міжнародных форумах да яе голасу прыслухоўваюцца пачціва і ўважліва. І каму, як не франтавіку, сказаць сваё важкае слова перад усім светам з высокай трыбуны Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. І перш, чым ён пераступіць парог небаскроба на беразе Іст-Рывер, часовы дыпламат вязе ў сваім сэрцы праграму, зразумелую ўсім людзям працы:

Хаджу і езджу па Амерыцы:
Наважылі мы з ёй памерыцца
Не злом, не атамнаю бомбаю
І не упартасцю дубоваю.
. . . . . .
Сабрацца б нам на канферэнцыю
На Міншчыне ці ў Арызоне,—
Не па пытаннях канкурэнцыі, —
Пра цень вайны на гарызонце.

А гэты цень сапраўды многа разоў засланяў небасхілы. Лілася кроў карэйскіх і в'етнамскіх дзяцей. Лілася і льецца кроў афрыканцаў. Прывід атамнай бомбы, што здзьмухнуў з твару зямлі Хірасіму і Нагасакі, па-ранейшаму стаіць перад вачмі. Таму хочацца «ўрывацца ў спальні, будзіць людзей ачмураных, крычаць ім: «Годзе спаць!», бо «ў параўнанні з новымі шалёнымі пачварамі мізэрным хуліганам здаецца Герастрат».

Ступіўшы ў вогненныя афрыканскія пяскі пад самымі тропікамі і прайшоўшыся перад шэдэўрамі мінулых цывілізацый у прымглёным халадку еўрапейскіх і заакіянскіх музеяў, захочаш паверыць, што чалавецтва не дапусціць самагубства, бо стала штодзённасцю і гэта

...касманаўты
Рыхтуюць новы цуд.
Б'е на Палессі нафта —
Ад радасці танцуй!

І па-новаму ўспрымеш «і аўтаматыкі шарады, і хітрай хіміі гушчар», бачачы «крышталічны хрыбет» нашых дасягненняў перад сабой. Будзеш радавацца, што прырода паслухмяна змяняе сваё аблічча, не забываючыся напомніць нам, каб «пакідалі і буслу, і чайцы больш вады і неба на душу». Клапоцячыся аб тым, «на якой вышыні наш сцяг», будзеш зноў і зноў прыпадаць да «думак акіянскай глыбіні» таго, хто сваім прадбачаннем і воляй надаў новы рух планеце. Вобраз Леніна, неабдымны ў глыбіннай сутнасці і адначасова даступны разуменню дзіцяці, стане той мерай, якой будзеш мераць гісторыю і самога сябе. І якім нікчэмным баластам на нашым гордым шляху здадуцца людзі ўчарашняга дня — хабарнікі і прайдзісветы, кар'ерысты і халтуршчыкі, дэмагогі і перастрахоўшчыкі — «канцылярскае дуб'ё», з якімі было б недаравальным кашчунствам дзяліцца трудной славай.

Памяць неўміручая — «аб чацвёртым, чацвёртым мы не можам забыць». Гэта ўсведамленне спадарожнічае нашым штодзённым справам, але асабліва вострае адчуванне незабыўных страт у высокія святочныя дні, калі грымяць салюты «і жаласна звіняць у вокнах шыбы, і нечыя матулі сумна горбяцца». Без усякай містычнасці можам уявіць на сцішаным небе—пры трапяткім святле рознакаляровых ракет—сілуэты баявых пабрацімаў і нявінных дзяцей, што сталі ахвярамі жудаснага зверства ў чорных крэматорыях і за іржавым дротам канцлагераў. І тады прыходзіць «горкая гордасць», што ты можаш падняць веліч спраў і незлічонасць ахвяр народных у матчыным слове — у слове, што захавала ў сабе крынічную сцюдзёнасць расы і гаману зімовых завірух, ядраную чырвань рабінавых гронак і хмельны водар яблыневага цвету. І хоць захочацца «што не сустрэў яшчэ, сустрэць» і «зрабіцца паўправадніком» паміж пакаленнямі, не зможаш глядзець абыякава ў халодную бездань Сусвету, прастрочанага трасамі касмічных апаратаў, бо зноў «росы белыя ўскіпаюць ад гарачых ног» даверлівых красунь і паверыш:

Мы ўбачым жанчын у няземнай красе іх,
Яны — наша шчасце і гора —
Планеты заселяць, любоўю засеюць
Далёкія сінія зоры.
І недзе у космасе будуць прываблівa
Цвісці, як і ў нас, іх дзявочыя яблыні.

Гэта — апафеоз жыццесцвярджэння, гімн чалавечаму разуму і аптымізму, без якіх немагчыма было б існаваць у наш век, поўны драматычных супярэчнасцей і трагічных урокаў. І калі ты сапраўдны паэт, то не трэба пісаць спецыяльную аўтабіяграфію — яна з дастатковай паўнатой адлюструецца ў тваіх творах, што ляглі праўдзівымі летапіснымі радкамі ў сэрцы не аднаго пакалення. Ім не трэба асаблівы код — яны і так зразумелыя кожнаму. Увесь свет зіхаціць у іх вясёлкавых гранях. А падумаецца пра новую песню—яе шукаць далёка не трэба. Жураўліныя трубы шчодра захаваны ў гаманлівых пушчах і задуменных палетках.

Іх даўно і заўсёды своечасова ўмее знаходзіць Пімен Панчанка.

Сцяпан ГАЎРУСЕЎ.

БАЦЬКА ПРЫЕХАЎ...

Аркадзь МАРЦІНОВІЧ

Звычайная сённяшняя сям'я: маці, бацька, двое малых яшчэ сыноў. І вось у сям'ю прыходзіць разлад: бацька запіў, а пасля і адарваўся ад сям'і... Сыны любяць бацьку і па-свойму змагаюцца за яго. Змагаецца і маці, і грамадскасць... Пра гэта мая новая аповесць, адзін раздзел з якой прапануецца чытачу.

Аўтар.

ВАЦІКУ ўсё ж хутка ўдалося знайсці работу. Ды і на месца пашанцавала: ад Нявінска хвілін трыццаць па чыгунцы і столькі ж пехатою ад чыгуначнага раз'езда, дзе спыняюцца прыгарадныя цягнікі, да вёскі Слынь. Там, у Слыні, васьмігадовая школа, і акурат цяпер памёр завуч школы, дык Ваціка прызначылі на гэтую пасаду.

Атрымаўшы прызначэнне і з'ездзіўшы ў Слынь, Вацік вярнуўся дадому, каб узяць рэчы. У яго размовах і паводзінах, ва ўсім яго выглядзе адчувалася задаволенасць і ганарлівасць, што вось жа паставілі яго завучам—не простым настаўнікам, а завучам.

Дзіна Сяргееўна таксама была задаволена і старалася заглушыць у сабе сум ды трывогу з-за таго, што Вацік паедзе ў нейкую Слынь і будзе жыць адзін. «Гэта ж не надоўга,—суцяшала яна сябе,—сама больш на год. Ці ў Слыні, ці ў Нявінску знойдзецца мне работа, і будзем зноў усе разам...».

А сыны паныла пазіралі на бацькавы зборы і не адступаліся ад яго ні на хвіліну. Ён паабяцаў, што будзе прыязджаць кожны выхадны.

Паехаў Вацік у нядзелю, і, значыць, ён цэлы тыдзень не меўся быць дома. Здоўжыўся гэты тыдзень дзецям, ды і Дзіне Сяргееўне. Хлопцы сумавалі, а яна ніяк не магла звыкнуцца з думкай, што гэта ж муж на новай рабоце. І яшчэ ёй дакучала адказваць на роспыты таварышаў і знаёмых—дзе Вацік і ці скора збіраецца яна сама перабірацца да яго: хто-кольвек, распытваючы, пазіраў на Дзіну Сяргееўну так, нібы падазраваў, што Вацік проста кінуў сям'ю: а Стася Зімароева, падмігнуўшы, сказала: «Глядзі, каб там яго не абкруціла якая зануда...» Адна толькі Каця Гаецкая па-сяброўску супакойвала: «Усё будзе добра. Восень, зіма, вясна праляцяць хутка, а тады і табе месца знойдзецца. Не там, дык у Нявінску. Адно што мне шкада будзе расставацца з табою...»

Нарэшце прыйшла субота. Гена і Міша, папрыходзіўшы з заняткаў, самі, не чакаючы загаду маткі, парабілі ўрокі, каб пахваліцца бацьку, што яны добрыя вучні.

Толькі хлопцы ўсталі з-за сталоў, як заявіўся бацька.

— Папчык!—закрычаў Міша: ён сядзеў, як заўсёды, у першым пакоі і першы паляцеў насустрач бацьку. Пачуўшы Мішаў вокліч, кінуўся і Гена з другога пакоя, так ляснуўшы з разгону дзвярыма, ажно з-за вушакоў пасыпалася атынкоўка.

Дзіна Сяргееўна, усміхаючыся на ўвесь твар, пазірала, як хлопцы абляпілі бацьку.

— Мы думалі, што ты пазней прыедзеш, — усцешана сказала яна.

— Удалося раней вырвацца,—адказаў Вацік,—дырэктар адпусціў.

Усе чацвёра былі ўзбуджаны, асабліва сыны, і доўга ў хаце стаяў вясёлы гармідар. Наперабой адзін аднаму дзеці то пыталіся нешта, то хваліліся нечым.

Нарэшце Дзіна Сяргееўна ўспомніла, што Вацікa трэба ж пакарміць. Для гэтага дня яна нават купіла надоечы бутэльку гарэлкі. Ці раз даводзілася ёй папракаць мужа, што ён «напіваецца» недзе. «Калі ўжо так хочацца,—гаварыла, бывала, яна, — дык выпі дома». І вось цяпер не забылася пра гэта. Але, накрыўшы стол і паклаўшы Вацікy есці, Дзіна Сяргееўна не паставіла гарэлку. «Можа сам папросіць,—вырашыла яна,—тады дастану,а не—абыдзецца так...».

Вацік сеў за стол абедаць. Пра гарэлку не абазваўся. І Дзіна Сяргееўна парадавалася ў душы. Вацік расказваў пра Слынь, пра сваю новую школу, пра тамтэйшы настаўніцкі калектыў. Слухаючы яго, Дзіна Сяргееўна згадвала свае трывогі гэтага тыдня, і ўжо яны здаваліся беспадстаўнымі, і зараз ужо думалася пра тое, што от Вацік будзе прыязджаць кожны раз на выхадны, год праляціць хутка і небалюча, і ўсё будзе добра.

Назаўтра вечарам яны ўсёй сям'ёю весела правялі гаспадара на вакзал.

А ў наступную суботу зноў чакалі яго. Вацік прыехаў, і святочны гармідар зноў панаваў у хаце.

Так было яшчэ раз.

А потым адну суботу Вацік прапусціў. Сыны і Дзіна Сяргееўна рабілі розныя здагадкі. Не прыехаў ён і ў наступную суботу. Сыны сумавалі, успаміналі бацьку. Гена наважыўся пісаць яму пісьмо, каб хутчэй прыязджаў. Дзіна Сяргееўна занепакоілася. А тут яшчэ дайшла да яе вестка, што нехта бачыў Вацікa ў Мінску з нейкай маладой жанчынай. Туды і назад ехаў міма свайго дома... Лёгка ж было яму злезці з цягніка хоць бы па дарозе назад і заглянуць дадому. Не заглянуў... Значыць, гэта не выпадкова... Дзіна Сяргееўна пазваніла Рэні, братавай, тая сказала, што ў апошні час Вацік рэдка якую ноч бывае дома—начуе там, у Слыні.

Трывога пасялілася ў сэрцы Дзіны Сяргееўны. І з цягам часу хваляванне ўзрастала. Яна то верыла ў тое, што муж знайшоў там сабе другую, то шукала розныя прычыны. Няўжо ён можа пакінуць дзяцей? Упершыню Дзіна Сяргееўна стала раздумваць па-іншаму пра Вацікa і пра свае адносіны з ім. «Хіба ж ён кахае мяне?—засумнявалася яна.—Можа, і ніколі не кахаў...» Ёй згадалася даўняе—маладосць, сустрэчы з Вацікам, жаніцьба, першыя гады сумеснага жыцця. Усё было цудоўна... У крайнім выпадку так здавалася ёй...

Яна не ведала, што рабіць. Яна не ведала, што гаварыла б Вацікy, калі б ён зараз прыехаў. Яна хацела і не магла ўявіць тую, другую, каханку Вацікa, толькі злосць на яе ўскіпала гарачая, як полымя. Але хіба тая, другая, вінаватая, што яе ўпадабаў Вацік? Можа, у іх сапраўднае каханне? Дык ці справядліва ганьбіць пачуццё, калі яно шчырае?.. Дзіна Сяргееўна разумела гэта, і ўсё ж не магла заглушыць у сабе нянавісці да незнаёмай жанчыны, якая (пэўна ж, міжволі) прынесла ёй гора.

Думкі гэтыя з кожным днём усё больш развярэджвалі Дзіну Сяргееўну, перашкаджалі ёй працаваць, па начах не давалі доўга заснуць.

Яна вырашыла яшчэ раз пазваніць Рэні. Тая сказала, што днямі выпадкова сустрэла на вуліцы ў Нявінску Вацікa з адной жанчынкай, ён вымушаны быў пазнаёміць Рэню з ёю, буркнуў: «Гэта наша настаўніца...», тая назвалася Таісай. «Напэўна, гэта была не абы хто,—тлумачыла Рэня Дзіне Сяргееўне,—бо ён разгубіўся, як убачыў мяне...».

«Ну, вось ужо і імя ведаю...»—з горкай іроніяй падумала Дзіна Сяргееўна; яна чамусьці адразу паверыла, што гэта менавіта была Вацікава каханка...

Пра свае перажыванні Дзіна Сяргееўна нічога не гаварыла сынам, але яны бачылі яе кепскі настрой, адчувалі сваім дзіцячым сэрцам, што маці пакутуе, і стараліся быць паслухмянымі, паслужлівымі.

Часам яна не стрымлівалася і моўчкі плакала. Аднойчы гэта было пры Мішы. Убачыўшы слёзы на матчыных вачах, Міша разгубіўся, але праз момант кінуўся на двор і хуценька прывёў Гену. Гена таксама выціраў слёзы, просячы: «Не плач, мамка, супакойся...» А Міша стаяў побач, сціснуўшы зубы, зажмурыўшы вочы, і штосьці шаптаў сабе пад нос...

Настала яшчэ адна субота.

Дзіна Сяргееўна мала верыла, што Вацік прыедзе, але ў глыбіні душы хацела гэтага. А Гена з раніцы, толькі ўстаўшы, сцвярджаў: «Вось пабачыце, што сёння папчык прыкоціць!»

Як заўсёды ў суботу, Дзіна Сяргееўна прыйшла дадому пазней за Мішу. Гена не збіраўся ў школу: ён трошкі тэмпературыў, і маці сказала яму не ісці. Сыны сустрэлі яе з таямнічымі ўхмылкамі на тварах, Дзіна Сяргееўна заўважыла гэта і падумала, ці не дома ўжо Вацік. Ажно не. Проста сыны падрыхтавалі ёй сюрпрыз. Калі яна распранулася, яны павялі яе на кухню. Стол быў засланы чыстым абрусам, на ім стаялі талеркі, ляжалі лыжкі, нажы,—усё было гатова для абеду. На асобнай талерцы была зроблена закуска: акуратна нарэзаныя і роўненька раскладзеныя памідоры. Дзіна Сяргееўна як глянула на стол, асабліва на гэтую закуску, прыдуманую дзіцячым розумам і прыгатаваную дзіцячымі рукамі, дык у яе аж сэрца зайшлося. Яна падумала, што ніколі-ніколі не забудзе гэтых скрылькоў памідораў...

— Сядай, калі ласка, мамка, — запрашаў Гена, а Міша тым часам узяў чарпак і стаў наліваць суп у талеркі...

Праз колькі хвілін усе трое сядзелі за сталом.

— Частуйся, мамка, — гаварыў Гена, падсоўваючы да яе талерку з закускай.

Дзіна Сяргееўна з'ела кружочак, пахваліла:

— Малайцы, добра прыгатавалі.

Яна ўзяла яшчэ адзін скрылёк і сказала:

— Ежце і самі.

— Спачатку ты, мама,—аднекваўся за абодвух Гена.

— Дык я ж ужо з'ела,—адмаўлялася яна.

Тут загаварыў Міша:

— Гэта ты за сябе з'ела. А цяпер з'еж адзін скрылёк за мяне, тады за Гену, тады за тату...

Так некалі Дзіна Сяргееўна карміла дзяцей...

«Памяняліся мы ролямі»,— уздыхнула яна і сказала:

— Ну, добра, толькі за бацьку есці не буду.— І заплакала.

Гена падхапіўся выціраць ёй слёзы, а Міша, намагаючыся сам не заплакаць, плюскаў вачыма.

— Не будзе ў нас папчыка,—сказала Дзіна Сяргееўна,—ён сабе некага знайшоў...—І яна, не вытрымаўшы, расказала ім усё, што сама ведала.

Мішка ўсклікнуў:

— Лухта гэта! Наш папчык харошы, ён нас не кіне.

Гена прыняў ваяўнічую паставу і крыкнуў, паказваючы кулачком пад бараду:

— А я той цётцы банак настаўлю! А папчык будзе наш, ніхто яго ў нас не адбярэ! Давай, Мішка, паедзем туды! Ну, морда!... Мама, можна так сказаць на яе, яна ж нядобрая, праўда?..

— Спачатку пісьмо напішы,—сказаў Міша.

— Сам напішы!—адказаў Гена.

— Дык ты ж пачаў ужо,—нагадаў Міша. — А ў мяне почырк дрэнны.

(Заканчэнне на 14-й стар.).

НА ШТО ЗДОЛЬНЫ ЛАЗЕР

ГЭТА — адна з пяцідзесяці дзвюх лекцый вялікай тэлевізійнай праграмы «Народныя чытанні». Яе тэма «Лазеры і навукова-тэхнічны прагрэс». Лектар—Герой Сацыялістычнай Працы, акадэмік, дырэктар Інстытута фізікі АН БССР Барыс Іванавіч Сцяпанаў.

Чэрвеньскім вечарам на блакітных экранах былі разам з ім і слухачы, што сабраліся ў палацы культуры прафсаюзаў. Перадача трансліруецца на ўсю рэспубліку.

Першыя «Народныя чытанні» выйшлі ў эфір чатыры гады назад. Асноўная іх мэта — знаёміць тэлегледачоў усіх прафесій з важнейшымі падзеямі ў грамадска-палітычным, эканамічным і культурным жыцці, а таксама з навінкамі навукі і тэхнікі. Тэматыка і формы перадач — разнастайныя. Перад мікрафонам выступаюць партыйныя і савецкія работнікі, вучоныя, кіраўнікі рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў, наватары вытворчасці. Як правіла, выкарыстоўваюцца дакументальныя нарысы і рэпартажы.

У адной з тэлевізійных перадач «Народныя чытанні» пасля прагляду дакументальнага фільма «Дні Івана Нікалаева» дыктар Зінаіда Бандарэнка паведаміла, што ў зале прысутнічае герой кінанарыса — І. Д. Нікалаеў. Потым перад тэлегледачамі выступіў Іван Дзмітрыевіч. Ён расказаў аб рабоце будаўніка, аб тым, як людзі гэтай прафесіі на будоўлях Мінска змагаюцца за паспяховае выкананне заданняў трэцяга, рашаючага года пяцігодкі.

На здымку—перад мікрафонам — І. Д. Нікалаеў. Побач — дыктар Беларускага тэлебачання З. Бандарэнка.

Вось некаторыя звесткі, якімі была багата лекцыя Б. Сцяпанава:

— Лазеры выкарыстоўваюцца як самы дакладны інструмент даследавання ў вырашэнні многіх тэхналагічных задач у сувязі, тэлебачанні, метралогіі, геадэзіі, лакацыі, медыцыне...

...Энергія промня лазера можа быць перададзена на вялікія касмічныя адлегласці, з яго дапамогай практыкуюцца тэлефонныя і тэлевізійныя размовы.

...Лазерны прамень дзейнічае ў якасці разца. Ім можна раскройваць скуру,бляху і нават металічныя пліты. На Ленінградскай швейнай фабрыцы для раскройкі тканін замест нажніц пачалі ўжываць лазерны прамень...

Тэарэтычныя палажэнні лекцыі «падмацоўваюцца» фрагментамі з навукова-папулярных кінастужак. Адна з іх прысвечана самому лектару — Б. Сцяпанаву. На тэлевізійных экранах і кінаэкране палаца культуры прысутныя знаёмяцца з цікавымі лабараторнымі і практычнымі вопытамі, паглыбляюць свае пазнанні ў дзівосных з'явах навукі.

Шкада, праўда, што аўтары перадачы не прапанавалі гледачам навейшых фільмаў на гэту тэму. А яны ў кінапракатных арганізацыях ёсць.

Трэба аддаць належнае акадэміку Б. Сцяпанаву: ён выступаў вельмі цікава, жыва і змястоўна. Толькі хацелася б паслухаць і пытанні ўдзельнікаў гэтага тэлевізійнага лекторыя і адказы на іх. Бо нельга паверыць, што ўсе без выключэння поўнасцю зразумелі і засвоілі матэрыял. Дыялог паміж Б. Сцяпанавым і прысутнымі значна ажывіў бы тэлеперадачу.

...І вось «Народныя чытанні» закончаны. Тут жа ў зале палаца культуры слухачы лекторыя выказалі свае ўражанні.

Тамара Арціменя — студэнтка Мінскага радыётэхнікума:

— Лекцыя Барыса Іванавіча Сцяпанава зацікавіла мяне. Я пачула вельмі многа карыснага, узбагаціла свае веды. Ці трэба казаць, што для мяне, як будучага спецыяліста па радыётэхніцы, лекцыя патрэбная і павучальная...

Падзяку трэба адрасаваць і іншым аўтарам «Народных чытанняў» — рэжысёру К. Стэцкаму, рэдактару М. Ільінскаму. Асабліва хацелася б сказаць пра Мікалая Ільінскага. Гэта вялікі энтузіяст, добры арганізатар, чалавек, які ўсе свае прафесійныя веды і рэдактарскі вопыт аддае прапагандзе нашых дасягненняў сродкамі тэлебачання. За чатыры гады праведзена 52 перадачы. Гэту лічбу трэба памножыць на 650 — столькі чалавек умяшчае палац культуры прафсаюзаў. І яшчэ тры мільёны тых, хто збіраецца каля «блакітных экранаў» у розных гарадах і вёсках рэспублікі.

Алесь МАЦКЕВІЧ.

ДЗЯКУЙ, «БЛАКІТНЫ ДАРАДЧЫК»!

Уважліва глядзела перадачы Рэспубліканскай студыі тэлебачання «Адзін з трыццаці шасці». Як работнік жывёлагадоўлі, пачэрпнула шмат карыснага і павучальнага. З вялікай цікавасцю слухала старшыню калгаса імя Гастэлы Героя Сацыялістычнай Працы Шыманскага. Мы жывём і працуем у адным раёне, і ў нас аднолькавыя ўмовы, а поспехі ў гастэлаўцаў больш значныя. Яны вельмі арганізавана і ў самыя сціслыя агратэхнічныя тэрміны правялі вясенне-палявыя работы. У іх высокія паказчыкі ў жывёлагадоўлі. Плёну іх працы можна парадавацца і на іх вопыце павучыцца.

У заключнай тэлевізійнай перадачы было паказана спаборніцтва пад дэвізам «Хто хутчэй, хто лепш» — конкурс машыннага даення. Гэта ўжо мае непасрэднае дачыненне да мяне. Цікава было бачыць спрытнасць і майстэрства сяброўак па прафесіі.

Спадабаліся мне і канцэрты. Як хораша гучала «Верцялішкаўская калгасная», якую ўпершыню выканалі самадзейныя артысты калгаса «Прагрэс»!

Мы, работнікі жывёлагадоўлі, рэгулярна збіраемся ў чырвоным кутку, глядзім і абмяркоўваем тэлеперадачы — тыя, вядома, што маюць дачыненне да нашай працы, нашай прафесіі. Тут жа гаворым і пра свае дасягненні, а яшчэ больш пра недахопы і пра тое, як іх ліквідаваць, як дамагчыся лепшых поспехаў. Шкада толькі, што, бывае, у эфір выдаюцца матэрыялы вельмі агульныя, насычаныя ноствам сухіх лічбаў і цытат. Часцей варта здымаць нарысы — пра даярку, свінарку або цялятніцу, каб мы бачылі на «блакітным экране» жывога чалавека ў працы, у вучобе, у адпачынку.

Г. ЦІШКОВА,
даярка калгаса «Новы быт» Мінскага раёна.

●

Амаль на працягу пяці месяцаў раз у два тыдні ў Мінск прыязджалі кіраўнікі, спецыялісты, паляводы, жывёлаводы, будаўнікі, механізатары, меліяратары з усіх абласцей нашай рэспублікі. Гэта былі прадстаўнікі трыццаці шасці калгасаў і саўгасаў, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Ішоў своеасаблівы конкурс.

Вось прыклад. Аграномы ў запячатаных канвертах атрымалі пэўныя пытанні. Канверты адначасова былі раскрыты, і кожны ўдзельнік, прачытаўшы пытанне, тут жа даваў адказ. Адказы ўсіх прагучалі ўпэўнена; гаворка ішла пра агратэхніку апрацоўкі глебы, тэхналогію вырошчвання той ці іншай культуры і гэтак далей. Яны дзяліліся сваімі меркаваннямі, бо ў кожнага — быў вопыт, свае назіранні.

Тым, хто глядзеў на блакітным экране тэлеперадачы - конкурсы «Адзін з 36», трэба думаць, маркоціцца не давялося. Тым больш, што ў праграму ўключыліся і выступленні самадзейнасці ў палацы культуры калгаса імя Гастэлы.

Асабліва хочацца адзначыць хор саўгаса «Рагазнянскі», які падрыхтаваў песню «Горад прыйшоў у саўгас» брэсцкага кампазітара Альфрэда Шутава на словы дырэктара гэтага саўгаса Мікалая Прысмацкага.

Хоць агульнае ўражанне ад перадач «Адзін з 36» засталося добрае, мушу зрабіць і заўвагі.

Не заўсёды зладжана і дакладна працавалі тэлерэжысёры. Асабліва ў самым пачатку, калі гледачоў знаёмілі з прысутнымі. Тут нават атрымалася так, што прадстаўлялі аднаго чалавека, а ў кадры мы бачылі зусім іншага.

У конкурсе будаўнікоў не зусім падрыхтаваным выглядаў вядучы. Крыху здзівіла афармленне перадачы — студыйныя мастакі чамусьці абмежаваліся малюнкамі заставак ды надпісамі назваў калгасаў. Удзельнікі перадач перадавалі з рук у рукі фотакарткі перадавікоў вытворчасці, а лепш было тыя ж фотакарткі паказваць з пюпітраў.

Нягледзячы на адзначаныя недахопы, тэлеперадачы-конкурсы «Адзін з 36» — цікавыя і карысныя і для ўдзельнікаў, і для гледачоў.

І. ТАРАСЮК,
рабочы цагельнага завода.

●

З цікавасцю глядзім перадачы Рэспубліканскага тэлебачання аб рабочым класе. Рэпартажы пра Мінскі трактарны завод, камвольны камбінат, птушкафабрыку імя Н. Крупскай, Аршанскі ільнокамбінат і іншыя прадпрыемствы Беларусі знаёмяць з перадавікамі вытворчасці, ударнікамі камуністычнай працы. Такое ўражанне, нібы сам прысутнічаеш на сходах рабочых калектываў, разам з імі абмяркоўваеш іх планы, трапляеш у цэх.

Нельга сказаць, праўда, што ўсе такія перадачы ад пачатку і да канца пабудаваны бездакорна. Мне здаецца, што ў іх бывае і задужа станкоў, механізмаў, грукату. Часам індустрыя нібы «паглынае» чалавека, а яго месца — на першым плане.

Хацелася б зрабіць і такую заўвагу: складальнікі праграм не заўсёды ўлічваюць наш рабочы распарадак. Напрыклад, навіны перадаюцца ў васемнаццаць гадзін, калі ўсе мы яшчэ на рабоце або знаходзімся ў дарозе дадому. «Панарама навін» выпускаецца а палове дванаццатай ночы, а гэта зусім позна для тых, хто заўтра з раніцы працуе.

В. СТРАЧЫНСКАЯ,
змеены майстар Багданаўскай хлебапякарні.
Валожынскі раён.

У КАДРЫ — ГЕРОІ ПЯЦІГОДКІ

...Прахадная завода. Злева на сцяне падсвечаныя стрэлкі паказваюць ход спаборніцтва паміж цэхамі. Людзі абменьваюцца думкамі. Толькі што закончаны працоўны месяц, падведзены вынікі, і гледачам зразумела радасная ўсхваляванасць тых, хто нясе працоўную вахту.

Гэтымі кадрамі пачыналася тэлевізійная перадача Віцебскай студыі «Асабістыя планы і калектыў», прысвечаная сацыялістычнаму спаборніцтву на заводзе электравымяральных прыбораў. Аўтары перадачы звярнуліся да вопыту гэтага прадпрыемства з тым, каб расказаць пра яго гледачам. Калектыў завода паспяхова спраўляецца з вытворчым заданнем, павялічвае тэмпы росту прадукцыйнасці працы. Журналіст Э. Кандэрскі і рэжысёр Д. Селіванаў разам з групай аператараў творча даследавалі дынамічную сілу спаборніцтва.

Многія нашы тэлегледачы, мабыць, памятаюць і перадачу «Старонкі рабочай біяграфіі», якая прайшла па Цэнтральнаму тэлебачанню і была прысвечана Віцебскаму станкабудаўнічаму заводу імя Камінтэрна. Гэтае прадпрыемства некалькі гадоў запар трымае пераходны Чырвоны сцяг Савета Міністраў СССР і ВЦСПС, прадукцыя яго ідзе ў многія зарубежныя краіны. Значная частка станкоў адпавядае ўзроўню лепшых сусветных стандартаў. Аўтары перадачы І. Коган і В. Зяльвінскі выкарысталі разнастайныя сродкі для шырокага паказу сацыялістычнага спаборніцтва. Асабліва запомнілася інтэрв'ю з начальнікам пятага механічнага цэха Кацярынай Лукнер. Цёпла, сардэчна расказала яна аб ветэранах прадпрыемства, аб моладзі.

У нашых праграмах даўно стала пастаяннай рубрыка «Па пяцігодцы звяраючы крок». Сёлета ў лютым студыя расказала аб каштоўным пачынанні калектыву ўстаноўкі атмасфернай трубчаткі — Полацкага нафтаперапрацоўчага завода. Экіпаж экскаватара камуніста Дзмітрыя Казлова з упраўлення механізацыі № 141 гэтага ж трэста выступіў з заклікам «Пяцігодку ў тры з паловай гады».

Ёсць яшчэ цыкл перадач пад назвай «Камуніст і пяцігодка». Формы тут розныя. Гэта і кінанарыс пра закройшчыцу фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» Героя Сацыялістычнай Працы Ганну Голубеву, і рэпартажы пра шліфоўшчыка завода заточных станкоў Уладзіміра Галубцова і швею фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», якая працуе з лютага 1973 года ў лік 10-й пяцігодкі, Марыю Анібраеву...

Своеасаблівай эстафетай гэтага цыкла сталі перадачы маладзёжнай рэдакцыі пад рубрыкай «Твая і мая пяцігодка» — аб справах камсамольцаў, моладзі ў выкананні ўзятых абавязацельстваў. Адзін з выпускаў быў цалкам прысвечаны моладзі Аршанскага ільнокамбіната.

А вось выпуск, прысвечаны тым, хто ўжо сёння працуе ў лік 1974 года. У студыі Валянцін Зайцаў — токар завода тэхналагічнага абсталявання, Ада Сярпова — закройшчыца фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік», Таццяна Батава — работніца камбіната будматэрыялаў і іншыя. Маладыя рабочыя расказваюць аб любві да сваёй прафесіі, аб вялікай адказнасці перад калектывам за сваю работу, аб месцы моладзі ў выкананні заданняў пяцігодкі. Пабудаваныя ў форме жывой гутаркі з выкарыстаннем фатаграфій, кінаплёнкі і іншых сродкаў, гэтыя перадачы заўсёды цёпла ўспрымаюцца маладым гледачом, выхоўваюць любоў да рабочай прафесіі.

Цікавыя формы шукаюць віцебскія тэлежурналісты ў перадачах пра разведчыкаў вытворчасці — рацыяналізатараў. У гэтай сувязі ўспамінаецца перадача «У рацыяналізатарскі фонд пяцігодкі» — аб рацыяналізатарах і вынаходніках сістэмы «Сельгастэхніка». Толькі ў мінулым годзе яны ўкаранілі больш як 350 прапаноў з эканамічным эфектам у 250 тысяч рублёў. У якасці станоўчага прыкладу была паказана работа рацыяналізатараў Лёзненскага аб'яднання «Сельгастэхніка». Для рацыяналізатараў там створаны спецыяльны кабінет, абсталяваны камплектам інструментаў і даведачнай літаратурай.

СУБЯСЕДНІК У НАШЫМ ДОМЕ

«ВОСЬ МАСТАК — ён мае палатно, фарбы; скульптар — гліну, мармур; пісьменнік — паперу... А што ў артыста? Нічога... Толькі ён сам...» — так гаварыў вядомы савецкі артыст Мікалай Сіманаў у фільме Ленінградскага тэлебачання, прысвечаным яго творчасці. Шчырыя і сумнаватыя словы. Сапраўды, калі кінастужка не захавае для нас і нашчадкаў аблічча акцёра тэатра, з цягам часу аб ім можна будзе меркаваць толькі па газетных рэцэнзіях і фотаздымках. І той, хто мае намер даць тэлепартрэт, напрыклад, славутых акцёраў Беларусі, вымушаны гаварыць горкія словы ў адрас кінаархіваў. Крылевіч, Уладамірскі, Грыгоніс, Міронава... Амаль нічога не захавалася пра іх. Таму даводзіцца спяшацца і рабіць тое, што магчыма, каб на прыкладзе выдатных дзеячоў сцэны раскрываць багацце тэатральнага мастацтва. І на «блакітным экране» рэспублікі такія партрэты з'яўляюцца. Ёмістыя, сціслыя, кароткія па метражы, але яны ёсць.

«Дзесяць хвілін з акцёрам»—быў такі дакументальны фільм. Але наколькі больш шчодра можна расказаць пра акцёра за гадзіну!.. І калі гэтая гадзіна застаецца на стужцы, калі захоўваюцца не толькі работы, але і в о б р а з выдатнага мастака,—каштоўнасць такой перадачы—надзвычайная.

Самае апошняе ўражанне —ад сустрэчы 31 мая з Аляксандрай Клімавай... Здаецца, мы занадта скупыя на высокія словы, гаворачы пра гэтую актрысу, якая ўмее ўзняць з самага дна нашай душы запаветныя пачуцці. Яе гераіні—як іх ні заганяй у ансамбль спектакля! — палаюць і свецяць.

У той вечар мы сустрэліся з ёю адзін на адзін. З экрана тэлевізара артыстка дапытліва глядзела і, хвалюючыся, стала гаварыць пра тое, што займае яе штохвілінна,—пра тэатр. Многія з нас упершыню сустрэліся з ёю вось так, без пасрэднікаў, прыцамсі — без відавочных пасрэднікаў. Недзе там былі і рэжысёр, і аператар, і яшчэ дзесяткі людзей, што падаравалі нам гэтую перадачу. Безумоўна, каштоўным быў іх уклад, каб наблізіць да нас актрысу.

Калі яна прызналася, што духоўна вырастае разам з любімай роллю, што разам з ёй «праходзіць» цэлую «акадэмію характару», — гэтыя словы былі забяспечаны ўсім залатым запасам яе таленту. Калі яна прыгадвае, што да самазабыцця працавала над роллю Камісара, — ведала, якія вершы тая любіла, пра што яна думала, калі маўчала, пра што сумавала,—так яно і было. Гледачы а д ч у в а л і напоўненасць яе прызнання перажытым. З глыбокай пяшчотай гаварыла яна пра Алену Пратасаву, і далёка не самая галоўная ў «Дзецях сонца» гэтая роля заззяла раптам святлом зоркі... Яе Клеапатра, Геля, Ніла Сніжко, Гітэль, Камісар, яе Алена, Ларыса, Марыя Стюарт—з фатаграфій неяк паграбавальна глядзяць яны на актрысу. І яна, усхваляваная іх — усіх разам—прысутнасцю, яшчэ і яшчэ раз перабірае ў памяці сустрэчы з імі. І, здаецца, пытае сябе: ці мела яна права абуджаць іх да жыцця?..

Той «нерв» А. Клімавай, які ў тэатры захоплівае ўсю залу, у гэты вечар яна прынесла на тэлеэкран. І мы, сведкі творчых шуканняў, сумненняў, здагадак і адкрыццяў актрысы, станавіліся яе аднадумцамі. Пра кожную, нават самую шчаслівую ролю, Клімава кажа: «Тут не ўсё мне ўдалося...» або: «Для дасканалага ўвасаблення вобраза мне не хапала...» І ідзе доўгі пералік уласных пралікаў, большасць з якіх траніць на вока не кожнаму крытыку... Не шкадуючы сябе, скажа яна пра тое, што «перамудрыла» ў Ларысе. А тым, хто бачыў яе на сцэне ў той жа «Беспасажніцы», захочацца аспрэчыць гэта, бо гераіня была інтэлектуальна багатай і душэўна ранімай. Яна ўзрушвала.

Заўсёдны творчы неспакой Аляксандры Клімавай, яе ўзнёсласць, штодзённы пошук лепшага, сумленнае незадавальненне дасягнутым — усё гэта аддалося ў сэрцы кожнага, хто заставаўся з ёю, калі яна была госцем тысяч тэлегледачоў.

Леанід Рыгоравіч Рахленка перад камерай (перадача 31 сакавіка) спакойны, стрыманы, нетаропкі. Ён разважае, аналізуе. Як і на сцэне, дзе ён не «прадстаўляе» вобраз, не ілюструе яго перажыванняў, а раскрывае свайго героя крок за крокам, слова за словам. Вядома, што Л. Рахленку на сцэне ўласцівая зайздросная прастата — без «штампа прастаты». Гэта тыя паводзіны «ў вобразе», калі спалучаюцца акцёрскі тэмперамент і жорсткае самаабмежаванне, калі багатая фантазія кантралюецца акцёрам, калі акцёр знаходзіць форму—і, абжыўшы яе, нібы забываецца на яе зусім. Здаецца, такому артысту даступна ўсё: і поўнае зліццё з вобразам, і здольнасць—яшчэ як! — выявіць адносіны да свайго героя. Ён аднолькава глыбокі, калі яго герой — гэта выпаленая пустыня душы, і калі персанаж—асоба значная, характар пэўны, мысліцель і змагар.

У тэлеманалогу акцёра мы бачым вочы Старца з «Раскіданага гнязда» — відушчыя вочы лёгкага і светлага чалавека; нахабныя цьмяныя пляшкі вачэй Гарлахвацкага — ролі, сыгранай 419 разоў! І хто з нас, што глядзелі камедыю К. Крапівы ў купалаўцаў, скажа, нібы акцёр іграе толькі на тэхніцы! Дапытлівыя і дзіўна супакоеныя вочы Бубнава — «філосафа дна»... Бездапаможныя і спачувальныя — дырэктара Добрых у «Амністыі»... Пранізлівыя, свідруючыя вочы зацкаванага звера Гваздзіліна («Трэцяя патэтычная» М. Пагодзіна). Круціцкі... Злая сатыра. Здаецца, яшчэ трошкі —і карыкатура. Але «трошкі» — не пяройдзена, акцёр востра і дасціпна «жывапісуе» абломак учарашняга дня, які ўпэўнены ў дні заўтрашнім. Смешны, гідкі і варты жалю гэты Круціцкі, які быццам сышоў са старонак А. Астроўскага...

У якім яшчэ спектаклі, на якім творчым вечары мы здолелі б убачыць столькі роляў цудоўных акцёраў!

Дзве перадачы пра вядучых майстроў Акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы і Рускага тэатра БССР імя М. Горкага звярнулі на сябе ўвагу яшчэ і таму, што былі пабудаваны не трафарэтна. Напрыклад, Л. Рахленка і сапраўды, як гэта было пазначана назвай — «Маналог», уголас успамінаў, спыняўся на асобных фактах сваёй творчай біяграфіі, гаварыў пра калег, «прыадчыняў дзверы» акцёрскай лабараторыі. Слухалася гэта з поўным даверам, бо нават інтанацыі артыста былі надзвычай натуральныя, не прадугледжаныя і не замацаваныя на рэпетыцыях. Вельмі непасрэднай, пазбаўленай якіх-небудзь падкрэслена акцёрскіх манер, выглядала А. Клімава, якая дзялілася роздумам аб тым, што такое п р а ц а выканаўцы роляў.

Галоўнае ж — на экране былі сцэнічныя вобразы.

Добра будзе, калі Беларускае тэлебачанне на вопыце такіх праграм створыць нешта накшталт летапісу жыцця і дзейнасці майстроў сцэны рэспублікі. Літаратурна-драматычная рэдакцыя Беларускага тэлебачання імкнецца зрабіць гэта — толькі за апошні год адзняты на стужку ў ролях Яўгеній Палосін, Вольга Галіна, Барыс Уладамірскі, Галіна Макарава, Здзіслаў Стома... Так што ёсць усе падставы верыць, што сустрэчы накшталт тых, пра якія ішла гаворка, стануць у нас добрым правілам.

П. БРАНДАБОЎСКАЯ.

Напярэдадні абласной нарады работнікаў сельскай гаспадаркі ў эфір выйшлі перадачы аб перадавым вопыце вырошчвання збожжавых, аб севазваротах і прамежкавых культурах (з калгаса «Перамога» Талачынскага раёна) і аб спецыялізацыі вытворчасці, аб цэхавай арганізацыі працы (Аршанскі раён).

Сёлета вясной выкарысталі і такую форму прапаганды перадавога вопыту, як серыя рэпартажаў з адной і той жа гаспадаркі. Нам хацелася на прыкладзе лепшых — саўгаса «Камунар» Докшыцкага раёна — паказаць увесь ход пасяўной ад пачатку да канца. Гэты метад даваў магчымасць адлюстраваць штодзённую аператыўную дзейнасць у гаспадарцы.

Студыя стварыла тэлевізійны фільм «Курсам інтэнсіфікацыі», работа над якім толькі што закончана. Землі ў Докшыцкім раёне лічыліся малапрыгоднымі для вырошчвання сельскагаспадарчых культур. Натуральна, урадлівасць іх была заўсёды ніжэй сярэднеабласных паказчыкаў. У 1965 годзе тут атрымалі 12 цэнтнераў з гектара, а ў мінулым — 27,8. Чым растлумачыць гэты рост? Аўтары фільма Л. Шульман, Г. Зотаў, рэжысёр А. Міхельсон і аператар Ю. Усціновіч паказалі на экране, як сельскія працаўнікі раёна ачышчалі палі ад каменняў, нарыхтоўвалі арганічныя ўгнаенні, па-новаму арганізавалі працу. Асобныя сюжэты стужкі прысвечаны палітычна-масавай рабоце сярод хлебаробаў.

Зразумела, калектыў студыі мог больш ярка, цікавей весці гэтыя перадачы. Для ўзмацнення ўплыву перадач, ахопу шырокага кола тэлегледачоў нам патрэбна сучасная матэрыяльная база. Рэканструкцыя радыёрэлейнай лініі, замена састарэлай апаратуры дазволілі нам у мінулым годзе выйсці са сваімі перадачамі амаль на ўсю вобласць. Але па-ранейшаму мы не маем перасоўнай тэлевізійнай станцыі.

Многае робяць нашы рэдактары, рэжысёры кіно і тэлеаператары, каб усімі наяўнымі сродкамі весці запамінальную і карысную размову з гледачом пра будні і святы трэцяга, рашаючага года пяцігодкі.

А. СЦЕПАНЕЦ,
намеснік старшыні абласнога Камітэта па тэлебачанню і радыёвяшчанню.
Віцебск.

ДУША МАЙСТРА

...ЭКСПРЭС «Беларусь», мерна пагрукваючы коламі, адышоў ад станцыі Мінск і ўзяў курс на Маскву. Амаль трыццаць гадоў мінула з той пары, як не бачылася Аляксандра Якаўлеўна са сваімі франтавымі сябрамі. Якімі сталі яны, ці пазнаюць яе? Заўтра ветэраны сустрэнуцца...

Упершыню Аляксандру Цыплакову назвалі байцом восенню 1942 года. Добраахвотнік Аляксандра Мацура (гэта яе дзявочае прозвішча) атрымала прызначэнне ў ансамбль песні і танца.

Ансамбль падзяляўся на невялічкія канцэртныя брыгады: баяніст, чытальнік, спявачка, танцор,— і ішлі яны ў зямлянкі, каб кароткая перадышка стала для байцоў маленькім святам.

Удзень — канцэрты, а ноччу іншы раз — выносіць з поля бою параненых. Цяпер з цяжкасцю верыцца, што гэта яна, невялічкага росту, амаль дзяўчынка, была здольна на такое. Неаднойчы даводзілася таксама з пярэдняга краю расказваць нямецкім салдатам і афіцэрам праўду пра становішча на франтах, чытаць зводкі Савінфармбюро, перадаваць пераканаўчае слова аб бесперспектыўнасці гітлераўскай авантуры.

Ці магла яна ўявіць тады, што праз сем гадоў стане прафесійным дыктарам, будзе чытаць перадачы ўжо ў мірны час, з добра абсталяваных студый спачатку ў Брэсце, потым у Мінску? Па-сапраўднаму Аляксандра Якаўлеўна авалодала майстэрствам дыктара, калі стала працаваць у Мінску, на Беларускім рэспубліканскім радыё.

Мабыць, ёй пашчасціла на сустрэчы з добрымі і цікавымі людзьмі. З першых крокаў у франтавым ансамблі— гэта быў чытальнік з добрай тэатральнай школай, цяпер майстар мастацкага слова Іван Сычугоў. А на Беларускім радыё — гэта дыспетчар дыктарскай групы, пра якую і дагэтуль усе ўспамінаюць з вялікай цеплынёй і захапленнем, Тамара Ржэўская, стары камуніст, цяпер пенсіянерка, і галоўны рэжысёр радыё, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Павел Данілаў. Колькі сіл і часу гэты, усёй душой улюбёны ў радыёмастацтва чалавек, аддаў дыктарам: і пачаткоўцам, і вопытным. Займаўся ён з намі і тэхнікай мовы, і мастацкім словам. У мяне яшчэ і цяпер захоўваюцца цэлыя сшыткі з перапісанымі ад рукі вершамі і апавяданнямі Пушкіна і Някрасава, Маякоўскага і Чэхава, Купалы і Коласа, па-дыктарску «размечанымі» пад кіраўніцтвам Паўла Аўрамавіча. Мы шмат разбіралі тэкстаў, запісвалі іх на плёнку. І няхай не ўсе гэтыя запісы ішлі ў эфір, было цікава працаваць з нашым рэжысёрам і, бясспрэчна, карысна.

Для творчай манеры Аляксандры Цыплаковай (на мой погляд) характэрна выдатная дыктарская якасць — уменне гутарыць са слухачом! Ідзе гэта ад глыбокага пранікнення ў матэрыял, тонкага разумення ўзаемасувязі аўтарскай думкі і слова, ад таго натуральнага адчування настрою, які потым і перадаецца ў эфір.

Як трэба было прачытаць прапанаваны матэрыял — аб гэтым яна думае і гаворыць нават пасля запісанай на плёнку перадачы, згаджаючыся, а часам і не згаджаючыся з прапанаванай рэжысёрам інтэрпрэтацыяй матэрыялу. Аднойчы ў нашым калектыве зайшла спрэчка: як чытаць інфармацыйныя выпускі радыёстанцыі «Крыніца» — аднаму дыктару ці ўдваіх з партнёрам. І Цыплакова вельмі ўдала паказала прыём чытання адным голасам розных па зместу паведамленняў, з пералівамі свежых інтанацый. Пераканала ўсіх, як кажуць, асабістым прыкладам.

Вось гаворыць чалавек, вы яго слухаеце, і няма ў вас такога адчування, нібы ён, дыктар, ведае больш за вас, проста ён ведае нешта крыху р а н е й за вас. Такая А. Цыплакова ў лепшых сваіх перадачах. Можна падумаць, што для гэтага дастаткова быць добра выхаваным чалавекам наогул. Не! Гэта—і прафесійная якасць дыктара.

Умее А. Цыплакова радавацца за чалавека, і калі ёй даводзіцца расказваць праз эфір пра сціплую даярку або пра славутага вынаходцу, штосьці трымціць, як кажуць, у «падтэксце» прасветленае, добразычлівае. Яна нібы і падтрымлівае таго, аб кім ідзе гаворка, і зычыць яму далейшых поспехаў. А ў тэксце — факт, імя ды прозвішча, лічба, месца падзей... У голасе ж дыктара — душа чалавека! Вось і шукаючы варыянты для «Крыніцы», А. Цыплакова трымала пад увагай менавіта людзей, кожную асобу, якой было прысвечана яе слова.

Тады мы яшчэ раз пераканаліся, што наш калега — артыст. Бо і дыктар, выступаючы перад мікрафонам, уносіць нешта ў перадачу ад свайго мастакоўскага «я». Перажытае ім на вайне, абдуманае над кнігай, сустрэчы ў штодзённым жыцці, — усё гэта пакрысе робіцца тым «эмацыянальным багажом», з якога ён потым бярэ інтанацыі, каб перадаць слухачу (без надакучлівай дыдактыкі) і сваё разуменне сутнасці падзей. Ён можа быць строга афіцыйным і амаль па-інтымнаму даверлівым, звяртаючыся да нас, яму бываюць дарагімі і патэтычныя ноткі, і трапяткі лірызм. Паслухайце А. Цыплакову, і вы адчуеце гэта, хоць адзіным клопатам яе застаецца жаданне данесці да вас актуальнае паведамленне.

Разумнага і шчырага субяседніка заўсёды прыемна слухаць. Такой і ведаюць тыя, хто штораніны ўключае рэпрадуктары або настройвае прыёмнікі на хвалі Беларускага радыё, дыктара Аляксандру Цыплакову. Пра яе можна ўпэўнена сказаць — майстар.

Ада КАЛАМІНСКАЯ,
дыктар Беларускага радыё.

БЕЛАРУСКАЯ ГРАФІКА — УЧОРА І СЁННЯ...

...ВОСТРЫ ШТЫХЕЛЬ нетаропка ўразаецца ў падатлівы лінолеум. Лёгкія чырвоныя стружкі павольна кладуцца ўбок, агаляючы мудрагелістае перапляценне контураў і зрэзаў. Надыдзе час, і, падпарадкоўваючыся задуме мастака, лініі і штрыхі, якія здаваліся бясформеннымі, ператворацца на паперы ў малюнак цудоўнага зімовага дня.

Графіка... Станковая і прыкладная — яна трывала ўвайшла ў наша жыццё, упэўнена заваёўвае сёння ўсё новых «паклоннікаў».

Якія ж тэндэнцыі ў нашай станковай графіцы былі галоўнымі ў апошнія гады?

У сэнсе сюжэтаў — гэта перш за ўсё тэмы гісторыі рэвалюцыі і сучаснасці, гераічнай барацьбы нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, тэмы працы, выхавання новага чалавека. Але ж і пяць, дзесяць гадоў назад гэтыя тэмы таксама былі галоўнымі ў творчасці нашых мастакоў. Што ж змянілася?

Змяніўся падыход да асэнсавання жыцця, іншым стаў пункт гледжання на сутнасць яго. Мастацтва ідзе да пазнання глыбінных працэсаў жыцця, яно становіцца духоўна больш аб'ёмным, багацейшым.

Гэты працэс вельмі яскрава прасочваецца на работах такіх майстроў беларускай станковай графікі, як Арлен Кашкурэвіч, Георгій Паплаўскі, Барыс Забораў, Людвіг Асецкі, мастацкая сталасць якіх якраз і прыпала на апошняе дзесяцігоддзе, і моладзі, якая зусім нядаўна заявіла пра сябе. Дастаткова прыгадаць апошнія серыі Уладзіміра Пашчасцева, Юрыя Зайцава, Мікалая Рыжыкава, Аляксандра Дэмарына, Уладзіміра Самачорнава, Іосіфа Капяляна.

Менавіта ў гэты час вельмі яскрава праявіўся ў нашай графіцы і «фальклорны напрамак». Зварот да традыцый беларускай народнай творчасці ў першую чаргу быў прадыктаваны пошукам паэтычнасці зместу. У рэчышчы гэтых пошукаў у апошнія гады развівалася творчасць Аляксандры Паслядовіч, Наталлі Паплаўскай і іншых майстроў.

У літаграфіях А. Паслядовіч «Зімовыя вячоркі», «Раніца», «Лета ўраджайнае», «Музыкі», «Гаспадыня» паэтычна ўслаўляецца праца і адпачынак людзей калгаснай вёскі. Сюжэты гэтых работ простыя, немудрагелістыя. Часцей за ўсё гэта партрэты людзей, альбо групы фігур, не звязаныя акрэсленым дзеяннем, але вельмі напружаныя, дынамічныя па ўнутранай сутнасці. Каляровыя літаграфіі А. Паслядовіч вызначаюцца лёгкім каларытам, глыбокай лірычнасцю, песенным настроем. У сабранасці іх формы, пічыльнасці штрыха, у замкнёнай кампазіцыйнай структуры ўгадваецца ўплыў традыцый беларускага народнага мастацтва, але ўплыў не прамы, а «прапушчаны» праз аўтарскае «я», адзначаны высокім густам, добрым разуменнем законаў, па якім жыве мастацтва.

Арганічная сувязь з народным мастацтвам вызначае мастацкую манеру многіх беларускіх графікаў.

У серыі лістоў «Беларускае Палессе» Н. Паплаўская дасягае яркай вобразнасці менавіта дзякуючы ўважліваму падыходу да беларускіх народных песень, казак, паданняў. Музычная рытмічнасць, арнаментальнасць яе работ нарадзіліся пад уплывам прыгажосці людзей Палесся, яго прыроды, яго багатай мастацкай спадчыны.

А. Лось у лінагравюрах «Палессе», у лістах «Гаспадар пушчы», «Лета ў Рэчыцы», «Лясны букет» таксама ўдала выкарыстоўвае пластычную выразнасць, якая дазваляе ёй канкрэтныя вобразы напаўняць сапраўднай паэтычнасцю, рабіць іх больш ёмістымі і глыбокімі.

Яна гаворыць «сваім голасам», спакойным, шчырым, сардэчным. Яе «апавядальныя» лісты не толькі «чытаюцца», але і «слухаюцца», бо ў іх — гучанне то гарэзлівай, то журботнай, але заўсёды чароўнай народнай песні.

Многія беларускія графікі шырока думаюць вобразамі. Злучаючы пры дапамозе трапна пабудаваных асацыяцый прасторавыя элементы, яны ўмела вырашаюць тыя галоўныя тэмы, якімі жыве сёння ўсё савецкае мастацтва.

Дастаткова прыгадаць «Партызанскую сюіту» Мікалая Гуціева, у якой вельмі дасціпна злучаны ўспаміны пра мінулае з канкрэтнымі рэаліямі нашага часу, «Поры года» Мікалая Рыжыкава, дзе малады мастак здолеў у звычайных сюжэтах выявіць глыбіню і складанасць адносін паміж людзьмі, «Баладу аб маці» Аляксандра Захарава — сапраўдны ўрачысты рэквіем тым, хто загінуў у барацьбе з фашысцкай навалай, «Падполле Мінска» Людвіга Асецкага, «Капрычас» Яўгена Красоўскага.

За апошнія гады значна ўзрасла ўвага беларускіх графікаў і да свайго тэхнічнага ўзбраення. На гэтым шляху, канечне, сустракаюцца і хібы, калі форма, чыста тэхнічныя прыёмы, пачынаюць прэваліраваць над зместам, становяцца самамэтай. У асноўным жа пошукі беларускіх графікаў ў галіне формы падначалены галоўнаму — ідэі, той думцы, якая «прымусіла» мастака ўзяцца за аловак, пяро, альбо штыхель.

У цыкле цікавых па кампазіцыі і рытму літаграфій Георгія Скрыпнічэнкі відавочна імкненне мастака перадаць складаны комплекс думак і асацыяцый. Але празмерная даніна надакучлівай прадметнасці прымушае нас хутчэй расшыфроўваць, чым успрымаць гэтыя работы. У іх дамініруе форма, форма вынаходлівая, неардынарная, але якая, тым не менш, перашкаджае «дабрацца» да сутнасці аўтарскай думкі. Праз складаную графічную стылістыку малады мастак, калі можна так сказаць, намагаецца актывізаваць успрыняцце гледача. Таму, напрыклад, у сваіх работах, прысвечаных неўміручаму твору Сервантэса, ён наўмысна агаляе кампазіцыю да чыста канструктыўнага вобраза, «фарсіруе» ўмоўнасць, намагаючыся перадаць быццам бы пазаматэрыяльнасць фігур, будынкаў, пейзажу.

Самі па сабе пошукі маладых у галіне формы нельга не вітаць, бо чым больш багаты тэхнічны арсенал мастака, тым больш ён можа сказаць, але пры гэтым, відаць, не трэба забывацца і на тое, што сама па сабе тэхніка не замяняе ні глыбіні думак, ні напалу пачуцця, без якіх мастацтва існаваць не можа.

Захапленне лінагравюрай, так характэрнае для графічных экспазіцый нядаўняга мінулага, сёння саступіла месца больш удумлівай і сур'ёзнай рабоце ў літаграфіі, афорце і інш. Некалькі празмерная суровасць нашай графікі недалёкага мінулага (з-за перавагі чорнага і белага колераў у лінагравюры) змянілася разнастайнасцю танальных і каляровых рашэнняў.

Ужо некалькі гадоў нашы графікі выкарыстоўваюць і падфарбоўку, якая ажыўляе графічныя контуры і сілуэты і лакальныя каляровыя плямы. Колер прыйшоў нават у лінагравюру — а гэта сведчыць пра многае! Вельмі ўдала, напрыклад, ён быў выкарыстаны ў лінагравюрах Юрыя Тышкевіча, Анатоля Тычыны, Алены Лось, Юзэфа Пучынскага, Пятра Драчова.

Калі мастак друкуе колер з розных дошак, напэўна, міжволі паўстае жаданне прадэманстраваць у гравюры адмысловае майстэрства, прыпадобіўшы эстамп да каляровага фота, альбо да цікавага, але адарванага ад развіцця сюжэта дэкаратыўнага элемента.

Сёння цяжка меркаваць, наколькі гэтыя «захапленні» ўласцівы беларускай графіцы, хутчэй за ўсё адметнага следу ў мастацтве нашага эстампа яны не пакінуць, але тым не меней адзначыць іх сімптомы неабходна.

Больш непакоіць іншае — на нашых выстаўках практычна адсутнічае ксілаграфія. Чаму? Ці не таму, што работа з дрэвам патрабуе высокай кваліфікацыі, вялікіх затрат часу і намаганняў. Бадай, акрамя Анатоля Зайцава і Мікалая Лазавога, ніхто з беларускіх майстроў не рызыкуе рэзаць гравюры на дрэве.

Многія творы ў апошні час вырашаюцца нашымі графікамі ў выглядзе тэматычных цыклаў, серый. Прыгадаем серыі лістоў «Будні Ваенна-Марскога Флоту» Л. Асецкага, «Майстры», «Партызаны» А. Кашкурэвіча, «Здабытчыкі», «Белы кантынент», «Па Індыі» Г. Паплаўскага, «Вайна» Р. Віткоўскага, «Брэсцкая крэпасць» П. Дурчына, «Вайна народная», «Беларускія народныя песні» А. Паслядовіч, «Па рачных портах», «Мінск» А. Тычыны, «Пагранічнікі» У. Сакалова, «Хатынь» Ю. Зайцава, «Палеская нафта» У. Пашчасцева, «Мір, каб жыць» Ю. Пучынскага і інш.

Цікавасць беларускіх графікаў да работы серыямі сведчыць перш за ўсё аб жаданні паглыбіцца ў тэму, раскрыць яе як мага больш поўна і разнастайна.

Мастакі ў такіх цыклах імкнуцца больш глыбока прааналізаваць падзеі, якія хвалююць сучасніка і, ацэньваючы іх у перспектыве часу, выявіць галоўнае, паказаць розныя аспекты з'явы, яе шматграннасць.

Але нельга не заўважыць, што іншы раз з'яўленне таго альбо іншага ліста серыі не вынікала з патрабаванняў задумы. Таму ў некаторых серыях, нават з вышэй названых, ёсць лісты пуставатыя, не прадуманыя да

А ФАРБЫ ПАВІННЫ ГУЧАЦЬ...



А. ВУРГАНАЎ. Подзвіг на пажары.

Савецкая міліцыя! Хіба можна без захаплення гаварыць пра штодзённы подзвіг яе байцоў! Тых, хто абараняе наш спакой, тых, хто вядзе няспынную барацьбу супраць усяго агіднага, злоснага, бруднага, што замінае нам рухацца наперад.

Тэма савецкай міліцыі... Якая ўдзячная тэма для творцы, колькі ў ёй сапраўдных, напружаных калізій, колькі матэрыялу для глыбокага роздуму пра чалавека, пра яго дабрату, прынцыповасць і добры неспакой.

На выстаўцы «Заўсёды на варце», адкрытай у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР, шмат партрэтаў. Партрэтаў паясных, у поўны рост, анфас, у профіль, у тры чвэрці. На жаль, гэтыя чыста знешнія прыкметы — амаль адзінае, што адрозніваe на выстаўцы работы партрэтнага жанру. І толькі нямногія творы адлюстроўваюць сапраўдны роздум пра ўнутраны свет людзей, занятых вельмі нялёгкай, але такой неабходнай працай.

Хто ён, савецкі міліцыянер? Якія праблемы яго клапоцяць? Пра што ён думае? Чаму радуецца? Ад чаго пакутуе?..

З партрэтаў хацелася б адзначыць работу І. Віханскага «Партрэт старшага эксперта Упраўлення ўнутраных спраў Масквы Э. Трафімчыка», у якой мастак падкрэслівае інтэлігентнасць, мэтанакіраванасць свайго героя, і карціну А. Налогіна «Пошук. Капітан міліцыі А. Жукс», дзе герой прадстае перад намі як чалавек значны, шматгранны, неардынарны.

Звычайна выстаўку акрэслівае тэматычная карціна. Яна вядзе «галоўную тэму» экспазіцыі, вызначае яе ўзровень і напрамак.

На выстаўцы, прысвечанай савецкай міліцыі, хацелася б убачыць сапраўды значныя, напружаныя па думках і пачуццях палотны, прысвечаныя сённяшняму дню, нашым сучаснікам.

На жаль, лепшыя карціны выстаўкі, такія, як палатно І. Зарыньша «На новы парог», В. Гальцова «Першыя дні савецкай міліцыі», А. Туранскага «Канец беспрытульнасці», скіраваны ў мінулае, у гісторыю.

Многія ж тэматычныя карціны пра сённяшні дзень, таксама як і партрэты, адзначаны фрагментарнасцю, павярхоўнасцю, халодным прафесіяналізмам.

Цяжка сказаць што-небудзь пра карціны Я. Зеліціса «Горад ноччу», І. Бройды «Дружыннікі», Я. Гудзіна «Пошук», А. Знака «Інспектар Дзяржаўнай аўтаінспекцыі», Г. Мунцяна «Мірны сон», бо ў іх банальнасць роздуму нават не заўсёды добра закамуфліравана ўменнем кампанаваць, знаходкамі каларыту і іншымі чыста прафесійнымі якасцямі.

А між тым, пра сённяшні дзень нашай міліцыі ёсць што сказаць, сказаць узрушана.

Сведчанне таму — палатно Я. Шырокава «Суд ідзе».

Мастак у гэтай рабоце не пайшоў па шляху знешняй ілюстрацыйнасці. Ён здолеў паглыбіцца ў тэму, вызначыць яе сацыяльную значнасць і ў той жа час знайсці вельмі трапныя эмацыянальныя фарбы для характарыстыкі персанажаў.

Тры хлопцы, амаль падлеткі, сядзяць на лаве падсудных. Не, гэта не закаранелыя злачынцы. Іх душы яшчэ вельмі пластычныя, іх можна выхаваць сапраўднымі

канца, лісты, якія і па свайму эмацыянальнаму напружанню і па глыбіні асэнсавання падзеі «выпадаюць» з агульнага ладу серыі.

У апошнія гады ў беларускай графіцы атрымала сталае прызнанне станковая ілюстрацыя, як самастойны жанр. Права на яе існаванне сёння ўжо нельга аспрэчваць. Ёй прасторна на стэндах выставак, яна ўздзейнічае на гледача іншы раз «мацней», чым надрукаваная ў кнізе.

Сярод лепшых работ гэтага жанру неабходна назваць ілюстрацыі да «Новай зямлі» Я. Коласа, «Лёдавай кнігі» Ю. Смуула — Г. Паплаўскага, аповесці Ф. Дастаеўскага «Кроткая» — Б. Заборава, паэмы У. Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін» — В. Шаранговіча, паэм Я. Купалы — А. Кашкурэвіча.

Гэтыя работы нацэлены на пошук новага тыпу выяўленчага апавядання, на раскрыццё ў ілюстрацыі новых сувязей, якія мастак пачарпнуў у выніку паглыблення ў свет літаратурных вобразаў. Яны вызначаюцца самастойнасцю, «аўтаномнасцю» кожнага ліста, і ў той жа час у іх — непарыўная сувязь з тым светам, які выклікае ў кожным з нас вядомы літаратурны твор.

Высокая графічная тэхніка, умельства і багацце прыёмаў, здольныя даставіць гледачу адпаведную эстэтычную асалоду. І ўсё ж яны — толькі сродак, а ні ў якім разе не мэта мастака.

Пераходзячы ад аўтара да аўтара, ад ліста да ліста, мы шукаем у беларускай станковай графіцы творы, у якіх бы тэхнічная сталасць, майстэрства спалучаліся з трапяткой думкай мастака, яго жывым пачуццём, служылі галоўнай задачы творцы — даследаванню жыцця, сучаснасці. Шукаем і знаходзім!

Але ёсць і іншыя работы, для якіх характэрныя свае «трывалыя» рысы — адпаведная прафесійнасць, «гладкасць» зместу і... халоднасць, ілюстрацыйнасць, за якімі не адчуваеш мастакоўскай пазіцыі, сапраўднага грамадзянскага гарэння, глыбіні аналізу, шчырасці пачуцця.

У нас пакуль шмат лірычна-расчуленых, ідылічных, «прыгожых» твораў, якія самі па сабе і не выклікаюць пярэчання. Але іх празмерна вялікая колькасць насцярожвае. Ці не шмат «крымскіх», «асенніх», «зімовых», «дажджлівых», «ранішніх», «перадвячэрніх» матываў?

Хочацца бачыць сярод беларускіх графікаў людзей, якія ўсё глыбей думаюць аб складанасці, кантрастах часу, аб супярэчнасцях жыцця, шукаюць адказаў на праблемы эпохі.

Ніякая сучаснасць почырку, ніякі тэхнічны артыстызм не заменіць свежасці адчування сённяшняга дня, тых эмацыянальных адкрыццяў, якія толькі і могуць ператварыць рамяство ў сапраўднае мастацтва.

Гэтай свежасцю, глыбінёю, сілай і трэба мерыць поспехі сучаснай беларускай графікі.

Барыс КРЭПАК.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

ВЕРНІСАЖ СТАРЭЙШАГА ГРАФІКА

С. ЮДОВІН. Дарога жыцця. 1946 г.

У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстаўка работ вядомага графіка С. Б. Юдовіна (1894—1954 гг.).

Саламон Юдовін пакінуў значны след у развіцці савецкай графікі. Яго работы карысталіся вялікім поспехам у мастакоў, і аматараў выяўленчага мастацтва.

Больш за 50 гравюр С. Юдовіна, якія захоўваліся ў фондах віцебскага краязнаўчага музея, прадстаўлены на выстаўцы. Гэта лісты з цыкла «Былое», якія прысвечаны Віцебску 20-х, 30-х гадоў. Лісты, якія расказваюць аб жыцці і барацьбе блакаднага Ленінграда, аб шчаслівых днях Перамогі, пасляваенных гераічных буднях.

Шырока прадстаўлена на выстаўцы і творчасць Юдовіна-ілюстратара.

Наведвальнікі пазнаёмяцца з яго ілюстрацыямі да твораў Л. Фейхтвангера, А. Свірскага, Ш. Абрамовіча, В. Бергольц.

А. ПАДЛІПСКІ.

С. ЮДОВІН. На фронт. 1947 г.

У МАЙСТЭРНЯХ МАСТАКОЎ

І СТВАРЫ ЛЯЛЬКУ...

ЛЯЛЬКА пачынае жыць у руках акцёра. Але характар ёй «задае» мастак. Прыдумаць ляльку складана. Нават адну. А іншы раз у спектаклі ўдзельнічае да пяцідзесяці і больш лялек!

Шафы, што размясціліся ў майстэрні Леаніда Міхайлавіча Быкава — мастака Мінскага лялечнага тэатра, не ўмяшчаюць нават эскізы, зробленыя за апошнія гады. А ён працуе ўжо 17.

— Як прыйшоў да лялек? Бадай, выпадкова,— расказвае Леанід Міхайлавіч.— Пасля заканчэння мастацка-прамысловага вучылішча імя Мухінай працаваў у галіне гандлёвай рэкламы. Неяк гуляў па вуліцы і ўбачыў шыльдачку: лялечны тэатр. Дай, думаю, зайду. Зайшоў. Гэта было ў Ленінградзе. А тэатр, у які я трапіў, быў тэатрам Абразцова...

Нараджаецца новы спектакль. Пакуль мірна суседнічаюць фанабэрыстая прынцэса і стомлены вандроўнік, пачвара Бармалей і баязлівы поп. Потым, у спектаклі, яны будуць трымаць сябе так, як напісана ў п'есе, як патрабуюць ад іх акцёры. Хоць зусім няправільна было б думаць, што сама лялька не дыктуе пэўных паводзін акцёру. Калі мастак стварае ляльку, ён думае і пра тое, ці «пасябруе» яна з артыстам, ці прыме ён яе без «супраціўлення». Вельмі важна, каб так было.

А то, бывае, мастак зрабіў ляльку, душу, можна сказаць, у яе ўклаў, акцёр жа, які таксама думае над будучай работай, уявіў яе зусім іншай. Асабліва часта такое здараецца, калі мастак спрабуе выкарыстаць новы, нязвыклы матэрыял. Часам удаецца пераканаць артыста, але часцей прыходзіцца перарабляць. І не раз, і не два... Шлях лялькі на сцэну доўгі і нялёгкі. Выканаўцу іншы раз хочацца, каб яна або ўсміхалася, або плакала. Але ж у час спектакля ёй даводзіцца рабіць і тое і другое. Як тут быць? Трэба знайсці для яе такі «нейтральны» твар, які ў розных сітуацыях успрымаўся б гледачамі па-рознаму.

І вось лялькі гатовы. Іх палюбілі дзеці і дарослыя. Але лялькі, як і людзі, старэюць. Вядома, можна было б пашыць ім новыя сукенкі, падфарбаваць... Дык жа ўсё роўна **тыя** лялькі не паўторацца, народзяцца іншыя. Таму іншы раз мастак для аднаго і таго ж спектакля прыдумвае зусім новых «герояў». Вядома, у гэтым ёсць пэўная рызыка. Хто ведае, ці прыме іх глядач?

Акрамя таго, што лялька павінна быць арыгінальнай, умець сыграць свой тэкст, «не выпадаць» з агульнай задумы спектакля, яна павінна яшчэ быць лёгкай, каб не стамляліся рукі ў тых, хто яе водзіць. Мастак абавязаны думаць і пра тое, каб лялькам і акцёрам было зручна ў тых або іншых дэкарацыях.

Пасля паездкі ў Чэхаславакію, дзе Леанід Міхайлавіч пазнаёміўся з работай лялечных тэатраў, ён рашыў паспрабаваць прымяніць у сваім тэатры, так званую чэшскую лесвіцу. Яна дазваляе лялькам (зразумела, разам з акцёрамі) перамяшчацца ў трох плоскасцях, што выглядае надта эфектна. Такі прыём выкарыстаны пры пастаноўцы «Снягурачкі». Дзеці глядзяць спектакль з нязменным захапленнем. Школьнікі, з якімі давялося гутарыць, расказвалі, што яны прыходзяць на гэты спектакль па некалькі разоў: «усё, як у кіно, і нават больш цікава». А вось лялечны балет «Жар-птушка» многія гледачы не прынялі. Балет на музыку выдатнага кампазітара Стравінскага, і лялькі адпаведна «музычныя». А вось не глядзяцца. У чым справа?

— Ведаеце, — гаворыць Леанід Міхайлавіч, — павялося ўжо так, што ў лялечным тэатры павінна быць смешна. Але гэта зусім не абавязкова. Лялькі пад сілу сыграць і трагедыю. Пацвярджэнне таму — спектакль «Званы-лебедзі». У ім дзяўчына Фімушка выратоўвае свой горад ад ворагаў, ахвяруючы прыгажосцю і маладосцю.

У апошні час на сцэне побач з лялькамі пачалі з'яўляцца і акцёры. Як жа мастак Леанід Быкаў ставіцца да такога партнёрства?

— Мне здаецца, што лялечны тэатр дастаткова багаты сваімі сродкамі выражэння і ў нейкім «допінгу» не мае патрэбы. І самае нечаканае — акцёр побач з лялькай прайграе, выглядае бездапаможным.

Мы перабіраем бясконцыя эскізы ўжо гатовых і будучых лялек... Колькі загадкавага ў кожнай з іх!

Быць мастаком лялечнага тэатра — значыць быць фантазёрам, выдумшчыкам і... вельмі сур'ёзным чалавекам.

Н. АНОХІНА.



М. ПЯРМЯК. Дружыннікі.

грамадзянамі і... Многае залежыць ад суда. Ад яго пранікнёнасці, умення ўбачыць сутнасць за наносным, за шалупінням.

Так, яны парушылі закон і мусяць адказаць за гэта. Але можа ў гэтым выпадку, улічваючы глыбіню іх раскайвання, будзе больш мэтазгодным зрабіць палёгку.

Усё залежыць ад суда.

Крыху ўбаку — вартавы міліцыянер. Можа ўчора ён затрымаў гэтых падлеткаў. А сёння глядзіць на іх з такім шчымлівым болем у позірку, з такой крыўдай на сябе за тое, што недзе недагледзеў, не спыніў хлопцаў раней. І нам робіцца ніякавата— а ці не здаралася, што і мы праходзілі міма, адмахваліся, не заўважалі той мяжы, за якой звычайнае дзіцячае блазнаванне ператваралася ў злачынства.

Хацелася б, каб такая прадстаўнічая выстаўка была больш глыбокай, значнай. Каб яна стала для гледачоў сапраўднай з'явай, а для мастакоў — своеасаблівым універсітэтам мастацтва.

А. БЕЛАВУСАЎ.

Я. ШЫРОКАЎ. Суд ідзе.

МУЗЕЙ РАБОЧАЙ СЛАВЫ

У 100-ю гадавіну завода «Чырвоны Кастрычнік» у палацы культуры ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасці прадстаўнікоў адміністрацыі, кіраўнікоў грамадскіх арганізацый, партыйнага, прафсаюзнага і камсамольскага актыву, ветэранаў вайны і працы, перадавікоў вытворчасці быў адкрыты заводскі музей.

З хваляваннем і гонарам пераступілі прысутныя парог невялікай залы, у якой паказана ўсё тое галоўнае, што зроблена тут за 100 гадоў, адлюстраваны рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя заслугі многіх пакаленняў рабочага класа. У гэтым вялікая іх заслуга, што завод узнагароджаны з выпадку юбілею ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі.

З вялікай цікавасцю глядзяць наведвальнікі на пажоўклыя старонкі, чытаюць скупыя радкі гістарычных дакументаў.

Перад намі экспазіцыя, прысвечаная перыяду з 1873 года па 1905. Звяртае на сябе ўвагу кніга «Указальнік фабрык і заводаў Еўрапейскай Расіі» 1874 года. Гэты дакумент гаворыць аб тым, што цвікавадротавы завод быў створаны ў 1873 годзе і на заводзе працавала 68 рабочых. Асноўная прадукцыя — дрот, цвікі і шыпы, чыгуннае ліццё...

Умовы працы рабочых былі тут цяжкімі, аб чым сведчаць фотадакументы і паведамленне фабрычнага інспектара, які пісаў аб гэтым у 1905 годзе ў сваёй справаздачы.

У дакументах расказваецца аб забастоўках і дэманстрацыях рабочых драцяна-цвікавага завода яшчэ ў 1905—1906 гады. Рэвалюцыйным рухам кіравала падпольная арганізацыя РСДРП, створаная ў 1904 годзе, якая складалася з 18 чалавек.

Адна з экспазіцый музея ўзнаўляе падзеі перыядаў Лютаўскай і Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

30 кастрычніка 1917 года перавыбіраецца Савет рабочых дэпутатаў цвікавага завода, а ўлада пераходзіць у рукі Саветаў, якія ўзначальваюць бальшавікі.

...Студзень 1919 года. Калектыў завода накіроўвае лепшых рабочых у Чырвоную Армію. Абараняць Савецкую ўладу ідуць каваль І. Смірноў, цвікар Ф. Голахаў, настройшчык Г. Антонаў, слесар Х. Шамшураў і інш.

З велізарнай цікавасцю азнаёміліся наведвальнікі музея з экспазіцыяй, якая расказвае аб прадпрыемствах пасля Вялікага Кастрычніка.

Стэнд «Гады сацыялістычнага будаўніцтва» паведамляе аб самаадданай працы рабочых завода ў гады першых пяцігодак, аб ударніках і стаханаўцах. Змешчаны партрэты У. Нікіціна, Л. Гарбачова, І. Корбана і інш.

...Суровыя гады вайны. Гэтаму перыяду прысвечаны спецыяльны раздзел. Многія рабочыя завода адпраўляюцца на фронт, а яго абсталяванне эвакуіруецца ў горад Благавешчанск. Беларускае прадпрыемства не спыняе сваёй дзейнасці на далёкай Башкірскай зямлі. Кожны экспанат усё паўней раскрывае працоўную біяграфію завода. У 1947 годзе пачаўся серыйны выпуск швейнай бытавой машыны «Чырвоны Кастрычнік». 1952 год паклаў пачатак тэхнічнаму напрамку — вытворчасці ультракароткахвалевых радыёстанцый для народнай гаспадаркі і кандэнсатараў пераменнай ёмістасці для шырокавяшчальных і транзістарных прыёмнікаў.

Стэнды наглядна і пераканаўча паказваюць, як удасканальваюцца вырабы, выпускаемыя прадпрыемствам, як дасягаюць ўзроўню сусветных стандартаў.

Многія рабочыя, ІТР і служачыя ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Аб гэтым расказвае стэнд «Узнагароды Радзімы за доблесную працу». На ім — фотаздымкі кавалераў ордэна Леніна С. Рудаковай, А. Грэлава, Г. Галецкай, кавалераў ордэна Кастрычніцкай рэвалюцыі А. Гутаровіча, А. Папкова, А. Аверчанка, В. Казлоўскага.

16 чалавек узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, 19—ордэнам «Знак Пашаны», 20—медалямі «За працоўную доблесць» і інш.

611 чалавек узнагароджаны Ленінскімі юбілейнымі медалямі.

З вялікай цеплынёй і любоўю сабраны, захаваны і прадстаўлены ў музеі архіўныя матэрыялы, экспанаты, якія сведчаць аб выдатных рэвалюцыйных, баявых і працоўных справах калектыву завода.

Музей добра абсталяваны, вітрыны, паўтурнікеты зроблены ўмелымі рукамі саміх рабочых.

Па крупіцах сабралі экспанаты дырэктар музея А. Ціханскі, члечы савета музея К. Дудчанка, М. Мацулевіч, В. Маханькоў. Цяпер у заводскага музея сотні сяброў і памочнікаў. За некалькі дзён яго наведалі многія жыхары нашага горада, служачыя, школьнікі. Прыемна, што прыходзяць сюды юнакі і дзяўчаты, падоўгу затрымліваюцца ля стэндаў і, хто ведае, можа ў думках яны звяраюць сваё жыццё з жыццём выдатных людзей роднага прадпрыемства, героямі першых пяцігодак.

Стварэнне Музея рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы на заводзе «Чырвоны Кастрычнік»— важная падзея ў жыцці нашага калектыву. Аб гэтым сведчаць першыя водгукі ў кнізе наведвальнікаў. Вось адзін з іх: «Гонар і слава людзям, якія ствараюць гісторыю і вялікая ўдзячнасць тым, хто захаваў яе».

Э. НАВУМАВА,
намеснік сакратара парткома Аршанскага ордэна Кастрычніцкай рэвалюцыі завода «Чырвоны Кастрычнік».

Цэлы тыдзень у Івянцы на фабрыцы керамікі і вышыўкі праходзіў рэспубліканскі навукова-практычны семінар народных майстроў па кераміцы. Праведзены ён па ініцыятыве Рэспубліканскага дома мастацкай самадзейнасці і Саюза мастакоў БССР.

На семінар былі запрошаны майстры з Украіны і Літвы. З Палтаўскай вобласці ў рабоце семінара прыняў удзел народны майстар з вёскі Апошыя В. Амяльяненка, з Вільнюса — О. Валюшыс.

У адным з цэхаў фабрыкі — выстаўка, на якой прадстаўлены работы ўдзельнікаў семінара.

Чатыры дні цэх керамікі быў адданы ў распараджэнне народных майстроў. На ганчарных кругах побач з украінскім і літоўскім майстрамі працавалі івянецкія ганчары: І. Малчановіч, Ф. Цэлішэўскі, А. Пракаповіч, А. Пупко, кераміст з Барысава А. Церабіна. Зробленае рукамі майстроў папоўніць выстаўку-музей, якая будзе адкрыта пры Івянецкай фабрыцы керамікі. Удзельнікам семінара былі прачытаны лекцыі. Чыталі: дацэнт Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута В. Гаўрылаў — «Мастацкая кераміка, традыцыі і наватарства», старшы мастак упраўлення мастацкай прамысловасці Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР М. Шаўцова — «Традыцыі Івянецкай керамікі», намеснік дырэктара Дзяржаўнага мастацкага музея І. Паншына — «Беларускае народнае мастацтва».

Паказам кінафільма пра літоўскую кераміку пачала сваё выступленне мастак-кераміст Вільнюскага палаца народнай творчасці О. Крэйвітэ.

З лекцыямі выступілі: выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута М. Казарог, Т. Паражняк.

Удзельнікі семінара пабывалі ў Мінскім музеі, пазнаёміліся з памятнымі мясцінамі, наведалі мемарыяльны комплекс «Хатынь».

На здымках:

На адкрыцці семінара дырэктар Рэспубліканскага дома мастацкай самадзейнасці А. Білібін.

Народны майстар па кераміцы В. Амяльяненка.

На выстаўцы.

Фота і тэкст В. Дубінкі.

РАДКІ З ПІСЬМАЎ

Агітбрыгада Рэчыцкага дома культуры выступіла з новай праграмай. Асаблівым поспехам у гледачоў карыстаюцца артысты народнага тэатра В. Васіленка і Б. Бунь, у праграме якіх сатырычныя творы на вострыя злабадзённыя тэмы.

І. САВІЦКІ.

●

51 канцэрт дала за нядаўнюю паездку па калгасах і саўгасах агітбрыгада Крупскага раёна. У час паездкі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці аказалі практычную дапамогу сельскім клубам.

І. КАЗЕНКА.

●

Тысячы віцяблян прысвячаюць свой вольны час музыцы. Але па масавасці першынство, напэўна, належыць аматарам духавых аркестраў. Яны створаны амаль на ўсіх буйных прадпрыемствах абласнога цэнтра.

Лепшыя з іх прынялі ўдзел у першым гарадскім свяце духавой музыкі. Журы адзначыла выканаўчае майстэрства духавых аркестраў Віцебскага музычнага вучылішча, дамоў культуры дрэваапрацоўчага камбіната і абутковай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік».

А. АРЦЕМ'ЕЎ.

●

У госці да жыхароў Брэста прыехаў Чарнігаўскі музычна-драматычны тэатр імя Т. Р. Шаўчэнкі.

У яго рэпертуары — музычныя камедыі «Дарогі, якія мы выбіраем», «Адна бяроза ведае», «Цырк запальвае агні», «Каўказская пляменніца» і іншыя.

У спектаклях заняты заслужаныя артысты рэспублікі Жана Фадзеева, Эма Мароз, Віктар Вінаградаў, Віктар Мірашнічэнка і іншыя.

Гастролі Чарнігаўскага драматычнага тэатра ў праслаўленым горадзе над Бугам — яшчэ адна старонка ў летапісе дружбы братніх рэспублік.

У. ФІЛІНОВІЧ.

МАЛАДЫМ АРТЫСТАМ — ГРАМАТЫ

У апошні час калектыў Краснапольскага народнага драматычнага тэатра раённага дома культуры папоўніўся таленавітай моладдзю. Маладыя артысты нядаўна падрыхтавалі пастаноўку па п'есе Я. Купалы «Прымакі». Прэм'еру цёпла сустрэлі гледачы раённага цэнтра, працаўнікі калгасаў і саўгасаў Краснапольскага і Чэрыкаўскага раёнаў.

Улічваючы поспехі самадзейных артыстаў у развіцці тэатральнага мастацтва, бюро Краснапольскага райкома камсамола ўзнагародзіла актывістаў-камсамольцаў граматамі.

У. БЕЛЕНЬКІ.

ДАРАЖЫЦЬ КНІГАЙ

— ДОБРЫ дзень!

Першай прывіталася з дзецьмі, а разам і з Нінай Пятроўнай Чмуравай жвавая трэцякласніца Іра.

У бібліятэцы Іра не навічок. На яе рахунку ўжо некалькі дзесяткаў прачытаных кніг. Пяць кніг як прачытала Ірына пра Уладзіміра Ільіча Леніна. А вечарамі, калі зробіць усе ўрокі, расказвае пра яго браціку і сястрычцы. Дзяўчынка яна вельмі старанная, клапатлівая. Пакуль маці прыйдзе дадому, а працуе яна на крухмальным заводзе, Ірына ўсю хатнюю гаспадарку вядзе. А вучыцца стараецца так, як вучыўся Валодзя Ульянаў.

Саша Арлоўскі і Іра Серыкава пойдуць у першы клас сёлета. Бацькі іх настаўнікі. Дзеці даўно вывучылі буквар, умеюць пісаць, рашаць задачы. Яны вельмі сябруюць з кніжкамі. Заўважылі адну, дзе на вокладцы намаляваны вялікі стройны вярблюд, запрэжаны ў гарматны перадок, стаяць, чытаюць: «Ка-вы-лёк...»

Але Ніна Пятроўна дала ім толькі пагартаць гэтую кніжку, паглядзець малюнкі. Сказала, што яна напісана для дзяцей, якія зусім добра ўмеюць чытаць, больш чулі, больш ведаюць пра вайну. Крыўдаваць на Ніну Пятроўну не даводзіцца, бо кніг у бібліятэцы вельмі многа.

Добра, цікава ў бібліятэцы. Тут цэлы дзень не выключаецца тэлевізар, ёсць чытальная зала. Схіляюцца дзіцячыя галовы над кніжкамі. Прыгожа афармлены кніжныя паліцы, шмат стэндаў. А вось галерэя герояў. На адным здымку можна ўбачыць чалавека ў форме ваеннага лётчыка. Дзеці добра ведаюць яго, часта сустракаюцца з ім, вітаюцца на вуліцах. Гэта Герой Савецкага Саюза Мікалай Трафімавіч Кітаеў. Вельмі мужны, вельмі адважны гэты чалавек. Не ведалі літасці ад яго фашысты, калі прыйшлі на нашу зямлю, калі пачалі разбураць школы, паліць кнігі, забіваць людзей. Мікалай Трафімавіч бясстрашна бараніў родную зямлю і роднае неба. Будучы лётчыкам-знішчальнікам, ён збіў дзевятнаццаць варожых самалётаў. Нядаўна пайшоў па заслужаны адпачынак. А калі працаваў старшынёй Бялыніцкага пасялковага Савета, дык таксама нямала зрабіў для дзяцей, каб раслі яны разумнымі, больш чыталі, прыгожа пісалі, шмат ведалі. Мікалай Трафімавіч асабіста цікавіўся, якія кнігі любяць чытаць рабяты, раіўся з настаўнікамі, бібліятэкарамі.

Ёсць тут здымак Лёні Лорчанкі. Дзеці ведаюць, які адважны быў гэты піянер, як моцна любіў ён сваю Радзіму, як ненавідзеў гітлераўцаў. Ён таксама Герой. Толькі Залатой Зоркай узнагароджаны пасмяротна. Загінуў Лёня непадалёку ад Бялыніч.

А здарылася гэта так. Юны партызан, які смела пускаў пад адхон варожыя эшалоны, зімой і летам, ноччу і днём, па бездаражы хадзіў у разведку, блукаў ад вёскі да вёскі, каб высачыць ворагаў, аднойчы натрапіў на засаду. Фашысты акружылі яго. Лёня ведаў, што жывым яму не выбрацца. Юны мсціўца падпусціў да сябе групу гітлераўцаў, а затым выхапіў гранату і ўзарваў іх разам з сабою. Рабяты ведаюць пра подзвіг Лёні Лорчанкі, клапатліва даглядаюць яго магілу, клянуцца быць такімі ж, якім быў Лёня. А вось кнігі пра яго ў бібліятэцы няма.

Сядзім, гутарым з Нінай Пятроўнай. Праўда, ёй няма часу, трэба прымаць, выдаваць літаратуру. Прыйшлі выхавацельніцы дзіцячых садоў Валянціна Рыбачонак і Соф'я Нізаўцова. Балазе, выхадны ў іх у нядзелю. Здаюць, выбіраюць новыя кнігі для самых маленькіх. Казкі, песні, загадкі, розныя забаўкі... Ідуць сюды і бацькі. Цэлы дзень клапатуе Ніна Пятроўна. Звычайна дапамагаюць ёй Галіна Міхеева, якая кіруе тут масавай работай, і загадчыца бібліятэкі Зінаіда Зімавіліна. Ніна Чмурава, каб не застацца ў даўгу, прымае ўдзел у падрыхтоўцы ранішнікаў, правядзенні канферэнцый юных чытачоў. Працуюць рупліва, шчыра.

Нельга сказаць, што лёгкая гэта праца, як здаецца на першы погляд. Ёсць у рабоце з дзецьмі свае тонкасці, свае прынцыпы і цяжкасці. Ніна робіць аналіз прачытанай літаратуры кожным юным чытачом. Адзін, напрыклад, захапляецца прыгодніцкай літаратурай, другі — любіць кнігі пра родную прыроду. Каб не было аднабаковасці, яна прапануе розную літаратуру. Дзеці, такім чынам, цікавяцца і тым і другім. Любіць іх Ніна Пятроўна: умее сустрэць, пагаварыць і развітацца. Яна вучыць малышоў даражыць кнігай, любіць яе, не рваць, не пэцкаць. Рабяты прывыкаюць да акуратнасці, вяртаюць у бібліятэку кніжкі акуратна абгорнутымі ў паперу, калі трэба падклеяць адарваны аркушык. За гэта атрымліваюць ад Ніны Пятроўны падзякі і новыя цікавыя кніжкі.

Рыгор ЯУСЕЕУ.

Агітбрыгада Юдкаўскага сельскага клуба Дзяржынскага раёна часта выступае перад хлебаробамі з разнастайнай праграмай.
Цяпер сцежкі самадзейных артыстаў вядуць на палеткі, лугі—туды, дзе ідзе гарачая праца.
На здымку — спяваюць Т. Асадчая і А. Саўчык. Акампаніруе А. Асадчы.
Фота В. ЖЫБРЫКА.

У КАГО КЛЮЧЫ АД КЛУБА?

Прайшло амаль паўгода, калі я апошні раз пабывала ў Любанскім доме культуры Лунінецкага раёна. І цяпер, едучы сюды зноўку, хацелася даведацца, што змянілася тут, якія задумы здзейснены, над чым працуюць культработнікі. Гэтая цікаўнасць узнікла яшчэ таму, што ў доме культуры ёсць добрая «база»: тут працуюць адукаваныя спецыялісты, вакол якіх групуецца здольная моладзь.

Спадзяванні апраўдаліся. Чысціня і ўтульнасць пануе ў памяшканні дома культуры. Абноўлена наглядная агітацыя. На відавоку афармлена галерэя перадавікоў калгаса «Новае Палессе». Тут жа сацыялістычныя абавязацельствы раёна, гаспадаркі, механізатараў, паляводаў і жывёлаводаў.

У доме культуры было вельмі ажыўлена. Да свайго чарговага пасяджэння рыхтаваўся клуб «Атэіст». У рабочых пакоях філіяла музычнай школы праходзілі заняткі. Дырэктар дома культуры Міхаіл Яраховіч знаходзіўся на «дырыжорскім мосціку» — на сцэне ішла рэпетыцыя духавога аркестра, які рыхтаваўся да абласнога агляду самадзейных талентаў.

Магчыма, добрыя ўмовы адпачынку, цікавыя вечары з'яўляюцца адной з прычын, што моладзь трымаецца ў родных мясцінах. Юнакі і дзяўчаты набываюць сельскія спецыяльнасці і працуюць механізатарамі, жывёлаводамі... Цяпер працягваюць вучобу 21 калгасны стыпендыят, 28 хлебаробаў вучацца ў ВНУ, 75 — у сярэдніх спецыяльных установах.

Міжвольна прыходзіць думка, як важна, калі ачагі культуры ў вёсках узначальваюць энергічныя і адукаваныя людзі, здольныя самастойна вырашаць складаныя пытанні, адшукваць новыя формы работы і творча імправізаваць іх. Такім чалавекам і з'яўляецца Міхаіл Яраховіч.

Нельга абысці ўвагай і Падгарнянскі сельскі дом культуры Баранавіцкага раёна, які каля дванаццаці год узначальвае Міхаіл Тарасюк. Не трэба вывучаць справаздачы і планы, каб яскрава бачыць, чым жыве і над чым працуе клуб. Дастаткова аднойчы правесці вечар сярод самадзейных артыстаў, як усё стане зразумела.

І такіх культасветустаноў у вобласці нямала. Гэта і Агарэвіцкі сельскі клуб Ганцавіцкага раёна, і Дастоеўскі сельскі дом культуры Іванаўскага раёна, і Рэвяціцкі сельскі дом культуры Баранавіцкага раёна, і многія іншыя.

Работнікаў культасветустаноў рыхтуюць у асноўным Гродзенскае і Магілёўскае вучылішчы. Пасля вучобы, маючы тэарэтычную падрыхтоўку, юнакі і дзяўчаты выходзяць на самастойную дарогу жыцця. Каб нейкім чынам папаўняць іх веды, Брэсцкае ўпраўленне культуры праводзіць пэўную работу па падрыхтоўцы кадраў. Гэта, перш за ўсё, раённыя і абласныя семінары, курсы павышэння кваліфікацыі, курсы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці.

І ўсё ж здараюцца выпадкі, калі ключы ад клуба даручаюць выпадковым людзям, якія не толькі не ведаюць, але і не любяць сваю работу. Менавіта ў такіх выпадках часцей за ўсё і можна заўважыць замест яркага агеньчыка ў вокнах — замок на дзвярах.

С. ПУХОЎСКАЯ,
метадыст Брэсцкага абласнога дома народнай творчасці.

ПАРТЫЯ — НАША СУМЛЕННЕ

ТАК называецца кніжная выстаўка, якую арганізавалі работнікі Бярэзінскай раённай дзіцячай бібліятэкі. Выстаўка прысвечана 70-годдзю II з'езда РСДРП і складаецца з такіх раздзелаў: «Жыццё камуністаў — прыклад для нас», «Удзельнікі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі», «Гераічны шлях КПСС».

Тут сабраны вершы аб партыі, дакументальная і мастацкая літаратура аб дзеячах рабочага руху ў Расіі, вядомых рэвалюцыянерах, удзельніках рэвалюцыйнага падполля заходніх абласцей Беларусі.

На асобным стэндзе — творы аб У. І. Леніне, яго саратніках па барацьбе.

У бібліятэцы ў гэтыя дні асабліва ажыўлена. Юныя чытачы з вялікай цікавасцю слухаюць гутаркі пра дзеячоў партыі М. І. Калініна, Ф. Э. Дзяржынскага, С. М. Кірава і іншых.

Днямі тут адбылася канферэнцыя па аповесці Л. Авалава «Студзеньскія ночы» — аб жыцці і дзейнасці Р. Зямлячкі.

Выстаўка ілюстравана фатаграфіямі, малюнкамі, плакатамі.

ХРОНІКА КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

Усепольскі фестываль партызанскай песні прайшоў у горадзе Красніку Люблінскага ваяводства — цэнтры партызанскага руху ў Польшчы ў гады вайны. На ім з поспехам выступіла народная харавая капэла настаўнікаў Брэста.

●

Студэнты Валерый Каралёў і Вікторыя Цішкоўская сталі пераможцамі фотавыстаўкі-конкурсу, праведзенага Магілёўскім гарадскім домам культуры. У ім удзельнічала 27 фотааматараў, якія прадставілі звыш ста работ.

●

У вёсцы Партызанаўка — адной з самых аддаленых населеных пунктаў Слонімшчыны — адкрыўся шырокаэкранны кінатэатр. Цяпер у раёне дзейнічае каля 40 шырокаэкранных установак.

Фотаэцюд М. МІНКОВІЧА.

СВЯТА НЕПАРУШНАЙ ДРУЖБЫ

ПАЗНЕЙ, чым звычайна, пачалося сёлета на Алтаі сібірскае лета. Затрымала яго халодная доўгая вясна з дажджамі і зменлівым надвор'ем. Але неўзабаве пацяплела.

— Беларусы прывезлі сонца, — гаварылі ўсе ў Барнауле.

Сапраўды, і напярэдадні, 31 мая, калі барнаульцы сустракалі гасцей з Беларусі, і 1 чэрвеня, калі адкрыўся фестываль беларускага мастацтва і літаратуры, сонейка свяціла па-летняму шчодра, саграваючы гасцінную і ўрадлівую алтайскую зямлю.

У Барнаул прыехалі пісьменнікі, мастакі, група кінематаграфістаў, кампазітары, салісты оперы і Белдзяржфілармоніі, Дзяржаўны народны хор БССР, эстрадная група пад кіраўніцтвам заслужанага артыста БССР Віктара Вуячыча, ансамбль «Песняры», эстрадная брыгада пад кіраўніцтвам заслужаных артыстаў Э. Міцуля і І. Лакштанава, эстрадная група пад кіраўніцтвам Н. Багуслаўскай, у складзе якой ансамбль «Арбіта-67», чытальнікі і многія іншыя выканаўцы.

Барнаул — горад буйных прамысловых прадпрыемстваў, вышэйшых навучальных устаноў і навукова-даследчых інстытутаў, вялікі культурны цэнтр, старадаўні горад з цікавай гісторыяй і выдатнымі рэвалюцыйна-дэмакратычнымі традыцыямі, звязанымі з імёнамі І. Палзунова, П. Сямёнава-Цянь-Шанскага, Ф. Дастаеўскага і іншых, гэтыя дні жыў фестывалем. Паўсюдна — эмблемы фестывалю, віншавальныя лозунгі і транспаранты, афішы нашых канцэртных калектываў, рэкламы беларускіх кінафільмаў. Спецыяльны цыкл перадач пра дасягненні нашай рэспублікі, пра росквіт яе культуры вяла Алтайская студыя тэлебачання. Краявая публічная бібліятэка наладзіла выстаўку кніг пра Беларусь і беларускіх пісьменнікаў. На ёй было сабрана амаль усё, што выходзіла ў перакладах на рускую мову з беларускай у савецкі час, да таго ж многа кніг па геаграфіі, гісторыі, эканоміцы, культуры, мастацтву Беларускай ССР.

І вось урачыстая сустрэча ў Барнаульскім палацы спорту... На сцэну выходзяць першы сакратар Барнаульскага ГК КПСС У. В. Палякоў, намеснік старшыні Алтайскага крайвыканкома І. М. Швец, загадчык аддзела крайкома КПСС В. У. Кірушаў, начальнік ўпраўлення культуры крайвыканкома І. І. Агішаў і госці — загадчык аддзела ЦК КПБ С. В. Марцалеў, міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч і прадстаўнікі нашых дэлегацый і канцэртных груп — Г. Цітовіч, Ю. Семяняка, А. Грачанікаў, М. Гуціеў, А. Булінскі, І. Шыкунова. З урачыстым прывітаннем да гасцей звяртаецца першы сакратар Барнаульскага ГК КПСС Уладзімір Васільевіч Палякоў. «Фестываль беларускай літаратуры і мастацтва, — сказаў ён, — вялікая падзея ў грамадскім і культурным жыцці нашага краю. Няхай жа выльецца яна ў яскравае свята дружбы, свята ленінскай нацыянальнай палітыкі нашай партыі. Жадаем прадстаўнікам беларускай культуры новых творчых поспехаў!»

Фестываль абвяшчаецца адкрытым. Дзяўчаты ў нацыянальным рускім адзенні падносяць гасцям сімвал багацця краю — традыцыйны алтайскі каравай. «Мы рады, што прыехалі сюды, усхваляваны вашай гасціннасцю, — гаворыць у адказ міністр культуры БССР Юрый Міхайлавіч Міхневіч. — Шчырае дзякуй вам, сябры, за сустрэчу, за цеплыню сэрцаў, за сяброўскія поціскі рук і ўсмешкі!»

Урачысты канцэрт пачынаецца прывітаннем «Паклон Алтаю», напісаным паэтам Сяргеем Грахоўскім. Выконваюць яго дыктар Беларускага тэлебачання Зінаіда Бандарэнка і артыст Мікалай Казінін.

Першыя хвіліны знаходжання на Алтайскай зямлі. На вакзале ў Барнауле (злева направа) беларускія пісьменнікі Генадзь Бураўкін, Анатоль Грачанікаў, Янка Скрыган, Аляксей Гардзіцкі, Браніслаў Спрынчан, Васіль Зуёнак.

«Рэспубліка, якая страціла ў гады вайны кожнага чацвёртага свайго грамадзяніна, народ, які паказаў разам з рускімі братамі цуды гераізму, які ў кароткі тэрмін адрадзіў разбураную і спаленую сваю зямлю, — такі народ не можа не мець дастойнага яго мастацтва», — пісала на другі дзень краявая газета «Алтайская правда».

Першыя два дні фестывалю адводзіліся на творчыя сустрэчы на прадпрыемствах і ў палацах культуры Барнаула, а потым, падзяліўшыся на групы, пасланцы Беларусі раз'ехаліся ва ўсе канцы Алтайскага краю.

«Наша дружба навекі змацавана агульнасцю гістарычнага лёсу і крывёю, што пралілі змагары за справу Кастрычніка, за свабоду Радзімы». Вельмі часта гэтыя словы паўтаралісь ў час паездкі кожнай з груп па краю. У Горна-Алтайску ў краязнаўчым музеі, група, у склад якой уваходзілі пісьменнікі Анатоль Грачанікаў, Янка Скрыган, Браніслаў Спрынчан, заслужаная артыстка БССР Ірына Шыкунова і музыканты-выканаўцы Аляксандр Лявончык і Мікалай Сеўрукоў, затрымалася каля фатаграфіі камандзіра Першай Горна-Коннай партызанскай брыгады Івана Якаўлевіча Трацця́ка. Алтайцы беражліва захоўваюць памяць аб слаўным сыне беларускага народа, які пасля Вялікага Кастрычніка ўзначаліў партызанскі рух у Горным Алтаі і дапамог мясцоваму насельніцтву ўсталёўваць Савецкую ўладу ў гэтым краі.

А ў горадзе Бійску беларускія пісьменнікі сустрэліся з Героем Савецкага Саюза, жыхаром гэтага горада Міхаілам Філіпавічам Маскаевым, які ваяваў у Беларусі і ў 1944 годзе выратаваў ад фашыстаў у адной з аперацый каля васьмі тысяч жыхароў.

Зусім нядаўна ў Алтайскім кніжным выдавецтве выйшла кніга пісьменніка Васіля Белазёрцава «Разведчык Міхаіл Маскаеў».

Такой жа хвалюючай была сустрэча ў Трацця́коўскім раёне групы ў складзе пісьменнікаў Генадзя Бураўкіна, Васіля Зуёнка, Аляксея Гардзіцкага, народнага артыста БССР Леаніда Бражніка і заслужанай артысткі БССР Ганны Рыжковай з удзельнікам вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, поўным кавалерам ардэноў Славы Пятром Шутавым. На самым пачэсным месцы ў музеі ў Бійску — схема баявога шляху 15-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі, якая была сфарміравана ў жніўні 1942 года на Алтаі. За гераізм пры вызваленні Мазыра ёй была прысвоена назва — Мазырская.

Заслужаныя дзеячы мастацтваў БССР А. Булінскі і І. Вейняровіч, рэжысёр Ю. Дубровін і кінаактрыса А. Дубровіна выступалі перад сеансамі беларускіх кінафільмаў у Барнауле і ў саўгасах Барнаульскага раёна, у Бійску і Горна-Алтайскай аўтаномнай вобласці. Групу пад кіраўніцтвам Генадзя Бураўкіна прымалі на заводах Рубцоўска, у Трацця́коўскім, Змеінагорскім, Кур'інскім і Паспяліхінскім раёнах.

Асаблівым поспехам у час паездкі карысталася песня, напісаная спецыяльна да фестывалю кампазітарам Ю. Семянякам і паэтам У. Карызнам:

Прыветна горы паглядаюць
І Об гамоніць у цішы.
Прымі вітанне, мой Алтаю,
Ад беларускае душы!
Лясной азёрнай Беларусі
Ты любы брат і шчыры друг,
Сплялі рабочыя мы рукі
І цёпла нам ад гэтых рук.

На Бійскім кацельным заводзе, які выконвае многа заказаў для прадпрыемстваў Беларусі, у пісьменнікаў адбылася вельмі сардэчная сустрэча з калектывам рабочых кацельна-зварачнага цэха. Прыемна было чуць на Барнаульскім заводзе агрэгатаў цёплыя словы ў адрас Гомельскага завода пускавых рухавікоў, з якім спаборнічаюць барнаульцы.

Асабліва добра гаварылі сібіракі пра трактар «Беларусь». Толькі ў Краснагорскім раёне, напрыклад, гэтых выдатных машын больш за 500. «Трактар МТЗ-50, — гаварыў першы сакратар Краснагорскага РК КПСС А. С. Мызнікаў, — цудоўная машына, якая на нашых землях выконвае цэлы комплекс работ. Перадайце нашу падзяку слаўнаму калектыву мінскіх трактарабудаўнікоў». Яго ж сло-

БАЦЬКА ПРЫЕХАЎ...

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

— Напішу! — згадзіўся Гена. — Але, можа, яшчэ сёння ці заўтра ён прыедзе.

— Не крычыце! — уціхамірыла іх матка. — А то і пра абед забылі...

Пасля абеду Гена засеў дапісваць пісьмо, пачатае раней.

Міша пабег купляць канверт.

Гена пісаў:

«Дарагі папчык! Чаму ты стаў так рэдка прыязджаць? Мама плача, нам без цябе вельмі сумна. Ты ж і дроў на зіму не нарыхтаваў, мы будзем мерзнуць. Я трусіху купіў і яшчэ куплю труса, прывязі мне цвікоў, я клетку буду рабіць. Мама кажа, што ты нас кінуў, але гэта няпраўда, ты ж добры, папчык, мы цябе любім. А калі ты нас кінеш, то і мы пра цябе забудзем, і ніколі не ўспомнім. Прыязджай хутчэй. Твае сыны Гена і Міша».

Пісьмо адправілі ў нядзелю апоўдні.

З'явіўся бацька ў наступную суботу, вечарам, калі яго ўжо і не чакалі.

Кватэра была замкнута. Хлопцаў маці паслала ў магазіны па прадукты, а сама яна пайшла ў ашчадную касу зняць з кніжкі трохі грошай: ужо два месяцы ад Вацікa не было ні капейкі, і адной зарплаты ледзь хапала на харчаванне, а тут што-кольвек з адзення трэба купіць хлопцам. Зрэшты, Дзіна Сяргееўна не шкадуе зберажэнняў — машыну набываць ужо ўсё адно не давядзецца.

Ключ ляжаў у той жа самай хованцы. Без усялякай думкі Вацік узяў яго і адчыніў дзверы. Але, калі зайшоў у пустую хату, то чамусьці сумеўся і адчуў сябе чужым тут. Ён не ведаў, што рабіць. На стале ў першым пакоі ляжалі раскіданыя Мішавы кніжкі ды сшыткі. Вацік прысеў на краёк крэсла і стаў бязмэтна разглядаць гэтыя сшыткі ды кніжкі.

Ля дзвярэй знадворку пачуўся тупат і гаворка. Вацік пазнаў галасы сыноў: «Нешта няма ключа». — Гэта гаварыў Міша. «Мамка ўжо дома», — адказаў Гена.

З сумкамі ў руках хлопцы ўваліліся ў кватэру. Вацік нясмела і моўчкі выйшаў ім насустрач.

— Гэта ж папчык! — усклікнуў Гена. Борздзенька паставіўшы сумку, ён кінуўся абнімаць яго. Міша таксама ўзрадаваўся бацьку, але па-даросламу стрымана падаў яму руку.

— Чаму ты так доўга не прыязджаў? — спытаў Гена.

— Не было як. Работа, — неахвотна адказаў Вацік.

— А мама гаварыла, што ты ўжо і не прыедзеш, — сказаў Міша.

Вацік невыразна мармытаў, збіраючыся нешта адказаць. Але тут, па-ранейшаму ўзбуджаны, закрычаў Гена:

— А я не верыў! Я гаварыў, што папчык нас не кіне!

— Вы па прадукты хадзілі? — спытаўся Вацік, пазбягаючы гэтай гаворкі. — Дык пакладзіце іх сюды...

Хлопцы паслухмяна адышліся выконваць бацькаў загад. А Вацік накіраваўся ў свой пакой. У пакоі ўсё было гэтак жа, як і тры тыдні назад. Вацік заўважыў гэта і яму памроілася, што ён нікуды не адлучаўся, а быў тут і ўчора і заўчора. Але праз момант ён адчуў страшэнную стому, — мо таму, што ўжо колькі дзён не высыпаўся як след, а мо і па іншай прычыне. Так пацягнула да сябе канапа, што ён не ўтрымаўся перад спакусай смачна выцягнуцца на ёй. Але толькі ён прылёг, скрыжаваўшы па звычцы рукі на твары, нібы засланяючыся ад усяго на свеце, як сюды зайшоў Міша. — Вацік пазнаў, што гэта ён, нават не зірнуўшы. Пашамацеўшы нечым, Міша паднёс бацьку дзённік і ціха, па-змоўніцку сказаў:

— Глянь, што тут напісана: «Дурэў на перапынку, абліваў вадою Свету».

У гэты час прыйшоў сюды і Гена. Імгненна згледзеў ён, што паказвае Міша бацьку, і, наляцеўшы, як каршун, выхапіў свой дзённік і пабег назад, у першы пакой. Праз момант ён з'явіўся з Мішавым дзённікам; стаў паказваць бацьку, які брудны, з абарванымі лістамі Мішаў дзённік, і спрытна адгарнуў тую старонку, дзе стаяла вялізная тлустая двойка па беларускім дыктанце...

І тут пайшлі ў ход кулакі...

— Разыдзіцеся! — скамандаваў бацька.

Але яго загаду ніхто не паслухаўся. Гена вырваўся ад Мішы, адбегся, а тады напаў на яго ззаду, тужачыся зваліць на падлогу. Міша перакруціўся і схапіў Гену за вушы. Бацька, бачачы, што Генавы вушы імгненна наліліся чырванню, кінуўся бараніць меншага.

Ніхто з траіх і не заўважыў, як прыйшла Дзіна Сяргееўна. Яна трохі паназірала за катавасіяй, а тады знайшла папругу і стоячы над імі, пагражала лупцоўкай:

— Перастаньце... Буду біць!..

Першы стаў на ногі Вацік, услед за ім — Міша, а тады — Гена. Усе трое стаялі з такім выглядам, быццам не было нядаўна ніякай бойкі ды валтузні.

Вацік павярнуўся да Дзіны Сяргееўны:

— Ну, прывітанне... — сказаў ён і, памаўчаўшы, дадаў: — Прыехаў от праведаць...

Дзіна Сяргееўна адчула няшчырасць у яго голасе і, не хаваючы непрыязнасці, адказала:

— Адважыўся ўсё-такі...

Вацік сумеўся: каб не выдаць сваёй ніякавасці, ён звярнуўся да Гены:

— А ты, Гена, больш такіх слязлівых пісем не пішы мне...

Гена махнуў галавою:

— Добра. Ты ж ужо будзеш прыязджаць дадому.

— А вы будзеце добра вучыцца, — сказаў бацька і ўжо сурова дадаў. — А цяпер давайце мне вашы дзённікі — кожны свой, не так, як вы мне нядаўна паказвалі, — я пагляджу больш уважліва...

Хлопцы без энтузіязму, але выканалі бацькаў загад. Вацік прыняўся гартаць дзённікі, пасварваючыся на хлопцаў, а хлопцы прыцішаныя стаялі каля яго.

Дзіне Сяргееўне страшэнна захацелася падысці да іх, пакласці рукі на іхнія плечы — усё роўна на чые, дзіцячыя ці Вацікавы — і таксама ўдзельнічаць у гаворцы. Але яна не паддалася гэтаму жаданню. Ёй жа трэба будзе весці іншую размову з Вацікам, балючую і непрыемную размову, — трэба, хоць яна не ведала, як будзе падступацца да той размовы і што з яе атрымаецца...

вы амаль паўтарыў потым Мікалай Канстанцінавіч Хацько, сакратар парткома саўгаса «Краснагорскі», беларус, ураджэнец Лепельшчыны, які пасля дэмабілізацыі з арміі ў 1961 годзе прыехаў сюды ўзнімаць цалінныя землі.

«Куды не трапяць беларусы!» — гэты славуты коласаўскі выраз часта прыходзіў на памяць у дні фестывалю беларускага мастацтва і літаратуры на Алтаі. Адным з першых вітаў гасцей у горадзе Бійску старшыня гарвыканкома Леанід Трафімавіч Гаркавы, які нарадзіўся і вырас на Гродзеншчыне. А на масласыркамбінаце ў Бійску было прыемна сустрэцца з лепшым зменным майстрам Тамарай Сілкінай: яна ў 1959 годзе прыехала сюды з бацькамі з Веткі. А вось галоўны заатэхнік Чэргінскага маралагадоўчага саўгаса беларус Мікалай Іванавіч Уласенка, відаць, ніколі не думаў, што будзе працаваць у гарах Алтая і даглядаць маралаў...

...Паміж стромкіх скалаў і высокіх гор уецца Чуйскі тракт — асноўная транспартная артэрыя краю. Побач нясе свае імклівыя воды няўрымслівая Катунь — сапраўдная прыгажуня, гаспадыня па-тутэйшаму. Уцякае яна ад магутнага асілка, якога алтайцы завуць Бія. І толькі на раўніне Бія і Катунь зліваюцца, дагнаўшы адзін аднаго, у магутную Об. Непаўторная прыгажосць Горнага Алтаю, магчыма, і паланіла маладога спецыяліста з далёкага Мсціслаўля. Калі Мікалай Іванавіч Уласенка прыехаў на вытворчую практыку ў Шабалінскі аленегадоўчы саўгас, дырэктар саўгаса У. Г. Бедраў згадзіўся прыняць хлопца з адной умовай: каб пасля заканчэння інстытута абавязкова вярнуўся сюды. Пашыраўся парк аленяў і маралаў, і вельмі патрэбны былі заатэхнікі. Мікалай падумаў і згадзіўся. Стрымаў сваё слова: прыехаў сюды, у сэрца Горнага Алтая, у Шабалінскі раён.

Мікалай Уласенка паказаў пісьменнікам і артыстам сваю гаспадарку. Адчувалася, што ён па-сапраўднаму захоплены працай і вельмі любіць яе. Каля 50 кіламетраў агароджы вакол палян і ўзгоркаў, парослых лесам, на якіх пасвяцца прыгажуны-маралы! Некаторыя з іх нясуць на сабе да 24 кілаграмаў каштоўных пантаў. Кінааператару Беларускага тэлебачання Леаніду Белабоцкаму, які здымаў тэленарыс пра фестывальныя маршруты, удалося падысці даволі блізка да статка і зрабіць цікавыя кінакадры.

Мікалай Іванавіч расказаў пра ўвесь працэс зрэзкі і нарыхтоўкі пантаў, а мы прыгадалі яму, што ў нашага паэта Рыгора Барадуліна ёсць верш «Маралу зразаюць панты» і што толькі цяпер мы зразумелі, як дакладна перадаў паэт усю напружанасць гэтай вельмі цяжкай для жывёліны аперацыі.

Цікавыя гутаркі адбыліся ў дні фестывалю не толькі з працоўнымі Алтая, але і з калегамі-пісьменнікамі. Дагэтуль мала ведалі ў нас пра пісьменнікаў Барнаула і Горна-Алтайскай аўтаномнай вобласці. Сакратар Горна-Алтайскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў РСФСР Эркемен Палкін расказаў, што творы такіх паэтаў, як Барыс Укачын, Лазар Кокышаў, Аржан Адараў, Паслей Самык перакладаюць на рускую мову Барыс Слуцкі і Ілья Фанякоў, што празаік Дзібаш Каінчын стаў лаўрэатам прэміі часопіса «Дружба народов», што кнігі алтайскіх пісьменнікаў, выдадзеныя ў Горна-Алтайску на роднай мове, карыстаюцца вялікім поспехам. Адпаведна намеснік старшыні праўлення СП БССР Анатоль Грачанікаў гаварыў на гэтай сустрэчы пра поспехі нашай літаратуры. Асабістае знаёмства з пісьменнікамі Алтая і іх творчасцю, абмен новымі творамі, безумоўна, будзе новым імпульсам для ўзаемнай перакладчыцкай працы.

А пакуль што рускія пісьменнікі ў Барнаўле выдалі спецыяльна да фестывалю чарговы нумар альманаха «Алтай», у якім у перакладзе на рускую мову змешчаны творы Васіля Віткі, Генадзя Бураўкіна, Сяргея Грахоўскага, Анатоля Грачанікава, Еўдакіі Лось — побач з вершамі Браніслава Спрынчана і цікавай аповесцю Барыса Укачына «Колер часу».

У кожнай фестывальнай групы былі, вядома, свае самыя адметныя, самыя незабыўныя сустрэчы. Для калектыву Дзяржаўнага народнага хору БССР важнай падзеяй з'явіўся шэфскі канцэрт на Барнаульскім ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга заводзе транспартнага машынабудавання імя У. І. Леніна. Асаблівы поспех выпаў на долю танцавальнай групы хору. На развітанне народны артыст СССР Генадзь Іванавіч Цітовіч разам са шчырымі словамі падзякі падарыў гаспадарам пласцінку з запісам песень у выкананні Дзяржаўнага народнага хору БССР.

Мнагалюдна было і ў памяшканні Алтайскага краявога музея выяўленчых і прыкладных мастацтваў, дзе экспанавалася выстаўка беларускай графікі і мастацкага шкла. На адкрыцці выстаўкі нашы вядомыя мастакі Георгій Паплаўскі і Мікалай Гуцієў ледзьве паспелі сказаць прывітальныя словы, як іх абступілі наведвальнікі. Пытанні былі самыя розныя: і пра тое, як складалася задума таго ці іншага твора, і пра дасягненні беларускіх мастакоў у другіх жанрах, і пра творы беларускіх манументалістаў. Доўга стаялі барнаульцы перад стэндамі з беларускім мастацкім шклом, захапляючыся казачнай прыгажосцю твораў Ул. Мурахвера, Л. Мягковай, што працуюць на славутым шклозаводзе «Нёман».

У Алтайскім дзяржаўным краявым тэатры драмы адбылася прэм'ера камедыі А. Макаёнка «Таблетку пад язык». Пастаноўшчык і кампазітар спектакля знаёмыя беларускім гледачам — А. Смелякоў і Б. Насоўскі, мастак мясцовы — заслужаны артыст Каз. ССР Б. Астахаў.

Спектакль барнаульцаў прываблівае своеасаблівай свежасцю рэжысёрскага прыёму. Ідучы на далейшае абвастрэнне гратэску ў трактоўцы персанажаў камедыі, рэжысёр увёў у дзеянне спектакля лялек, якія дублююць асноўных герояў і папярэднічаюць іх выхаду на сцэну.

Калі фестывальныя брыгады пасля паспяховых выступленняў у раёнах зноў з'ехаліся ў Барнаул, адбылася агульная паездка на месца, вельмі дарагое кожнаму рускаму і беларусу, кожнаму савецкаму патрыёту. Летась, у час Дэкады савецкай літаратуры на Алтаі, на полі непадалёк ад пасёлка Тальменка, спынілася група вядомых савецкіх пісьменнікаў на чале з першым сакратаром праўлення СП СССР Г. Маркавым. Беларускі паэт Сяргей Грахоўскі сюды прывёз тады скрыначку свяшчэннай зямлі Хатыні і развеяў яе над Алтайскім полем. Следам ішлі трактары...

На гэтым полі было вырашана збудаваць абеліск дружбы і адзінства народаў Савецкага Саюза. Удзельнікі фестывалю беларускай культуры пазнаёміліся з праектам абеліска. Аўтар яго — мясцовы скульптар І. Зоммер. Дзве стэлы, зробленыя з абпаленай цэглы, такой жа, як і камяні Брэсцкай крэпасці, высока ўзносяць рускі і беларускі нацыянальныя арнаменты, а ў цэнтры дзве рукі моцна трымаюць аўтамат — сімвал нашага баявога братэрства. Побач, на мармуровай пліце, будуць высечаны радкі, спецыяльна напісаныя для гэтага абеліска паэтам Робертам Раждзественскім:

Побраталась земля Алтая
С землей Хатыни.
Да будет бессмертно это братание,
Эта святыня.

Доўга стаялі ўдзельнікі фестывалю на гэтым свяшчэнным месцы... І кожны думаў пра вялікі сэнс і значэнне нашага адзінства. У непарушнай ленінскай дружбе нашых народаў — залог далейшых працоўных поспехаў.

Увесь чэрвень звіней на алтайскай зямлі песнямі і танцамі, чароўным мастацкім словам фестываль беларускага мастацтва і літаратуры. Далёкія адлегласці паміж Алтаем і Беларуссю значна скараціліся, і значна мацней сталі цяпер і нашы творчыя ўзаемасувязі, і наша працоўная сардружнасць. А гэта — галоўная мэта фестывалю.

Ванкарэм НІКІФАРОВІЧ.

З РОЗНЫХ ШЫРОТ

СТУДЭНТЫ ПАТРАБУЮЦЬ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Рэспектабельныя чыноўнікі з традыцыйнымі парасонамі-палкамі ледзь прадзіраюцца скрозь шчыльныя калоны дэманстрантаў. Над галовамі юнакоў і дзяўчат калышуцца плакаты: «Не асуджайце студэнтаў на голад», «Няўжо вы думаеце, што на нашы стыпендыі можна жыць?», «Студэнты патрабуюць справядлівасці».

Такія сцэны можна было назіраць ля вышыннага будынка міністэрства асветы і навукі Англіі ў дні кампаніі за павышэнне стыпендый. Сярод пікетчыкаў ля міністэрства я ўбачыў прэзідэнта Нацыянальнага саюза студэнтаў Англіі Дэйгбі Джэкса. Яго салідны тытул дрэнна пасаваў да рыжай барэды і паношаных джынсаў.

— Хоць у большасці англійскіх універсітэтаў і каледжаў плата за навучанне бярэцца цяпер толькі з замежных студэнтаў, — сказаў ён, — вышэйшая адукацыя застаецца ў нас прывілеяй багатых слаёў насельніцтва.

Для паступлення ж ва універсітэт неабходна мець сярэднюю адукацыю. Між тым, толькі каля трэцяй часткі англійскіх навучэнцаў заканчваюць сярэднія школы. Большасць дзяцей з малазабяспечаных і рабочых сем'яў рана пачынаюць працоўнае жыццё, пакідаючы школу ва ўзросце да 15 гадоў. Але нават тым, каму ўдаецца скончыць школу і трапіць ва універсітэт або каледж, бывае цяжка.

Кансерватыўны друк, нацкоўваючы абываценяў на студэнтаў, якія змагаюцца за змяненне цяперашняй сістэмы адукацыі і паляпшэнне ўмоў жыцця і вучобы, сцвярджае, што студэнты «проста заеліся» і зусім прыстойна забяспечаны. Але ці так гэта на самой справе? Нізказабяспечаныя студэнты атрымліваюць цяпер стыпендыю, максімальны памер якой 465 фунтаў стэрлінгаў у год. На першы погляд, здавалася б, нядрэнна. Але ж нават за ложак у студэнцкім інтэрнаце ім даводзіцца плаціць 260 фунтаў стэрлінгаў у год. Да таго ж колькасць месц у інтэрнаце вельмі абмежавана, і ў іх размяшчаецца меньш трэцяй часткі ўсіх студэнтаў. Больш паловы студэнтаў вымушаны здымаць куткі ў прыватных кватэрах, за якія іх уладальнікі бяруць у тры разы даражэй. Студэнты, якія жывуць дома, атрымліваюць, як правіла, значна меншую стыпендыю — нярэдка 50 фунтаў у год. Замужнія студэнткі атрымліваюць усяго 275 фунтаў стэрлінгаў у год, нават калі іх мужы зарэгістраваны на біржах працы як беспрацоўныя. У радзе каледжаў, напрыклад, у педагагічных, стыпендыі ніжэй, чым ва універсітэтах.

У выніку ў студэнтаў нярэдка астаецца на ўсе выдаткі — харч, адзенне, кнігі, якія ў Англіі каштуюць дорага, — усяго 10 — 15 фунтаў у месяц. Гэтых грошай пры цяперашняй дарагоўлі хапае толькі на абеды ў танных шынках, ды і тое не кожны дзень. Не дзіўна, што студэнты вымушаны падрабляць на жыццё афіцыянтамі, кандуктарамі на начных аўтобусах або прыбіральшчыкамі, што, вядома, адбіваецца на ўзроўні іх падрыхтоўкі.

Сістэма вышэйшай адукацыі ў Англіі, падкрэслівае Дэйгбі Джэкс, носіць яскрава выяўлены класавы характар і сур'ёзна абмяжоўвае магчымасці моладзі з рабочых сем'яў.

Англійскія студэнты, якія актыўна ўдзельнічалі ў грамадскіх кампаніях за мір у В'етнаме, супраць рэжыму апартэіда ў Паўднёвай Афрыцы і многіх іншых, бадай, упершыню ў такім масавым арганізаваным парадку па ўсёй краіне выступілі ў абарону сваіх правоў і інтарэсаў.

Студэнцкі рух прыняў такія маштабы, што ўрад быў вымушаны пайсці на некаторыя ўступкі, аб'явіўшы аб павышэнні з першага студзеня 1974 года стыпендыі ва універсітэтах і тэхнічных каледжах на 20 і ў педагагічных на 10 фунтаў стэрлінгаў у год. Гэтая мізэрная прыбаўка азначае, што студэнты будуць атрымліваць усяго на 50 пенсаў больш у тыдзень. Таму англійскае студэнцтва поўнае рашучасці працягваць барацьбу за паляпшэнне ўмоў вучобы і жыцця.

В. НІКІЦІН,
кар. ТАСС.

Лондан.

Балгарскі «Тэатр лялек» — малады. Але нават за чвэрць стагоддзя ён стварыў свае традыцыі. Рэпертуар тэатра сваім грамадзянскім, сучасным абліччам прыцягвае гледачоў самага рознага ўзросту.

Тэатр наведаў шмат краін Еўропы, Азіі, Афрыкі. Удзельнічаў у 21 міжнародным фестывалі.

На здымку — фае Цэнтральнага тэатра лялек у Сафіі.

САФІЯ — ПРЭС.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ
ІМЯ А. В. ЛУНАЧАРСКАГА
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД
ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА САСТАВУ
ПА КАФЕДРЫ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА —
ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ — 1.
ДАЦЭНТ ФІЛАСОФІІ — 1.

Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсах, накіроўваць на імя рэктара па адрасу: г. Мінск, Інтэрнацыянальная, 30.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання. Даведкі па тэлефонах: 22-49-42, 22-14-03, 22-96-71.

Мікола ВЯРШЫНІН

САТЫРЫЧНЫЯ МІНІЯЦЮРЫ

БЯССІЛЛЕ ЎТАЙМАВАЛЬНІКА ТЫГРАЎ

— Вы лёгка з тыграмі працуеце заўсёды...
— Дык гэта ж дзеці мілыя прыроды.
Вось дома у мяне—дык там тыгрыца;
З ёй век не справіцца і не змірыцца...

«РАСТАРОПНЫ»

Заўжды імчыць—ажно дрыжыць,
І дбайным ён здаецца:
Вось быццам нават і бяжыць,
А ўсё ж... стаіць на месцы.

ПРЫЕМНАЯ СУСТРЭЧА

— Прабач, не заходжу: нядужы...
Забыўся я ўжо, дзе твой дом.
Давай пацалуемся, дружа!
...Гамонка ішла... пад сталом.

Кінарэжысёры, звычайна, людзі шматгранныя... Яны ўмеюць пісаць сцэнарыі, пець, іншы раз здольны замяніць акцёра, валодаюць дарам пераконваць мастацкія саветы, некаторыя нават малююць.

Гэтыя малюнкі кінарэжысёр Вадзім Сукманаў зрабіў для свайго новага дакументальнага фільма, у якім даследуюцца адносіны паміж кібернетыкай і жыцвёлагадоўляй.

Нам падалося, што акрамя трапнага раскрыцця тэмы фільма, яны здольны выклікаць і ўсмешку.







Я ПАЧАЎ весці дзённік... Адразу ж, як уладкаваўся працаваць у нашу гідрапраектную арганізацыю. Пасля шэрагу няўдач у іншых установах, дзе праз паўгода, а то і раней, мне чамусьці з ветлівай усмешачкай раілі падаваць заяву—«Па ўласнаму жаданню»...

— Слухай, а чаму б табе не паспрабаваць свой літаратурны талент?—неяк пасля другой шклянкі «Яблычнага» глыбакадумна прапанаваў мне былы школьны таварыш Жорка Жыгалаў. — Памятаю, ты нават вершыкі пісаў...

Пісаў, а як жа... Іскра таленту ў мяне была. Усе казалі. Дзякуй богу, мог рыфмаваць словы... Аднойчы такую оду сачыніў пра нашага старога географа, ледзьве са школы не вытурылі... Аж цяпер смешна.

— А ты не смейся, а заводзь дзённічак на працы, — загадкава бліскаючы акулярамі, сказаў Жорка Жыгалаў. — І пішы ў ім так...

Так ці не так, а праз які месяц на маім рабочым стале ляжаў пухленькі сшытачак з прыгожым надпісам: «Працоўны дзённік інжынера Наседкіна».

Не шкадуючы эпітэтаў, з першага ж дня пачаў падрабязна занатоўваць свае думкі: «З'явіўся на працу без спазнення. Пазнаёміўся з калегамі. Добрыя людзі, чулыя. Але самае вялікае ўражанне робіць дырэктар. Які цудоўны чалавек, які разумнік Пракоп Пракопавіч! Шкада, што дагэтуль не сустракаліся на маім шляху такія абаяльныя кіраўнікі...» І наступная старонка была ў такім жа класічным стылі: «Па-ранейшаму працую... Заходзіў у аддзел Пракоп Пракопавіч. Нібы вясновы вецер завітаў у наш змрочны кабінет. Адзін знешні выгляд гэтага чалавека натхняе працаваць яшчэ лепш. Стройны, энергічны, падцягнуты. І гэта нягледзячы на свае шэсцьдзесят год! Вось у каго вучыцца нам, маладым...» На адной з апошніх старонак, калі маё захапленне дырэктарам дасягнула апагея, я няўпэўненым почыркам напісаў: «Адчуваю, што не дастойны працаваць побач з такім чалавекам, як Пракоп Пракопавіч... Прыйдзецца падаваць заяву. А як бы хацелася ўсё жыццё бачыць перад сабой яго добрыя, разумныя вочы, чуць сардэчны, мяккі голас...»

У той дзень я «незнарок» забыў свой дзённік на працы.

Назаўтра раніцою, ледзьве паспеў павесіць плашч і павітацца з калегамі, як мяне тэрмінова паклікалі да дырэктара. Я нерашуча адчыніў дзверы кабінета і, убачыўшы ў руках Пракопа Пракопавіча свой дзённік, вінавата апусціў вочы...

— Што ж гэта ты, дарагі мой? — спачувальна, пяшчотна і заклапочана, як урач хворага, спытаў ён мяне.— Што ж гэта ты... Збіраешся пакінуць нас?

Я слаба ўсміхнуўся. Нібы не разумеючы, здзіўлена паглядзеў на дырэктара. Але ён пагразіў мне пальцам:

— Не хавай, не хавай, усё ведаю! Тут прыбіральшчыца знайшла дзённічак твой... Прызнаюся: саграшыў, чытаў...

У Пракопа Пракопавіча раптам запяршыла ў горле, ён збянтэжана адкашляўся і строга, але ж ласкава паўтарыў:

— Чытаў... Праўда, пра мяне ты там... дарэмна... Кхы, кхы... Але пішаш здорава! За сэрца бярэ... Не, талентамі мы пакуль не раскідваемся. Так што нікуды я цябе, дарагі мой, не адпушчу!

...Учора я зноў сустрэў Жорку Жыгалава. Добранька з ім выпілі. За маю новую пасаду памочніка дырэктара, за мой, як сказаў Жорка, шчаслівы шлях у вялікую літаратуру.

ЗМРОЧНЫЯ прадчуванні, з якімі Андрэй Мікульчык збіраўся ў творчую камандзіроўку, не ашукалі яго. Калі шыбаваў на вакзал, было яшчэ цярпіма. Але потым, у далёкім горадзе, ледзь трываў з апошніх сваіх маладых сіл. Хадзіў —быццам да вераб'ёў падкрадваўся. Ногі ставіў вельмі асцярожна, з посавам, бо заднікі яго новых, зробленых па заказу туфляў, бязлітасна ўразаліся ў пяткі.

Узнёслыя спадзяванні Мікульчыка, што ён шчасліва ўзбагаціцца ўражаннямі і напіша цудоўны—ажно строгі рэдактар задаволена ўскіне калматыя бровы—лірычны нарыс пра аматараў самадзейнай сцэны, зніклі як дым, як той туман. Ва ўтульным, урачыста светлым горадзе з істужкай ракі непаўторнага блакіту і музычным гадзіннікам на стромкай вежы старыннага палаца ён марыў не аб сустрэчах з салістамі народных хораў, а аб тым, каб яму на ногі замест мадэльнай прыгажосці—хоць зноскі якія. Марыў і ўспамінаў, як толькі мог, работнікаў фабрыкі індывідуальнага пашыву абутку. І кляўся, што ніколі ім гэтага не даруе...

Але што таму чалавеку трэба, каб ён зноў стаў шчаслівым! Іншы раз—дробязь. От і Андрэю так. Вярнуўся з камандзіроўкі, шпурнуў свой прыгожы абутак у кут і прыбраўся ў кеды. Прыйшоў на работу—мякенька так, добра. Быццам нанава на свет нарадзіўся. Сябры, праўда, на смех паднялі—рэпарцёр-марафонец. Больш за ўсіх пацяшалася літсупрацоўніца з аддзела інфармацыі Вольгачка Амельчанка. Шырокі белазубы рот яе не закрываўся—усё хі-хі ды ха-ха. Мікульчык спакойна пазіраў на яе шэрымі пукатымі вачыма і паблажліва думаў: бяруць жа такіх пустасмешак у рэдакцыю...

Пра сваю крыўду пазваніў Мікульчык галоўнаму інжынеру на фабрыку індывідуальнага пашыву абутку. Той уважліва выслухаў яго скаргу, не шкадуючы, адзначыў яму спачування: сам, маўляў, разумею, дужа непрыемна, калі цесны абутак на нагах...

Неўзабаве Мікульчык атрымаў на сваю скаргу пісьмовы адказ: дырэктар фабрыкі выдаў па гэтаму выпадку спецыяльны загад. Усё там было распісана, як дратвай прашыта. Каму на від, каго папярэдзіць за дрэнную якасць. Мікульчык яшчэ трымаў адказ у руцэ, калі на яго стале зазваніў тэлефон. У трубцы радасна заракатаў знаёмы хрыплаваты басок галоўнага інжынера: фабрыка асвоіла новыя мадэлі абутку. Інжынер красамоўна распісаў іх вартасці і далікатна намякнуў Андрэю, каб той быў больш разважлівы —заказы рабіў у пачатку месяца, калі ніхто яшчэ гарачку не пора, план не штурмуе. І зычліва прапаноўваў першую пару новага абутку яму, Андрэю...

—Во бачыш, Волечка, ты усё падсмейваешся, а да мяне вунь як ставяцца, — загаварыў Мікульчык, паклаўшы трубку.

У пакоі было старожка, як у прыгранічнай паласе. Дзяўчына больш не хіхікала. Прыжмурыла вочы-вішні, быццам той паляўнічы, і раптам як стрэліла:

—Лепш пішы, Андрэй, фельетон. Браку ў іх яшчэ будзе ды будзе, папакульгаеш...

«Харошанькая справа, чалавек зычлівасць праявіў, а я яго... фельетонам? — глыбока ўсумніўся Мікульчык. — Гэта не мой метад». Ён з прыкрасцю тыцнуў цыгарэтай міма попельніцы і з гонарам адказаў:

— Пляваў я на іх брак...

А ў душы яго тым часам зноў запалала жаданне напісаць цудоўны—каб нават строгі рэдактар задаволена ўскінуў калматыя бровы—не, не, не фельетон, а лірычны нарыс пра аматараў самадзейнай сцэны. Што зробіш? Прызванне!

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара—33-44-04, аддзела літаратуры — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33 24 62, аддзела публіцыстыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, выдавецтва — 32-22-19, бухгалтэрыі — 32-15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Х. Д. ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО, Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ, Л. Я. ПРОКША, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

Індэкс 63856. АТ 06817